WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

8 чэрвеня 2011 г.
СЕРАДА
№ 105 (26969)
Кошт 750 рублёў

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СОНЦА СПАЛЬВАЕ

На Палессі ад моцнай засухі церпяць пасевы і травы

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАВАТ бывалыя земляробы-палешукі не памятаюць такога, каб з вясны, з пачатку пасяўной, на зямлю не ўпала ні кроплі дажджу. Менавіта пра тое, у што паверыць цяжка, гаварылі аўтару гэтых радкоў кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў Пінскага і Столінскага раёнаў.

Дырэктар ААТ «Пінскае ПСМ» Пётр КАЛЕСНІКОВІЧ кажа, што ўжо больш за месяц на пасевы і пашы не выпала ніводнага міліметра ападкаў, а норма на гэты час складае ад 57 да 75 мм. Гарыць усё: азімыя, яравыя, кармавыя культуры і пашы. Прыкладна 30 працэнтаў азімага жыта можна малаціць сёння. Толькі вось колас на ім яшчэ не завязаўся...

— Відавочна, што корму сёлета можна ўзяць напалову менеў ад леташняга, — гаворыць Пётр Міхайлавіч. — Сёння якраз чакаем спецыялістаў з вобласці, каб ацаніць абстаноўку, вызначыцца з далейшым планам дзеянняў. Але і самі ўжо прыступілі, калі можна так сказаць, да ліквідацыі наступстваў небывалай засухі. Днямі перааралі 20 гектараў пасеваў, якія канчаткова выгаралі. Плануем засеяць кармавой пайзай. Названая культура любіць цяпло. Як падрасце, яе можна выкарыстоўваць пад пашу, з яе выходзіць неблагое сена, а таксама сянаж і сілас.

Варта зазначыць, што Пінскае прадпрыемства меліярацыйных сістэм параўнальна нядаўна стала аграрным прадпрыемствам. Да яго далучылі дзве слабыя гаспадаркі, якія ўпэўнена пайшлі ўгару. У былых калгасах разгарнулася маштабнае будаўніцтва, стала абнаўляцца жывёлагадоўчая база. Вядома, для развіцця жывёлагадоўчай галіны патрэбны якасныя кармы. І галоўнае, іх павінна быць у дастатку. А тут такая бяда.

А як інакш назваць становішча, калі пасеялі, падкармілі пасевы, дагледзелі іх, і замест таго, каб чакаць ураджаю, даводзіцца заворваць вынік сваёй працы ў зямлю? Але ж акрамя таго, што залежыць хіба ад Бога, ёсць у аграрыяў і зямныя праблемы.

І дырэктар Калесніковіч, і яго калегі адразу прыводзілі няхітрую арыфметыку: вось, напрыклад, «Пінскаму ПМС» на дзень толькі для паравання, перасеву трэба на 40 мільёнаў паліва ў дзень. А за якія сродкі пакрываць страты? З учарашняга дня, калі бензін стаў больш як па пяць тысяч рублёў, на літр нафтапрадукта трэба прадаць пяць літраў малака. «А каровы нашы не гумовыя, — сумна жартуе дырэктар.

Яшчэ адзін рэзерв, які мяркуюць выкарыстаць у названым прадпрыемстве, — перайсці ў поймы рэк Прыпяці, Піны. Там вясной былі затоплены значныя плошчы, цяпер іх неяк можна выкарыстаць на корм жывёле і пашу.

— Калі ў бліжэйшыя дні не пойдзе дождж, наступствы для сельскай гаспадаркі раёна будуць непрадказальныя, — гаворыць **намеснік старшыні Пінскага райвыканкама Аляксандр НОВІК**. — Кожны дзень пытаю нашых метэаролагаў аб прагнозах, і кожны дзень яны мне абяцаюць толькі плюс 32-33 і без ападкаў. Сам працую ў сельскай гаспадарцы з 1995 года, распытваў старых людзей. Ніхто не памятае такой навалы ў нашых мясцінах, каб сонца літаральна паліла ўсе пасевы. Вось глядзіце: усё пачалося з сакавіка. На гэты месяц у нас норма ападкаў складае 33 мм, выпала — 14, у красавіку трэба — 44, выпала — 25, у маі адпаведна — 57 мм — 24. І ў чэрвені норма складае 74 мм, не выпала пакуль нічога. А цэлы шэраг гаспадарак так званай зарэчнай зоны не бачыў ні міліметра і ў маі. Асабліва пацярпелі пасевы на пясчаных і супясчаных глебах, на тарфяніках яшчэ большменш трымаюцца.

Вось гэтыя паўднёвыя гаспадаркі аб'ектыўна могуць узяць толькі 30-40% кармоў ад узроўню мінулага года, — працягвае Аляксандр Аляксандравіч. — Ведаеце, цяжка глядзець на некаторыя палеткі. Пашы стаяць белыя, нібы іх толькі што атруцілі нейкім ядахімікатам. А ў гэты час звычайна трава расце па калена. Калі яшчэ пратрымаецца такая спёка тыдзень ці больш, проста не ведаю, куды можна будзе выганяць кароў на пашу.

І разам з тым у раёне акрэслены план дзеянняў, як ратаваць становішча хоць нейкім чынам. У засеках ёсць 70 тон пайзы. Спецыялісты вызначылі, якія плошчы трэба перасяваць, якія ўгнаенні ўносіць у першую чаргу.

Прыкладна ў такім жа становішчы, як пінскія, аказаліся і сельгаспрадпрыемствы Столінскага раёна. **Намеснік старшыні Столінскага райсельгасхарчу Лявонцій ЛЯШКЕВІЧ** назваў сённяшнія ўмовы працы аграрыяў экстрэмальнымі:

— На Століншчыне стаіць гарачыня +34. Некаторыя гаспадаркі столінскай зоны зайздросцяць СВК «Фядоры», у іх прайшоў дождж... 9 мая. У іншых і таго не бачылі. Выходзячы з умоў даводзіцца грунтаваць планы на ўраджай. Самае крыўднае, што не будзе другога ўкосу траў, калі спёка яшчэ пратрымаецца.

СТАР. 3

І САМАЛЁТАМ ЦЯЖКА Ў СПЯКОТУ

Але і Ан-2, і Мі-2 павінны штодня ўзнімацца ў паветра над гарачай зямлёй. Спякотнае паветра стварыла ў многіх рэгіёнах краіны пажаранебяспечную сітуацыю, і ўсе 12 падраздзяленняў «Беллесавія» вядуць назіранне з неба, каб папярэдзіць аб небяспецы і своечасова ўтаймаваць вогненную стыхію, не даць агню ператварыць лес у попел. Асабліва складаныя ўмовы з-за адсутнасці дажджоў утварыліся на паўднёвым захадзе Беларусі на памежжы з Украінай, у Столінскім і Пінскім раёнах. Лётчык-назіральнік мазырскага авіяадзялення Аляксандр Нягрэй з групай пажарных дэсантнікаў учора ліквідавалі два складаныя лясныя вогнішчы ў Лельчыцкім і Калінкавіцкім раёнах, якія ўзніклі па халатнасці людзей.

— Клас гарымасці павышаецца ўжо да пятага, — паведаміў па тэлефоне Аляксандр Нягрэй, — бо гарачыня дасягае 30-32 градусаў. Нават хуткія самалёты і верталёты не заўсёды паспяваюць да вогнішчаў, пакуль тыя ў пачатковым стане.

У мінулыя выхадныя складаная сітуацыя ўтварылася на Альманскіх балотах. Небяспеку заўважыў пінскі лётчык-назіральнік Юрый Вандзіч. Прыйшлося высаджваць пажарны дэсант на цэлыя суткі. Пажар спынілі, але агнём знішчана больш за гектар балотна-лясных угоддзяў.

— Учора два пажары пашкодзілі трынаццаць сотак лесу, — паведаміў Юрый Вандзіч. — Каб не дэсантнікі, хто ведае, якія страты панесла б лясная гаспадарка.

Пажар пад крылом АН-2 (на фота ўверсе) запеленгаваў экіпаж лесапатруля з Маладзечна, якім кіруе Уладзімір Ганчароў. Яго інфармацыя пра агонь на маляўнічым беразе Заходняй Бярэзіны дапамагла хутка ліквідаваць полымя.

— Наша тэхніка павінна быць безадказнай і заўсёды гатовай да вылету, — кажа авіятэхнік самалёта АН-2 Уладзімір Крыштопенка (на ніжнім фота).

Гэты спецыяліст ужо 20 гадоў абслугоўвае «кукурузнікі». І амаль дзесяць з іх — у «Беллесавія». Як толькі борт прызямляецца пасля чарговага палёту, авіятэхнік спяшаецца праверыць усе вузлы і дэталі даверанага яму самалёта-назіральніка.

Анатоль КЛЯШЧУК.

СПЯКОТА ПРАЦЯГВАЕЦЦА, А Ў ПАЎДНЁВЫХ РЭГІЁНАХ КРАІНЫ ЯНА МОЖА СПРАВАКАВАЦЬ НАВАТ ЗАСУХУ

Пачатак сёлетняга лета выдаўся даволі актыўным, калі сярэднясутачная тэмпература паветра ў першыя дні чэрвеня была ажно на 4—9 градусаў вышэй за кліматычную норму. Захаваецца ў Беларусі спякотнае надвор'е і надалей — на працягу тыдня, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Сёння ўдзень будзе стаяць сонечнае, без ападкаў надвор'е, толькі ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях магчымы невялікія кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Максімальная тэмпература — 26—32.

У чацвер гарачыня крыху адпусціць, бо атмасферны ціск пачне зніжацца. У асобных раёнах краіны магчымы кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы на чацвер пасвяжэе толькі на паўночным усходзе, дзе чакаецца 9, аднак 19 будзе на паўднёвым захадзе. Удзень 9 чэрвеня — 24—30, на паўднёвым захадзе месцамі да 32.

Ужо ў пятніцу тэрыторыя краіны «па-сур'ёзнаму» трапіць у зону паніжанага ціску, таму месцамі спецыялісты чакаюць больш інтэнсіўныя кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Аднак гарачыня не спадзе. Уначы чакаецца 12—18, удзень — 23—29, месцамі на паўднёвым захадзе — да 30—32.

У выхадныя таксама будзе спякота. Толькі месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы 12—18, удзень 23—29, на поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей месцамі да 30.

Асобна Вольга Фядотава адзначыла, што на фоне анамальна высокіх тэмператур на паўднёвым усходзе Брэсцкай, на поўдні Мінскай і захадзе Гомельскай абласцей у маі выпала толькі каля паловы месячнай нормы ападкаў. Далейшая спякота ў чэрвені разам з сухім надвор'ем дае падставы для развіцця ў гэтых рэгіёнах засухі. Уся надзея на магчымыя дажджы на гэтым тыдні. Аднак сіноптыкі адзначаюць, што ападкі зараз назіраюцца ў кароткачасовым рэжыме і выпадаюць яны вельмі нераўнамерна. Няўжо засухі нам не пазбегнуць?..

Сяргей КУРКАЧ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.06.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
1 долар ЗША	4 966,00	1 чэшская крона	300,28	USD	27,7814
▲ 1 еўра	7 266,75	1 польскі злоты	1840,28	10 UAH	34,7920
1 латвійскі лат	10 255,03	▼ 1 расійскі рубель	178,75	1000 BYR	55,7635
1 літоўскі літ	2 107,45	1 украінская грыўня	621,57	EUR	40,6581

«Белнафтахім» з 7 чэрвеня павысіў рознічныя цэны на нафтапрадукты, што рэалізуюцца праз АЗС, у сярэднім на 31 працэнт

Гэтыя меры прыняты ў мэтах абароны ўнутранага рынку, паведамілі БЕЛТА на прадпрыемстве.

Рознічная цана за 1 літр складае: бензін Нармаль-80 — Br4950, бензін АІ-92 — Br5100, бензін АІ-95 — Br5800, бензін АІ-95-Еўра — Br5800, дызельнае паліва — Br5100.

На прадпрыемстве адзначылі, што, згодна з маніторынгам рэалізацыі нафтапрадуктаў на аўтазаправачных станцыях сістэмы канцэрна, на працягу мая гэтага года продаж аўтамабільнага паліва ўзрос у 1,5 раза, у тым ліку на АЗС у прыгранічных раёнах — у 2,3 раза.

БЕЛАРУСЬ ПА ВЫНІКАХ СТУДЗЕНЯ— КРАСАВІКА СТАЛА ЛІДАРАМ У СНД ПА РОСЦЕ ПРАМВЫТВОРЧАСЦІ

Гэты паказчык дасягнуў 12,9 працэнта ў параўнанні з аналагічным мінулагоднім перыядам. Такія звесткі прадаставілі БЕЛТА ў Міждзяржаўным статыстычным камітэце Садружнасці.

Другое месца заняла Украіна, дзе прамысловы рост склаў 8,5 працэнта, трэцяе месца — Арменія (6,4 працэнта). Далей ідуць Казахстан (6,1 працэнта), Кыргызстан (5,6 працэнта), Расія (5,5 працэнта) і Таджыкістан (3,9 працэнта). Спад прамысловай вытворчасці па выніках студзеня—красавіка на 0,9 працэнта зафіксаваны ў Азербайджане. У сярэднім па краінах СНД прамысловая вытворчасць у студзені—красавіку 2011 года павялічылася на 6,2 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам 2010 года.

БЕЛАРУСЬ ГАТОВА ПРАПАНАВАЦЬ КІТАЮ ЎДЗЕЛ У РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТАЎ У СФЕРЫ ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка вітае прыход у Беларусь буйных кітайскіх кампаній, якія працуюць у сферы высокіх тэхналогій. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў 7 чэрвеня на сустрэчы ў Мінску з кіраўніцтвам кітайскай прамысловай карпарацыі «Вялікая сцяна».

«Мы добра ведаем пра дзейнасць вашай кампаніі, тыя грандыёзныя праекты, якія вы рэалізуеце з 1980 года, і мы зацікаўлены ў супрацоўніцтве з вашай кампаніяй», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што ў бакоў ёсць «шматмільённыя праекты ў сферы высокіх тэхналогій, па якіх мы дамовіліся супрацоўнічаць».

«Тым не менш мы гатовы разгледзець любыя вашы прапановы па вашай дзейнасці ў Беларусі і гатовы таксама прапанаваць вам шэраг праектаў, якія мы маглі б ажыццявіць разам, выгадных для абодвух бакоў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу прэзідэнт прамысловай карпарацыі Інь Лімін расказаў, што мэтай прыезду кітайскай дэлегацыі ў Беларусь з'яўляецца рэалізацыя праекта спадарожнікавай сувязі, а таксама іншых праектаў у галіне высокіх тэхналогій. «Вельмі спадзяёмся пачаць супрацоўнічаць з Беларуссю ў галіне спадарожнікавай сувязі, спадарожнікавага дыстанцыйнага зандзіравання зямлі, іншых галінах высокіх тэхналогій, каб развіваць наша двухбаковае ўзаемадзеянне», — адзначыў кіраўнік карпарацыі.

Кітайская прамысловая карпарацыя «Вялікая сцяна» — буйнейшая дзяржаўная кампанія КНР, якая ажыццяўляе камерцыйныя запускі і пастаўку спадарожнікаў, а таксама займаецца развіццём міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне касмічнай тэхнікі. Нараўне з вытворчасцю касмічнай прадукцыі і аказаннем паслуг у сферы касмічных тэхналогій кампанія з'яўляецца пастаўшчыком новых крыніц энергіі і матэрыялаў, інфармацыйна-электроннай прадукцыі, нафтавага і нафтахімічнага абсталявання.

АДМІНІСТРАЦЫЯ ПРЭЗІДЭНТА ДА КАНЦА ГОДА ПРАВЯДЗЕ ПРАМЫЯ ЛІНІІ Ў КОЖНЫМ РАЁНЕ МІНСКА

Адміністрацыя Прэзідэнта Беларусі правядзе прамыя лініі з насельніцтвам да канца гэтага года ў кожным раёне Мінска. Аб гэтым паведаміў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей учора падчас прамой лініі ў адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска, перадае БЕЛТА.

«У лістападзе мінулага года кіраўнік дзяржавы правёў нараду па пытаннях работы са зваротамі грамадзян. Адміністрацыя Прэзідэнта рэгулярна праводзіць прамыя тэлефонныя лініі, прыёмы грамадзян. На ўзроўні Адміністрацыі Прэзідэнта прамыя лініі адбудуцца да канца года ва ўсіх раёнах сталіцы нараўне са штоквартальнымі прыёмамі і выязнымі прыёмамі грамадзян», — сказаў Уладзімір Макей.

Адрасаваныя кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі пытанні пераважна датычыліся работы ЖКГ і будаўніцтва жылля: гараджане скардзіліся на марудныя тэмпы будаўніцтва і падаражэнне кошту ў працэсе яго ўзвядзення. У сувязі з гэтым Уладзімір Макей нагадаў патрабаванне кіраўніка дзяржавы, агучанае на нарадзе 27 мая, — не павялічваць кошт будаўніцтва жылля па раней заключаных дагаворах. «Ёсць дакладнае патрабаванне Прэзідэнта: зрабіць так, каб людзі не адчулі павелічэння кошту будаўніцтва жылля», — сказаў ён. Адпаведнае пытанне кіраўнік дзяржавы даручыў прапрацаваць ва ўрадзе і выпрацаваць канкрэтныя прапановы, каб дольшчыкі не адчулі росту цэн.

Усе агучаныя падчас прамой лініі праблемы будуць дэталёва прааналізаваны адпаведнымі службамі. У бліжэйшы час мінчане атрымаюць пісьмовыя адказы на свае пытанні.

Адміністрацыя Фрунзенскага раёна Мінска для правядзення прамой лініі выбрана невыпадкова. У 2010 годзе ад жыхароў гэтага самага населенага сталічнага раёна, у якім пражывае 393,5 тыс. чалавек, паступіла больш за 2 тыс. зваротаў — на 33,2 працэнта больш у параўнанні з 2009-м. Раён з'яўляецца лідарам у Мінску па колькасці зваротаў у Адміністрацыю Прэзідэнта. Больш за ўсё людзі скардзіліся на сферу ЖКГ (518 зваротаў, рост на 59,8 працэнта). Часцей за ўсё жыхары гэтага раёна ўзнімаюць пытанні рамонту і эксплуатацыі жылля. Шмат зваротаў па пытаннях паляпшэння жыллёвых умоў. Актуальнай застаецца тэматыка зносу жылых дамоў. Шмат нараканняў і наконт правядзення ў жылых дамах капітальнага рамонту. Павелічэнне кошту будаўніцтва жылля, яго тэрмінаў, увод жылля са шматлікімі дэфектамі таксама прыводзіць да абгрунтаваных скаргаў людзей. Колькасць зваротаў па гэтай тэматыцы ўзрасла ў 2010 годзе на 17 працэнтаў да 110.

На 57,5 працэнта павялічылася ў 2010 годзе колькасць зваротаў фрунзенцаў у Адміністрацыю Прэзідэнта па пытаннях сацыяльнага забеспячэння. Захоўваецца рост зваротаў па пытаннях дзейнасці судоў і праваахоўных органаў (на 10 працэнтаў).

За студзень—красавік гэтага года ў Адміністрацыю Прэзідэнта ад жыхароў Фрунзенскага раёна паступіла 579 зваротаў, што на 6,2 працэнта больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Характар і тэматыка зваротаў практычна не змяніліся.

Адміністрацыя Фрунзенскага раёна праводзіць вялікую работу па вырашэнні ўзнятых у зваротах праблем, але меры не заўсёды эфектыўныя і дасягаюць жаданага выніку. Асобныя недахопы сведчаць аб неабходнасці актывізацыі работы ў гэтым напрамку. Трэба праводзіць больш глыбокі аналіз зваротаў і прымаць папераджальныя меры па ўстараненні прычын, якія выклікаюць скаргі, лічаць у Адміністрацыі Прэзідэнта.

ІНВЕСТАРАМ У БЕЛАРУСІ ПАШЫРАЮЦЦА ЛЬГОТЫ І ПРЭФЕРЭНЦЫІ

У Беларусі пашыраюцца льготы і прэферэнцыі інвестарам. Прэзідэнт Беларусі 6 чэрвеня выдаў адпаведны Дэкрэт № 4, якім унесены дапаўненні і змяненні ў Дэкрэт № 10 «Аб стварэнні дадатковых умоў для інвестыцыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» ад 6 жніўня 2009 года.

Дакументам прадугледжваецца пашырэнне пераліку льгот і прэферэнцый, якія прадастаўляюцца інвестарам пры заключэнні інвестыцыйнага дагавора.

Так, інвестар і (або) арганізацыя, ва ўстаноўленым парадку створаная ў Рэспубліцы Беларусь гэтым інвестарам або з яго ўдзелам, будуць мець права на прымяненне праектнай дакументацыі, распрацаванай за мяжой. У выпадку прымянення дакументацыі, распрацаванай у адпаведнасці з замежнымі нормамі праектавання і стандартамі ў галіне будаўніцтва, уведзенымі ў дзеянне на тэрыторыі Беларусі, прадугледжваецца выконваць толькі работы па прывязцы аб'ектаў да месца іх размяшчэння. У астатніх выпадках такая дакументацыя будзе карэктавацца. Акрамя таго, прадастаўляецца права вылічэння ў поўным аб'ёме сум падатку на дабаўленую вартасць, выплачаных пры набыцці тавараў (работ, паслуг), маёмасных правоў, выкарыстаных для праектавання, будаўніцтва і аснашчэння аб'ектаў, прадугледжаных інвестыцыйным праектам, а таксама вызначэння без правядзення падрадных таргоў генеральнай праектнай арганізацыі, субпадрадных праектных, будаўнічых і іншых арганізацый для будаўніцтва аб'ектаў, іх рамонту, рэканструкцыі, рэстаўрацыі і добраўпарадкавання.

Пры гэтым інвестар будзе вызвалены ад зямельнага падатку і арэнднай платы за зямельныя ўчасткі, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці і прадастаўлены для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта, на перыяд праектавання і будаўніцтва, адлічэнняў у інавацыйныя фонды, а таксама падаткаў, абавязак па выплаце якіх узнікае ў сувязі з бязвыплатнай перадачай інвестару для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта дзяржаўнай маёмасці (падатку на дабаўленую вартасць — у перадаючага боку, падатку на прыбытак — у прымаючага боку).

У адпаведнасці з Дэкрэтам прадугледжана распаўсюджванне шэрагу прэферэнцый на рэзідэнтаў СЭЗ, у прыватнасці ўключана норма аб вызваленні іх ад платы за права заключэння дагавора арэнды зямельнага ўчастка, якая паступае ў фонд развіцця адпаведнай СЭЗ.

Дакумент дасць магчымасць прадаставіць інвестарам дадатковыя льготы і прэферэнцыі ў рамках інвестыцыйнага заканадаўства і павялічыць прыток капіталу ў эканоміку краіны.

ПАСТАЎКА БЕЛАРУСІ ГАЗУ ПА РОЎНАДАХОДНЫХ ЦЭНАХ ПАВІННА БЫЦЬ АБАВЯЗКОВАЙ УМОВАЙ ПРОДАЖУ АКЦЫЙ «БЕЛТРАНСГАЗА»

Аб гэтым паведаміў журналістам першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка, адказваючы на пытанне БЕЛТА.

Уладзімір Сямашка адзначыў, што дагавор аб магчымым продажы «Газпраму» другой палавіны акцый «Белтрансгаза» знаходзіцца практычна ў стапрацэнтнай гатоўнасці, але беларускі бок увязвае гэта пытанне з падпісаннем новага кантракта на пастаўку газу ў Беларусь. «Дзейны кантракт завяршаецца 31 снежня гэтага года. Цяпер мы абмяркоўваем праект кантракта на 2012-2014 гады, і ў гэтым кантракце закладзены прынцыпова новыя падыходы. Гэтыя падыходы заснаваны на тым пакеце пагадненняў, якія мы падпісалі 9 снежня 2010 года, ствараючы Адзіную эканамічную прастору», — сказаў Уладзімір Сямашка.

Ён нагадаў, што падпісана 17 дакументаў, у тым ліку па стварэнні адзінага газавага рынку. Гэта адзін з базавых дакументаў, дзе агаворана, што Беларусь і Расія павінны сінхронна выйсці на роўнадаходныя цэны да 2015 года. «Гэта прадугледжвае зусім іншую сістэму цэнаўтварэння, а для нас — іншыя цэны, падыходы. Мы цяпер вядзём перагаворы, і калі два гэтыя пытанні сыходзяцца (пытанні цэнаўтварэння і продажу «Белтрансгаза». — Заўвага БЕЛТА), то мы гатовы хоць сёння падпісаць два дакументы — кантракт на пастаўку газу і кантракт на продаж пакета акцый «Белтрансгаза», — адзначыў Уладзімір Сямашка.

У БЕЛАРУСІ ПАШЫРАЕЦЦА СФЕРА АБАВЯЗКОВАЙ КРЫМІНАЛАГІЧНАЙ ЭКСПЕРТЫЗЫ ПРАЕКТАЎ НАРМАТЫЎНЫХ ПРАВАВЫХ АКТАЎ

У Беларусі пашыраецца сфера абавязковай крыміналагічнай экспертызы праектаў нарматыўных прававых актаў. Адпаведны Указ нумар 230 «Аб мерах па ўдасканаленні крыміналагічнай экспертызы» 6 чэрвеня падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Указ падпісаны ў мэтах прадухілення магчымых крымінагенных наступстваў прыняцця прававых актаў, забеспячэння іх эфектыўнага ўплыву на ўмацаванне законнасці і правапарадку. Ім прадугледжана пашырэнне сферы абавязковай крыміналагічнай экспертызы праектаў нарматыўных прававых актаў, што праводзіцца для выяўлення ў праектах норм, прымяненне якіх можа прывесці да ўзнікнення рызык крымінагеннага характару.

Крыміналагічная экспертыза з 1 студзеня 2012 года ўводзіцца адносна праектаў нарматыўных прававых актаў Камітэта дзяржаўнага кантролю, Нацыянальнага банка, Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Крыміналагічная экспертыза ўводзіцца таксама адносна праектаў нарматыўных прававых актаў урада — паэтапна з 1 студзеня 2012 года і 1 студзеня 2014 года.

Акрамя таго, паэтапна з 1 студзеня 2015 года і 1 студзеня 2017 года яна ўводзіцца адносна праектаў нарматыўных прававых актаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Крыміналагічная экспертыза названых праектаў будзе ажыццяўляцца дзяржаўнай установай «Навукова-практычны цэнтр праблем умацавання законнасці і правапарадку Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь», якой ужо цяпер гэта экспертыза праводзіцца адносна праектаў законаў.

У зацверджаным указам Палажэнні аб парадку правядзення крыміналагічнай экспертызы дакладна рэгламентаваны наступствы прыняцця адмоўных заключэнняў крыміналагічнай экспертызы, уключаючы парадак дапрацоўкі праектаў нарматыўных правых актаў.

Указам прадугледжана накіраванне на крыміналагічную экспертызу і дзеючых прававых актаў на падставе рашэнняў кіраўніка дзяржавы, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Генеральнай пракуратуры, а таксама магчымасць накіравання праектаў прававых актаў на крыміналагічную экспертызу на добраахвотнай аснове ў выпадку, калі яе правядзенне не з'яўляецца абавязковым.

У адпаведнасці з указам ураду і Генеральнай пракуратуры даручана сумесна з абласнымі, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам да 1 студзеня 2016 года ўнесці на разгляд кіраўніка дзяржавы прапановы, звязаныя з пераходам да абавязковай крыміналагічнай экспертызы праектаў усіх нарматыўных рашэнняў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распарадчых органаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АБ СТАНЕ ЗОЛАТАВАЛЮТНЫХ РЭЗЕРВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Паводле папярэдніх звестак, у маі 2011 года міжнародныя рэзервовыя актывы Рэспублікі Беларусь у вызначэнні ССРД МВФ скараціліся на 200,4 млн долараў ЗША, і на 1 чэрвеня 2011 г. іх аб'ём склаў 3593,1 млн долараў ЗША ў эквіваленце.

У нацыянальным вызначэнні аб'ём золатавалютных рэзерваў краіны скараціўся на 236,6 млн долараў ЗША і на 1 чэрвеня 2011 г. склаў 5103,3 млн долараў ЗША ў эквіваленце. Скарачэнне золатавалютных рэзерваў звязана з выкананнем у маі Нацыянальным банкам і ўрадам Рэспублікі Беларусь знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце.

Упраўленне інфармацыі Нацыянальнага банка.

НА СТАНЦЫЯХ МЕТРО ЎСТАНОВЯЦЬ ДАТЧЫКІ, ЯКІЯ БУДУЦЬ СІГНАЛІЗАВАЦЬ АБ ПРАХОДЗЕ ЎНУТР ПАБОЧНЫХ ПАСЛЯ ЗАКАНЧЭННЯ РУХУ ЦЯГНІКОЎ

Дзверы будзе немагчыма адчыніць простым ключом.

Абзац

◢ Квартал шматпавярховай забудовы з'явіцца на месцы былога ваеннага гарадка ў цэнтры Гродна. Паступова будуць узводзіцца і аб'екты інфраструктуры. Былы ваенны гарадок уяўляе сабой участак амаль у 12 га побач з гістарычным цэнтрам.

◢ У вадаёмах Беларусі вада прагрэлася да тэмпературы паўднёвых мораў — плюс 25 градусаў. Па звестках спецыялістаў, такой цёплай вада ў пачатку лета бывае на курортах Крыма, Чорнага і Азоўскага мораў. Напрыклад, на Азоўскім моры ўчора з раніцы тэмпература вады складала ад 22 да 24 градусаў цяпла, на ўзбярэжжы Чорнага мора — плюс 20—23 градусы. У беларускіх рэках і азёрах вада праграецца зараз да 23-25 градусаў. Звычайна ў чэрвені сярэднямесячная тэмпература вады знаходзіцца ў межах 18—20 градусаў.

◢ Мінчук на наступны дзень пасля суда зноў заняўся незаконным гандлем макам. Учора міліцыя затрымала яго на вул. Кабушкіна пры рэалізацыі насення маку па Br140 тыс. за кг. У аўтамашыне затрыманага выяўлена 26 кг маку, які быў расфасаваны ў пакеты. За дзень да затрымання суд аштрафаваў яго на Br3,5 млн і прыняў рашэнне аб канфіскацыі аўтамабіля. Зараз парушальніка чакаюць новыя санкцыі, не выключана, што гэта будзе крымінальная адказнасць.

◢ Карціна рускага мастака Ілы Рэпіна «Парыжская кавярня» прададзеная на летняй сесіі «рускіх таргоў» брытанскага аўкцыйнага дому Christie's за 4,521 млн. фунтаў стэрлінгаў ($7,383 млн). Тым самым установлены абсалютны рэкорд продажаў узораў рускага жывапісу на міжнародных таргах. Пакупнік карціны пажадаў застацца невядомым.

Поўны абзац

◢ У Львове (Украіна) з сала зляпілі жаночыя грудзі і нос Гогаля. На гэтым тыдні ў горадзе адчыняецца ўнікальны музей-рэстаран сала. Разыначка ўстановы — сальныя скульптуры, якія можна спажыць пад чарачку гарылкі. Скульптары выразалі з нацыянальнага прадукту сімвалічныя фігуркі тыпу грудзей Венеры Мілоскай у выглядзе сэрца, носа Гогаля, вуха Ван Гога, вуснаў Мерылін Манро і інш. Як патлумачыў аўтар кампазіцыі, львавянін Міраслаў Дзядышын, на адну скульптурку пайшло ад 2 да 4 кг адборнага сала. Копію любой фігуркі, што ляжаць за шклом у лядоўні, можна замовіць на абед. Сальныя скульптуры да ўсяго будуць нафаршыраваныя гарачай начынкай на выбар — мясам, цялячымі мазгамі, варэнікамі, бульбай, рабрынкамі. Такая страва на кампанію з 2-4 чалавек абыдзецца ў 50 — 200 грыўняў. Напрыклад, за нафаршыраваны бюст Венеры просяць паўтары сотні грыўняў. Для хуткага перакусу — славутае сала ў шакаладзе і сушы-сала ў выглядзе ролаў з рысам і часнаком.



Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ЦЫГАРЭТЫ ДАРАЖЭЮЦЬ

У Беларусі з 8 чэрвеня павышаюцца рознічныя цэны на цыгарэты айчыннай і замежнай вытворчасці, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Міністэрства эканомікі Беларусі.

У сувязі са змяненнем сітуацыі на валютным рынку па прапанове канцэрна «Белдзяржхарчпрам», ТАА «Тытунь-інвест», РВГУП «Беларусьгандаль» і іншых зацікаўленых пастановай Міністэрства эканомікі ад 6 чэрвеня 2011 года № 86 «Аб унясенні змяненняў у пастанову Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 29 сакавіка 2010 года № 61» уведзены новыя рознічныя цэны на цыгарэты айчыннай і замежнай вытворчасці.

Прыняцце гэтага рашэння абумоўлена перш за ўсё ростам курсу асноўных замежных валют адносна беларускага рубля, які ўлічваецца пры фарміраванні цэн на тытунёвыя вырабы. Акрамя таго, яно прынята ў мэтах выканання Плана мерапрыемстваў па барацьбе з тытунекурэннем у адпаведнасці з палажэннем Рамачнай канвенцыі СААЗ, а таксама для прадухілення несанкцыянаванага вывазу тытунёвай прадукцыі за межы рэспублікі.

Пастанова Міністэрства эканомікі № 86 уступае ў сілу з 8 чэрвеня 2011 года.

З 8 ЧЭРВЕНЯ ПАВЯЛІЧВАЮЦЦА ЦЭНЫ НА СВІНІНУ

Гранічныя максімальныя адпускныя цэны на свініну патушную ў Беларусі з 8 чэрвеня павялічваюцца на 10 працэнтаў. Такое рашэнне змешчана ў пастанове Міністэрства эканомікі ад 6 чэрвеня гэтага года № 87, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Мінэканомікі.

У сувязі з ростам сусветных цэн на важнейшыя сыравінныя рэсурсы і завозімыя па імпарце бялковыя дабаўкі для вытворчасці камбікармоў, змяненнем сітуацыі на валютным рынку сельгасвытворцамі былі павялічаны закупачныя цэны на свіней.Гэту пастанову Міністэрства эканомікі прыняло па прапанове Мінсельгасхарча ў мэтах частковай кампенсацыі падаражэння мясной сыравіны, устараненне значнага разрыву з цэнамі на свініну ў суседніх рэгіёнах і прадухілення несанкцыянаванага вывазу мяса за межы рэспублікі. У адпаведнасці з гэтым дакументам унесены дапаўненні і змяненні ў пастанову Міністэрства эканомікі ад 27 красавіка 2011 года № 65.

НА БЕЛАГРА-2011 — УВЕСЬ АГРАПАТЭНЦЫЯЛ КРАІНЫ

Учора пачала работу спецыялізаваная выстава «Белагра-2011», якая па сваёй маштабнасці не мае аналагаў у Беларусі. У 11 гадзін адкрыўся павільён у сталіцы, а праз гадзіну чырвоную стужку перарэзалі і на дэманстрацыйным полі ААТ «Гастэлаўскае» (далей — Беларускае поле. — Аўт). У цырымоніі ўрачыстага адкрыцця прынялі ўдзел намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Валерый ІВАНОЎ, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Міхаіл Русы, галіновыя міністры, замежныя госці.

Каля 70% усёй экспазіцыі Беларускага аграпрамысловага тыдня прадстаўлены айчыннымі вытворцамі. Сярод замежных краін (*у выставе прымаюць удзел больш за 350 экспанентаў з 15 краін*. — **Аўт.**) найбольш маштабна прадстаўлены Германія, Расія, Літва, Францыя і Польшча.

Пастаянны рост экспанентаў і наведнікаў садзейнічаў таму, што выстава ўжо трэці год праходзіць на двух экспазіцыйных пляцоўках. Асноўная «фішка» выязной экспазіцыі — дэманстрацыя рознай сельгастэхнікі падчас работы ў полі. На Беларускім полі можна азнаёміцца і з дасягненнямі ў племянной жывёлагадоўлі, прадукцыяй буйнейшых рыбгасаў рэспублікі і г. д.

— У выніку рэалізацыі дзяржпраграмы адраджэння і развіцця вёскі аб'ёмы валавай сельскагаспадарчай прадукцыі ва ўсіх катэгорыях гаспадарак павялічылася на 24%, у тым ліку ў грамадскім сектары — на 50% падкрэсліў Валерый Іваноў. — Беларусь па вытворчасці прадукцыі харчавання на душу насельніцтва займае першае месца сярод краін СНД і ўваходзіць у лік сусветных лідараў па вытворчасці малака, бульбы і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі. Забяспечана тэхнічная і тэхналагічная незалежнасць сельскай гаспадаркі, на строгую навуковую аснову пастаўлена забяспечанасць сельскай гаспадаркі насенным матэрыялам і племянной жывёлай.

Валерый Іваноў лічыць, што новыя магчымасці па расшырэнні рынкаў збыту сельскагаспадарчай прадукцыі павінна адкрыць кааперацыя прадпрыемстваў, у тым ліку з замежнымі партнёрамі. Многія рашэнні ў гэтым кірунку, упэўнены, будуць прынятыя ўжо падчас работы выставы.

— Мы рады ўсім гасцям, якія прыехалі нешта новае ў нас паглядзець і сваім новым падзяліцца, — працягнуў думку Міхаіл Русы. — Будзем супрацоўнічаць, завязваць кантакты, заключаць кантракты. Выстава для таго і праводзіцца, каб даць новы імпульс супрацоўніцтву.

Літаральна ў панядзелак — першы дзень аграпрамысловага тыдня — было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве на пяцігодку паміж аграрнымі ведамствамі Беларусі і Малдовы. Плануецца расшырыць супрацоўніцтва ў раслінаводстве, у прыватнасці ў агародніцтве і садаводстве, у галіне селекцыі кукурузы паміж Навукова-практычным цэнтрам па земляробстве НАН Беларусі і Малдаўскім НПЦ «Порумбень». Гаворка ідзе аб стварэнні ў Малдове для Беларусі бацькоўскіх форм гібрыдаў кукурузы з высокім генетычным патэнцыялам. Важным кірункам супрацоўніцтва Міхаіл Русы назваў і атрыманне арыгінальнага насення цукровых буракоў і люцэрны, а таксама размнажэнне ў Малдове арыгінальнага насення гароднінных культур беларускай селекцыі.

— Сёлета ўступіць у строй 7 тыс 800 гектараў маладога саду, які быў пасаджаны 2 гады таму. Налета плануем выйсці на 15 тыс гектараў. Перад намі стаіць задача — праз два гады цалкам вырашыць праблему забеспячэння насельніцтва садавіной уласнай вытворчасці. Для гэтага актыўна будуем сховішчы. А то вырасціць вырасцім, а захаваць не можам: частка садавіны і гародніны ідзе на корм жывёле. Гэта не па-гаспадарску.

Больш за ўсё людзей пасля адкрыцця выставы мы засталі побач з быком па мянушцы Граф. Паводле слоў **Кацярыны ЛЯПЦЮК, якая прадстаўляе на выставе СВК «Агра-Моталь» (Іванаўскі раён), бык важыць 1,3 тоны.**

— Гэта самы буйны прадстаўнік лімузінскай мясной пароды нашай гаспадаркі. Яго пяць гадоў таму цялём прывезлі з Венгрыі. Мяса гэтай жывёлы вельмі цэняцца: яно ў «лімузінаў» з крапінкамі тлушчу (мармуровае). Чыстапародныя цяляткі карыстаюцца попытам: іх у нас набываюць для развядзення іншыя гаспадаркі.

Непадалёку ад клеткі Графа мы пазнаёміліся і з парсючкамі пароды ёркшыр. Лідзія ФЕДАРЭНКАВА, галоўны навуковы супрацоўнік РУП НПЦ НАН Беларусі па жывёлагадоўлі, доктар сельскагаспадарчых навук, расказала, што свінаматку ў канцы 2009 года прывезлі з Францыі. Прыплод жа атрымалі ўжо ў Беларусі.

— Свінні пароды ёркшыр (французскай селекцыі) адрозніваюцца высокімі мяснымі якасцямі: тонкі шпік, недзе да 10 мм. Адным словам, сала практычна няма. Утрыманне поснага мяса ў целе вельмі высокае — да 65%. Разводзяцца яны ў «Нукліўсе» Аграплемэліта Жодзіна (на фота заатэхнік Валянціна ШМАНАЙ). Мы вырошчваем парсючкоў і прадаём у іншыя гаспадаркі. Там іх разводзяць і выкарыстоўваюць на прамысловых комплексах. Пакуль прадаём па Беларусі. Кілаграм жывой масы каштуе 10 600 рублёў. Гэта ў некалькі разоў танней, чым каштуюць імпартныя. Мы задаволены, жывёла прыгожая. Адзінае, ёсць праблема з кармамі. А хочацца, каб кармы пастаянна былі ў дастатку.

Нагадаем, што выстава праходзіць адначасова на дзвюх пляцоўках — у павільёне пад дахам на праспекце Пераможцаў, 20/2 і за горадам — на пляцоўцы для дэманстрацый ААТ «Гастэлаўскае» побач з Сеніцай. Абедзве пляцоўкі злучаны рэгулярным аўтобусным паведамленнем. Выстава працягнецца да 12 чэрвеня ўключна.

Надзея ДРЫЛА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

СОНЦА СПАЛЬВАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У гэты перыяд гаспадаркі звычайна бяруць самае вялікае малако. А тут раён пачынае пакрыху мінусаваць па надоях.

У Столінскім раёне таксама перасяваюць некаторыя плошчы. І тут сустракаюцца з аналагічнымі праблемамі, як і калегі. «Калі перасяваць зараз, — гаворыць Лявонцій Ляшкевіч, — абавязкова трэба ўносіць у глебу азотныя ўгнаенні. Яны каштуюць нятанна. А бензавоз паліва сёння ўжо — 25 мільёнаў рублёў. Круціся, што называецца, як хочаш».

Вельмі складанай назваў сітуацыю ў палескіх раёнах — Пінскім, Столінскім і Лунінецкім — **намеснік старшыні Брэсцкага аблсельгасхарчу Аляксей ТРАЦЮК**. З-за небывалай вясновай засухі пад пагрозай аказалася значная частка ўраджаю. І тут ужо людзі пры ўсім старанні, пры максімальным захаванні тэхналогіі мала што могуць змяніць. Застаюцца толькі спадзяванні на нябесную канцылярыю. Метэаролагі няўпэўнена абяцаюць у лепшым выпадку трошкі дажджу на наступным тыдні. А тут вырашае кожны дзень.

Тым часам на Брэстчыне склалася вельмі трывожная сітуацыя ў лясах, на тарфяніках. 7 чэрвеня ў трох раёнах — Брэсцкім, Драгічынскім, Пінскім — аб'яўлена пятая (найвышэйшая) ступень пажарнай небяспекі. Паводле інфармацыі **памочніка начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргея МАШНОВА**, у большасці палескіх раёнаў і да ўчарашняга дня ў названых існавала чацвёртая, таксама вельмі высокая ступень. З пачатку спякотнага надвор'я зафіксавана больш за 50 ачагоў лясных пажараў. Звыш 60 разоў выязджалі падраздзяленні пажарнай службы на тушэнне тарфянікаў. Апошнімі днямі тарфянікі масава загараюцца.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

«ПРАМЫЯ ЛІНІІ» КАМІТЭТА ДЗЯРЖКАНТРОЛЮ

9 чэрвеня 2011 года з 10.00 да 13.00 адбудзецца «прамая лінія» Камітэта дзяржаўнага кантролю па пытаннях якасці, кошту і тэрмінаў будаўніцтва жылля ў г. Мінску.

Жыхары сталіцы могуць паведаміць пра факты парушэнняў, якія дапушчаны пры ўзвядзенні іх жылля долевым спосабам або праз ЖБСК, а таксама адсутнасць мер рэагавання на звароты грамадзян з боку заказчыкаў (забудоўшчыкаў) і дзяржаўных органаў.

Спецыялісты Камітэта дзяржкантролю вывучаць звароты мінчан, звязаныя з неабгрунтаванымі патрабаваннямі заказчыка (забудоўшчыка) па павелічэнні цаны квадратнага метра ў жылым доме, які ўжо ўзведзены або яшчэ будуецца, наяўнасцю будаўнічых дэфектаў, выяўленых пры засяленні, працяглым ухіленнем заказчыка (забудоўшчыка) ад ліквідацыі такіх дэфектаў, зацягваннем тэрмінаў будаўніцтва жылых памяшканняў.

Тэлефон «прамой лініі» — (017) 328 69 40.

10 чэрвеня 2011 г. з 15.00 да 16.30 старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах Анатоль Мікалаевіч Рубінаў правядзе «прамую лінію» па пытаннях арганізацыі і парадку правядзення ўступнай кампаніі 2011 года.

У рамках тэлефонных зносінаў жыхары рэспублікі маюць магчымасць абазначыць праблемы, звязаныя з паступленнем у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

У «прамой лініі» таксама возьмуць удзел прадстаўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю і Міністэрства адукацыі.

Тэлефон «прамой лініі» (017) 328 69 40.

Прамая лінія

ХВАРОБЫ СКУРЫ: ЛЕЧЫМСЯ З РОЗУМАМ

Герпес, мікозы, псарыяз, атапічны дэрматыт — гэтыя і іншыя захворванні скуры не толькі непрыемныя і пагаршаюць якасць жыцця, яны яшчэ працягла лечацца і могуць прыносіць сур'ёзныя ўскладненні. Таму не варта адразу кідацца лячыць свае балячкі мазямі, якія актыўна рэкламуюцца, трэба абавязкова звяртацца па кансультацыю да спецыяліста.

У нашай чарговай «прамой лініі» возьме ўдзел урач-дэрматавенеролаг, загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурвендыспансэра Уладзімір Іванавіч Яроміч.

«Прамая лінія» адбудзецца **14 чэрвеня ў аўторак з 12.00 да 13.00** па нумарах **8 (017) 292 38 92** і **292 38 21**. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах **8 (017) 287 18 36** і **287 18 72**.

ЗАРАБІЎ НА ВАЛЮЦЕ ЗВЫШ 100 МІЛЬЁНАЎ

Усяго за два месяцы грамадзянін, які ў Полацку займаўся абменам валюты, атрымаў незаконны даход у памеры больш за 105,9 мільёна рублёў.

У ходзе затрымання і падчас агляду яго жылля праваахоўныя органы канфіскавалі звыш 17,5 тысячы амерыканскіх долараў, 393 тысячы расійскіх рублёў, амаль 5,5 тысячы еўра, звыш 4,8 мільёна беларускіх рублёў і 100 грыўняў. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ХАБАР ЗА КРЭДЫТ

Заведзена крымінальная справа супраць сланімчанкі, якая, працуючы на пасадзе начальніка цэнтра банкаўскіх паслуг № 303 ААТ «Банк Масква—Мінск» у Слонімскай цэнтральнай раённай бальніцы, атрымала хабар у памеры 4 мільёнаў рублёў.

Хабар жанчына атрымала за спрыяльнае вырашэнне пытання аб выдачы крэдытных грашовых сродкаў у памеры 14 мільёнаў 900 тысяч рублёў сланімчанцы, якая нідзе не працуе.

Сяргей ЧЫГРЫН.

СІГНАЛІЗАЦЫЯ НЕ ПАДВЯЛА

На вул. Вільчкоўскага ў Баранавічах чалавек будуе катэдж, але ведаючы, што зладзеі часта наведваюць такія будынкі, правёў сігналізацыю.

Праз нейкі час сігналізацыя спрацавала, і ахоўнікі, якія пад'ехалі, затрымалі мужчыну з двума пакетамі. Злодзей разбіў шыбу, залез у дом і прыхапіў 130 метраў меднага кабелю. На наступны дзень ахове зноў давялося ехаць да катэджа на спрацоўку сігналізацыі. На гэты раз удалося затрымаць родных братоў — 15 і 17 гадоў, якія таксама спрабавалі ўкрасці кабель. Заведзены крымінальныя справы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Юрый ЖАДОБІН:

«Комплекснае рэагаванне на пагрозы, якія ўзнікаюць, дазволіць АДКБ захаваць статус гаранта бяспекі»

У Мінску ўчора адбылося пасяджэнне Савета міністраў абароны Арганізацыі Дагавору аб калектыўнай бяспецы. У пасяджэнні ўзялі ўдзел міністр абароны Рэспублікі Беларусь Юрый Жадобін, генеральны сакратар АДКБ Мікалай Бардзюжа, а таксама міністры і намеснікі міністраў абароны Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана і Узбекістана.

Паводле слоў міністра абароны Беларусі Юрыя Жадобіна, комплекснае рэагаванне на выклікі і пагрозы, якія ўзнікаюць, з адначасовым задзейнічаннем усяго патэнцыялу — палітычнага, ваеннага, спецыяльных органаў і службаў, — дазволіць АДКБ захаваць статус асноўнага гаранта бяспекі.

Міністры абароны дзяржаў-членаў АДКБ абмеркавалі пытанні павышэння эфектыўнасці ўзаемадзеяння начальнікаў генеральных штабоў і ўдасканаленне дзейнасці Аб'яднанага штаба АДКБ. Удзялялася ўвага і праблеме аснашчэння Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання сучаснымі відамі ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікай. Былі разгледжаны праекты палажэнняў аб базавай арганізацыі дзяржаў — членаў АДКБ у галіне даследавання праблем ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва і аб міждзяржаўнай сістэме каталагізацыі прадметаў забеспячэння Узброеных Сіл. У цэнтры ўвагі апынулася і ўнясенне змяненняў у План сумесных мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі органаў упраўлення і фарміравання сіл і сродкаў сістэмы калектыўнай бяспекі АДКБ на 2011 год у сувязі з ініцыятывай мінабароны Расіі. Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі прапанавала абмеркаваць пытанні прымянення Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання АДКБ падчас аднаго з этапаў стратэгічнага вучэння «Цэнтр-2011» у верасні гэтага года, а запланаванае на бягучы год вучэнне калектыўных сіл на тэрыторыі Арменіі правесці ў наступным годзе, калі будуць праходзіць мерапрыемствы, прысвечаныя 20-годдзю падпісання Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Як адзначыў генсак АДКБ Мікалай Бардзюжа, сёлета асноўныя намаганні былі засяроджаны на практычнай дзейнасці па падрыхтоўцы сіл і сродкаў у выпадку крызісных сітуацый. Ён таксама адзначыў, што нарматыўная база АДКБ павінна развівацца дзеля зладжаных дзеянняў членаў арганізацыі ў надзвычайных сітуацыях. Дарэчы, у межах АДКБ зараз дзейнічае звыш 150 рашэнняў і звыш 40 дагавораў. Мікалай Бардзюжа таксама нагадаў, што ў маі бягучага года ў межах АДКБ была праведзена сумесная дзелавая гульня з удзелам паўнамоцных прадстаўнікоў краін-удзельніц. Гэта дазволіла адпрацаваць парадак дзеянняў па папярэджванні і ўрэгуляванні крызісных сітуацый у зоне адказнасці арганізацыі.

Пытанне аб складзе і дыслакацыі міратворчых сіл АДКБ плануецца ўзгадніць на снежаньскай сесіі Калектыўнага савета бяспекі. Юрый Жадобін выказаў надзею, што да моманту ўзгаднення пытання аб узаемадзеянні з ААН у міратворчай галіне міратворчы кантынгент АДКБ будзе поўнасцю гатовы да падтрымання міру.

Зараз вядзецца падрыхтоўка да сустрэчы кіраўнікоў парламенцкіх камітэтаў, якія адказваюць за бяспеку. Сустрэча павінна адбыцца ў чэрвені ў Дзяржаўдуме РФ. Ідзе падрыхтоўка і да правядзення Парламенцкай асамблеі АДКБ у Мінску.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Спыніць эпідэмію СНІДу да 2015 года

ТАКАЯ галоўная мэта дзяржаўнай Праграмы прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі ў Беларусі. Сваім досведам барацьбы з гэтай смяротнай хваробай падзеляцца з сусветнай супольнасцю прадстаўнікі медыцынскіх службаў нашай краіны. Яны выступяць Нью-Ёрку ў штаб-кватэры ААН на спецыяльнай сустрэчы па праблеме СНІДу, якая сёння пачынае сваю работу. На яе прыехалі лідары дзяржаў, кіраўнікі ўрадаў, прадстаўнікі навуковых колаў, грамадскіх арганізацый і бізнэсу.

Нагадаем, эпідэмія ВІЧ-інфекцыі вядзе свой адлік з чэрвеня 1981 года, калі навукоўцы выявілі першы выпадак імуннага збою ў арганізме чалавека, які пазней будзе названы ВІЧ. Сёння, праз трыццаць гадоў, надышоў час ацаніць прагрэс у супрацьдзеянні эпідэміі, якая забрала больш 30 мільёнаў жыццяў, выпрацаваць далейшыя крокі, а таксама абмяняцца досведам у гэтай жорсткай барацьбе. А здабыткі ўжо ёсць. Цяпер з 30 мільёнаў чалавек, якія жывуць з ВІЧ у краінах з нізкім і сярэднім узроўнем даходаў, больш за 6 мільёнаў атрымалі доступ да выратавальнага антырэтравіруснага лячэння. За апошняе дзесяцігоддзе амаль на 20% знізіўся лік новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. Аднак і сёння на кожнага чалавека, які пачынае атрымліваць лячэнне, прыходзіцца два новыя выпадкі інфіцыявання. І ўпершыню з пачатку эпідэміі ў 2009 годзе больш за 50% жанчын планеты, у якіх выяўлена станоўчая рэакцыя на ВІЧ, нарадзілі здаровых дзяцей.

Тым не менш, прагрэс, дасягнуты за апошняе дзесяцігоддзе, застаецца даволі сціплым, асабліва ў краінах Усходняй Еўропы, дзе працягваецца рост новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. Напрыклад, з 1987 года, калі ў Беларусі быў зафіксаваны першы выпадак ВІЧ-інфекцыі, па 1 мая 2011 года было зарэгістравана 12 133 выпадкі ВІЧ-інфекцыі. Большасць ВІЧ-інфіцыяваных — гэта маладыя людзі ад 15 да 29 гадоў. За апошнія некалькі гадоў доля перадачы ВІЧ палавым шляхам вырасла да 75%. У той час перадача віруса пры ўнутрывенным спажыванні наркотыкаў, якая першапачаткова была асноўным шляхам перадачы хваробы, скарацілася да 21% ад агульнага ліку новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі.

Асноўныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі, закліканыя забяспечыць адэкватныя меры ў адказ на сітуацыю з ВІЧ-інфекцыяй у Беларусі, выкладзены ў Дзяржаўных праграмах прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі. Гэтыя дакументы адлюстроўваюць прыярытэтныя кірункі дзейнасці і ўзаемадзеяння па прафілактыцы, лячэнні, доглядзе і падтрымцы хворых, стабілізацыі іх стану, павелічэнню працягласці жыцця і зніжэнню смяротнасці хворых з ВІЧ і СНІДам.

Тым не менш, застаецца шэраг праблем, якія патрабуюць неадкладнага рашэння. Адна з найважнейшых — значнае павелічэнне долі перадачы хваробы палавым шляхам і рост колькасці хворых на ВІЧ жанчын. У выніку расце і лік дзяцей, народжаных ВІЧ-інфіцыяванымі маці. Таму задача па зніжэнні рызыкі інфіцыявання дзяцей і правядзенне ўсіх прафілактычных мерапрыемстваў з улікам гендарнага падыходу, вызначаная ў новай дзяржаўнай Праграме прафілактыкі ВІЧ на 2011—2015 гады, з'яўляецца ключавой для забеспячэння здароўя будучых пакаленняў.

Антоніюс БРУК, прадстаўнік ААН/ПРААН у Беларусі.
Алег АРНАУТАЎ,
намеснік міністра аховы здароўя Беларусі.

З ДЗІЦЕМ — КАМАНДЗІРОЎКА ПА ЖАДАННІ

On-line-канферэнцыя

Сяргей ГРЫБ

З пункту гледжання нашага заканадаўства, кожны работнік мае роўныя правы і абавязкі. Аднак у агульным правіле ўсё ж ёсць выключэнні — гаворка аб жанчынах і няпоўнагадовых грамадзянах. Так, не сакрэт, што для іх існуюць дадатковыя працоўныя гарантыі. І менавіта гэта стала тэмай чарговай інтэрактыўнай канферэнцыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, удзел у якой узялі намеснік міністра Аляксандр Аляксеевіч РУМАК, намеснік дырэктара дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Ірына Фёдараўна ШЫЛЯЕВА, галоўны юрысконсульт аддзела працоўнага заканадаўства Таццяна Валер'еўна РАБУХА і начальнік упраўлення аховы і дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы Іван Аляксандравіч КАРЧЭЎСКІ.

@ Наколькі правамоцная прапанова наймальніка заключыць кантракт з жанчынай, якая адна выхоўвае няпоўнагадовае дзіця?

— Такая прапанова правамоцная. Пры заключэнні кантрактаў ніякіх выключэнняў з агульных правілаў для адзінокіх маці наша заканадаўства не робіць.

@ Ці можа жанчына, якая мае 7-гадовае дзіця, адмовіцца ад службовай камандзіроўкі?

— Паводле 263 артыкула Працоўнага кодэкса, жанчыны, якія маюць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 14 гадоў або дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, накіроўваюцца ў службовую камандзіроўку толькі з асабістай пісьмовай згоды — у прыватнасці, на самім загадзе. Прычым калі такія жанчыны згоды на камандзіроўку не даюць, то расцэньваць адмову як дысцыплінарны праступак нельга.

@ Ці можа жанчына з няпоўнагадовым дзіцем разлічваць на няпоўны працоўны дзень?

— Паводле 289 артыкула Працоўнага кодэкса, наймальнік абавязаны вызначыць няпоўны працоўны дзень ці няпоўны працоўны тыдзень з аплатай прапарцыянальна адпрацаванаму часу па просьбе жанчыны, якая мае дзіця ва ўзросце да 14 гадоў. Для гэтага такая жанчына павінна звярнуцца да наймальніка з пісьмовай заявай.

@ Дзе нельга працаваць жанчынам?

— Наша заканадаўства забараняе працу жанчын на пэўных работах з цяжкімі і небяспечнымі ўмовамі, на падземных работах (за выключэннем работ без выкарыстання фізічнай сілы і работ па санітарным ці бытавым абслугоўванні), а таксама на некаторых іншых работах. Напрыклад, выходзячы з меркаванняў аховы здароўя, жанчыны не могуць прымацца бетоншчыкамі, вадзіцелямі (на міжнародных пасажырскіх перавозках на аўтобусах больш чым з 14 месцамі, на аўтамабілях грузапад'ёмнасцю больш за 5 тон і самазвалах грузапад'ёмнасцю больш за 2,5 тоны), машыністамі, электрагазазваршчыкамі пры работах у закрытых ёмістасцях, цеслярамі і г.д. Да таго ж для жанчын вызначаны строгія абмежаванні па пад'ёме і перасоўванні цяжкасцяў уручную.

@ Ці не з'яўляюцца відавочнай дыскрымінацыяй аб'явы аб прыёме на працу кшталту «патрабуецца мужчына...»?

— Калі жанчына лічыць, што яе не прынялі на працу толькі па палавой прыкмеце, то яна мае поўнае права звярнуцца ў суд па месцы знаходжання юрыдычнай асобы з позвай аб факце дыскрымінацыі. Дарэчы, варта заўважыць: пры разглядзе індывідуальных працоўных спрэчак плаціць судовую пошліну не трэба.

@ Ці можна прыцягваць да сельгаспрацаў школьнікаў, якім яшчэ не споўнілася 16 гадоў?

— Сельгасарганізацыя можа прыцягваць да работ толькі школьнікаў ва ўзросце больш за 14 гадоў і толькі пры выкананні пэўных патрабаванняў заканадаўства. Так, па-першае, для работы школьніка ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў патрабуецца пісьмовая згода аднаго з бацькоў, усынаўляльніка ці папячыцеля. Па-другое, такія падлеткі могуць быць занятыя на лёгкіх работах, якія не з'яўляюцца шкоднымі для здароўя. Напрыклад, маюцца на ўвазе падрыхтоўка саджанцаў, догляд кветнікаў і маладых лясных культур без выкарыстання ядахімікатаў, нарыхтоўка лекавай сыравіны, праполка агародніны, уборка той жа агародніны, збор бульбы пасля механізаванага выкопвання і г.д.

Па-трэцяе, неабходна памятаць, што пры выкарыстанні працы няпоўнагадовых існуюць спецыяльныя патрабаванні да рэжыму працоўнага часу, тэхнікі бяспекі, умоў харчавання і адпачынку. У прыватнасці, падчас працы праз кожныя 45-50 хвілін тут павінны прадугледжвацца 10-15-хвілінныя перапынкі. І яшчэ. Тэрміны ўдзелу няпоўнагадовых у сельгасработах абмежаваныя: для 14-16-гадовых ліміт складае 6, а для 16-18-гадовых — 12 дзён на працягу вучэбнага года з абавязковым выхадным.

@ З якога ўзросту дазваляецца працаваць на трактары?

— Працаваць на трактары могуць толькі асобы, якім споўнілася 17 гадоў і якія маюць адпаведнае пасведчанне на права кіравання такімі машынамі. Да таго ж допуск да працы на трактары тут магчымы толькі пасля праходжання падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі, стажыроўкі і інструктажу, павышэння кваліфікацыі і праверкі ведаў па ахове працы.

@ Наколькі законнае патрабаванне наймальніка прайсці медагляд да работніка ва ўзросце да 18 гадоў?

— Такое патрабаванне — абавязак кожнага наймальніка. Няпоўнагадовыя работнікі павінны накіроўвацца на медагляд штогод. Пры гэтым такія медагляды праводзяцца ў працоўны час з захаваннем сярэдняй зарплаты.

@ Калі работнік ва ўзросце да 18 гадоў можа скарыстацца правам на першы водпуск?

— У адрозненне ад іншых катэгорый, работнік ва ўзросце да 18 гадоў па ўласным жаданні можа скарыстацца правам на водпуск яшчэ да заканчэння 6-месячнага тэрміну працы — адно, што тут варта не забывацца на існаванне графіку водпускаў.

Дарэчы, у такім выпадку нялішне звярнуць увагу на дзве акалічнасці. Па-першае, работнікам ва ўзросце да 18 гадоў нельга пераносіць водпуск на наступны год. І па-другое, работнікаў ва ўзросце да 18 гадоў забараняецца адклікаць з водпуску.

@ Колькі школьнікаў змогуць папрацаваць падчас летніх канікулаў?

— Чакаецца, што сёлета падчас летніх канікулаў зможа прапрацаваць не менш чым 25,6 тыс. школьнікаў і навучэнцаў. Прычым пры пошуках часовай працы можна звярнуцца да сацыяльных педагогаў сваіх навучальных устаноў, або як варыянт — у службу занятасці насельніцтва па месцы жыхарства.

@ Што неабходна мець на ўвазе школьнікам, якія збіраюцца працаваць на канікулах?

— Тут трэба звярнуць увагу адразу на некалькі момантаў. Для няпоўнагадовых існуюць строгія ліміты на ручны пад'ём і перасоўванне цяжкасцяў. Няпоўнагадовым нельга працаваць звышурочна, па выхадных, у дзяржаўныя святы і ў начную змену. Заканадаўства вызначае, што працягласць працы падчас канікулаў для асоб ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў не можа перавышаць 4 гадзін 36 мінут, а для асоб ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў — 7 гадзін у дзень. Пры гэтым зарплата тут павінна налічвацца і выплачвацца ў такім жа памеры, як і работнікам адпаведных катэгорый пры поўнай працягласці штодзённай працы.

І яшчэ. Неабходна падкрэсліць, што ў любым выпадку з няпоўнагадовымі падпісваецца працоўны дагавор. Адзін з яго экзэмпляраў застаецца ў наймальніка, а другі — перадаецца работніку. Прычым падпісанне працоўнага дагавора — лепшы сродак застрахавацца ад якіх-небудзь непаразуменняў, і ў тым ліку пры выплаце зарплаты.

@ Наколькі верагоднае павелічэнне ў Беларусі дародавага водпуску?

— Цяпер гэта пытанне не разглядаецца. Бо ў параўнанні з іншымі краінамі такі водпуск у нас — максімальны. Да таго ж спрагназаваць, наколькі змяненне працягласці гэтага водпуску паўплывае на змяншэнне колькасці заўчасных родаў, вельмі складана.

@ Ці можа ў нашай краіне па прыкладзе Еўропы быць уведзена норма аб абавязковым падзеле водпуску па доглядзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў паміж жонкай і мужам?

— Абавязковага падзелу водпускаў па доглядзе дзяцей не плануецца. Разам з тым, падзяліць такі водпуск можна добраахвотна. Да слова, статыстыка сведчыць, што доля бацькоў, якія аформілі водпуск па доглядзе дзяцей на сябе, у Беларусі складае 1 працэнт.

@ Як плануецца павышаць дзіцячыя дапамогі ў Беларусі?

— Пакуль дапамогі ў сувязі з нараджэннем і доглядам дзяцей пераразлічваюцца ў сувязі са змяненнем бюджэту пражыткавага мінімуму. Так, за сёлетнія студзень—май адносна аналагічнага перыяду летась памер дапамог на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў павялічыўся на 23,1 працэнта — у маі ён складае 343.260 рублёў.

Што ж да перспектывы, то дапамогі на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў плануецца дыферынцыраваць у залежнасці ад чарговасці нараджэння дзяцей і вылічваць, зыходзячы з сярэдняй зарплаты па краіне. А дапамогі пры нараджэнні ёсць намер павялічыць удвая: да 10 бюджэтаў пражыткавага мінімуму пры нараджэнні першага і да 14 БПМ — пры нараджэнні другога і наступных дзяцей. У прыватнасці, такія нормы закладзены ў праекце новай Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі на 2011-1015 гады, якая цяпер знаходзіцца на разглядзе.

Крымінал, здарэнні

УЦЯКАЎ АД МІЛІЦЫІ, УЦЯКАЎ АД ВЫРАТАВАЛЬНІКАЎ

Увечары на нумар 101 паступіла паведамленне, што ў кватэры жылога дома па вуліцы Я. Маўра, 9 у Мінску адчуваецца пах гару. Падраздзяленні МНС высветлілі, што гэта загарэлася ежа. Пажар хутка ліквідавалі, ніхто не пацярпеў. А затым...

Як паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, менавіта ў гэты ж час паступіў званок ад дзяжурнага па ГУУС пра тое, што па праспекце Пушкіна, 41 малады чалавек, уцякаючы ад супрацоўнікаў міліцыі, залез на казырок 12 паверха. Неабходна дапамога: чалавека трэба зняць адтуль. Падраздзяленні МНС выехалі на названы адрас, дзе пры дапамозе аўталесак паспрабавалі папярэдзіць падзенне хлопца і зняць яго з вышыні... Уцякаючы ад выратавальнікаў па лесках, той нават не заўважыў, як трапіў у рукі работнікаў МНС і МУС, якія чакалі яго з боку балкона. «Каскадзёр» затрыманы, прычыны яго паводзін высвятляюцца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАНАЧАВАЛА НА ДАЧЫ...

Пажарныя прыехалі па выкліку ў дачны кааператыў каля вёскі Марозавічы Брэсцкага раёна. Калі ўтаймавалі агонь, што ахапіў адзін з дачных домікаў, знайшлі там цела жанчыны. Аказалася, што гэта 36-гадовая грамадзянская жонка сына гаспадара дачы. Па якой прычыне адбыўся пажар, чаму загінула жанчына, высвятляе зараз следства.

З ДЫПЛОМАМ, СЦІЗОРЫКАМ І КАРАНАМ

спрабаваў нелегальна перайсці мяжу грамадзянін Расіі. 34-гадовага чачэнца затрымалі брэсцкія памежнікі. У яго было зусім мала рэчаў: дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі, компас, карта, сцізорык, мабільны тэлефон і галоўная кніга мусульманіна. З гэтым багажом ён меў намер трапіць у Польшчу, а там падацца ў Германію. Але пакуль што парушальніку свецяць толькі дэпартацыя на радзіму.

Яна СВЕТАВА.

ІНШАЗЕМЦА АШТРАФАВАЛІ ЗА АЛКАГОЛЬ

Грамадзянін Літвы нелегальна вёз транзітам на аўто «Фальксваген» ажно 888 бутэлек алкаголю на суму звыш 6,8 мільёна рублёў. Спынілі аўто для дагляду супрацоўнікі ДАІ недалёка ад Віцебска на трасе Віцебск — Полацк. Паколькі суправаджальных дакументаў на транзітны груз «з градусам» не было, выпіўку часова канфіскавалі, пакуль кропку ў інцыдэнце паставяць у судзе. І вось пастановай суда Чыгуначнага раёна горада Віцебска грамадзяніна Літвы аштрафавалі на 15 базавых велічынь (525 тысяч рублёў), а спіртное канчаткова канфіскавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЧАЛАВЕЧЫ ЧЭРАП ПЛАВАЎ У ШЧАРЫ

Падчас купання ў рацэ Шчара каля вёскі Міцькавічы Слонімскага раёна мясцовым жыхаром быў знойдзены чалавечы чэрап. Мяркуецца, што гэта чэрап чалавека, які загінуў у гады Другой сусветнай вайны.

Сяргей ЧЫГРЫН.

«ХОЛАДНА» СТАЛА

На прапускным пункце «Мохра» пінскія памежнікі ў адной аўтамашыне, якая рухалася з Украіны, выявілі трыкатажныя вырабы, якія падлягалі дэклараванню.

Нашы грамадзяне афармляць вырабы адмовіліся, і аўтамашына ад'ехала на ўкраінскі бок. А неўзабаве да памежнікаў падышла дзяўчына. Пасажырка з ад'ехаўшай аўтамашыны стала неабдымнай. 25-гадовая жыхарка Іванава, нягледзячы на спякоту, нацягнула на сябе 80 блузак, жаночых і мужчынскіх куртак, кашуль, маек... Памежнікі пасажырку распранулі і тавар коштам 4,3 млн рублёў канфіскавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

А ЦІ ПАТРЭБНА ТАЯ СТРЭЛЬБА?

Якія забавы ў сучасных беспрацоўных? Напрыклад, паляванне і рыбалка. Вось і 25-гадовы брастаўчанін, які нідзе не працуе, набыў новую паляўнічую стрэльбу, зарэгістраваў яе і накіраваўся ў лясны масіў каля вёскі Дубок прыстраляць зброю. А на наступны дзень яго знайшлі ў сем гадзін раніцы з цяжкім агнястрэльным раненнем нагі.

Як расказаў пацярпелы супрацоўнікам міліцыі, ён заблудзіўся ў лесе і, шукаючы дарогу, зачапіўся за корч і ўпаў. Пры падзенні выпадкова націснуў на курок, прагучаў стрэл. Як вынік, давядзецца доўга лячыцца.

Яна СВЕТАВА.

Лепшы плітачнік краіны

Пераможца конкурсу Аляксандр БАЛБУКОЎ.

Замежныя кампаніі не страчваюць цікавасць да Беларусі як да краіны, у якую выгадна ўкладваць інвестыцыі. Сярод іх нямецкі канцэрн «Хенкель». Адно з яго падраздзяленняў, кампанія «Хенкель Баўтэхнік», якая даволі паспяхова працуе ў нашай краіне, для замацавання сваіх пазіцый спансіравала правядзенне рэспубліканскага конкурсу плітачнікаў.

Днямі яго фінал адбыўся ў Мінску, у гандлёвым цэнтры «Сталіца». Пераможцам стаў Аляксандр Балбукоў з Гомельскай вобласці. Яму дастаўся Гран-пры — 5 000 000 рублёў. Перамога была дасягнутая ў жорсткай барацьбе з лепшымі прафесіяналамі з іншых рэгіёнаў краіны, якія прайшлі скрозь сіта абласных адборачных тураў.

Прызы, якія былі прадстаўлены нямецкай кампаніяй «Хенкель Баўтэхнік», атрымалі і іншыя ўдзельнікі фіналу.

Леанід ТУГАРЫН.

ФОРМУЛА ЗДАРОВАГА СЭРЦА

У 70-я гады ўзровень смяротнасці ў фінаў, амерыканцаў і савецкіх грамадзян быў прыкладна аднолькавым. Аднак з таго часу фіны і амерыканцы актыўна паўплывалі на такія негатыўныя фактары, як злоўжыванне алкаголем і курэнне, і такім чынам павялічылі сабе працягласць жыцця. На постсавецкай прасторы, у тым ліку ў Беларусі, падобных вынікаў дасягнуць пакуль не ўдаецца.

Калі да 35 гадоў вы ніколі не рабілі кардыяграму — значыць, пасля гэтага часу, як бы вы сябе ні адчувалі, прайдзіце такое даследаванне. І прайдзіце тэрмінова, калі вы знаёмы з загрудзінным болем — гэта боль у той частцы, якая будзе знаходзіцца пад далонню, калі пакласці яе паміж грудзямі. Прайсці ўльтрагукавое даследаванне, зрабіць кардыяграму і здаць аналізы крыві раз у год — гэта, што называецца, святое для кожнага дарослага чалавека, які клапоціцца аб сваім здароўі. Аднак гэта не адзінае, што «павінен» кожны з нас свайму арганізму. І для прафілактыкі артэрыяльнай гіпертэнзіі, і, тым больш, калі ў нас яе ўжо выявілі, неабходна мець на ўвазе, што прыём лекавых прэпаратаў — гэта другасная прафілактыка такіх магчымых ускладненняў, як інфаркт міякарда або інсульт. Так, прэпараты выконваюць вельмі важную функцыю — прыводзяць лічбы артэрыяльнага ціску да аптымальных, і гэта вельмі важна, паколькі без прэпаратаў пры артэрыяльнай гіпертаніі адназначна будуць пакутаваць органы-мішэні — у першую чаргу сэрца, мозг, ныркі, вочы. Атэрасклероз на фоне гіпертэнзіі ахоплівае ўвесь арганізм, усе яго сасуды. У той ці іншай ступені ад яго пакутуюць і сэрца, і галава, і ногі.

Першасная прафілактыка — гэта наш лад жыцця. І адладзіць яго павінна дапамагчы наступная формула здаровага сэрца: 0-3-5-140-5-3-0. Першы «нуль» азначае тое, што чалавек не курыць і не з'яўляецца нават пасіўным курцом. «Тры» — гэта мінімальная колькасць кіламетраў, якую неабходна праходзіць штодня. «Пяць» — столькі порцый свежай гародніны і фруктаў неабходна ўжываць штодня. «140» — верхні ціск не павінен быць вышэй за гэту лічбу. Другая лічба «пяць» — аптымальны паказчык узроўню халестэрыну. Другая лічба «тры» — паказчык узроўню халестэрыну нізкай шчыльнасці. Другі «нуль» — адсутнасць цукровага дыябету і атлусцення. Дарэчы,

паколькі цукровы дыябет небяспечны пашкоджаннем сасудаў і нервовых канчаткаў, то інфаркт можа здарыцца і без асаблівых болевых адчуванняў.

Калі ў вас халестэрын вышэй за 5,2 ммоль/л — значыць, трэба працягнуць абследаванне. Спісаць высокі халестэрын на той факт, што напярэдадні вы з'елі лусту сметанковага масла, не выпадае. Аналіз крыві здаецца нашча, а значыць, халестэрын павінен быў прыйсці ў норму. Высокі ж паказчык можа сведчыць або аб атэрасклератычным паражэнні сасудаў, або аб парушэнні функцыі печані. Так, падчас прыёму шэрагу лекавых прэпаратаў халестэрын можа павышацца, паколькі лекі ўздзейнічаюць на печань, і тая, вобразна кажучы, «перагружаецца», пачынае горш працаваць. Мы не можам паўплываць на спадчыннасць, але на лад жыцця дакладна можам.

А на вашы пытанні адказалі <u>загадчыца інфарктнага аддзялення №2 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, урач-кардыёлаг вышэйшай катэгорыі Наталля ПАЛЯЎКОВА *(злева)*</u> і <u>ўрач-кардыёлаг таго ж аддзялення Ірына ГРЫШЫНА</u>.

☎ — Буда-Кашалёўскі раён, Лілія Дзмітрыеўна, 59 гадоў. Дыягназ — ішэмічная хвароба сэрца, стэнакардыя, функцыянальны клас II. Замест аспірыну мне рэкамендавалі піць палакард. Ці трэба яго піць пастаянна або можна рабіць нейкія перапынкі?

— Пры ішэмічнай хваробе сэрца абавязкова прызначаюцца дэзагрэганты, да якіх адносіцца аспірын. Прымаць яго трэба абавязкова, паколькі ён спрыяе прафілактыцы інфаркту міякарда. Аспірын растворацца ў страўніку, а палакард — гэта таксама аспірын, але растворацца і ўсмоктваецца ён у кішэчніку. Такім чынам, палакард не павінен аказваць пашкоджвальнага ўздзеяння на страўнік, а значыць, можа прымяняцца пры язве і эрозіях гэтага органа. Пры язве дванаццаціперснай кішкі прэпараты аспірыну трэба прызначаць пад прыкрыццём іншых прэпаратаў з абарончым эфектам, а ў перыяд выражанага абвастрэння хваробы наогул не піць. Наогул піць аспірын або палакард трэба пастаянна, пажадана ў вячэрні час, дзесьці ў 18.00, пасля ежы.

☎— Любанскі раён, Ганна Васільеўна. У сына 1,5 года таму быў інсульт, ён інвалід 3 групы. Цяпер у яго баліць галава, кажа, што адчувае, як там нешта «бегае». З-за гэтых адчуванняў ён увесь час ходзіць па горадзе. Што б вы яму параілі?

— Інсульт не ўзнікае проста так. Яго прычынай часцей за ўсё з'яўляецца павышаны ціск, мярцальная арытмія. Якія прэпараты прымае сын пасля інсульту?

— Нормадзіпін, трытацэ, бісапралол, кавінтон, кардыямагніл.

— Усе прэпараты добрыя, яны праводзяць карэкцыю і мазгавога кровазвароту, і высокага ціску. А як даўно ён быў у неўролага?

— Ён у Дзяржынску жыве, таму дакладна не скажу. Ведаю, што яму толькі таблеткі даюць і больш нічога не робяць...

— Таблеткі пасля інсульту — асноўнае, што павінна быць. Гэта прафілактуе паўторны інсульт. Мне цяжка па тэлефоне сказаць дакладна, што менавіта трэба дадаць і якім чынам скарэктаваць прапанаваную тэрапію. Неабходна, каб ваш сын зноў пад'ехаў да неўролага і расказаў пра свае скаргі. Аднак вы павінны яму патлумачыць, што адной лекавай тэрапіі тут будзе недастаткова. Неабходна таксама менш ужываць солі, менш гатовых прадуктаў, у якіх яе з лішкам, пабольш запечанай рыбы, можна варанае мяса. І, безумоўна, трэба сачыць за ціскам. Верхні паказчык не павінен узнімацца вышэй за 140, 150.

— Ціск у яго звычайна 160/100, але бывае і вышэй.

— Трэба ўсё ж такі пад кантролем урача імкнуцца да зніжэння.

— А можна яму абследавацца дзе-небудзь?

— Можна, безумоўна. І ў самім Дзяржынску, а калі ёсць жаданне, няхай пад'язджае ў Мінск. Запісацца на платную кансультацыю неўролага ў нашай 10-й гарадской бальніцы можна па нумары: 340 85 08. Спецыяліст, магчыма, парэкамендуе і фізіялячэнне для паляпшэння стану. Гэта можа быць іголкараэфлексатэрапія, гірудатэрапія — лячэнне п'яўкамі.

— Калі ціск павышаецца, ён ходзіць да звычайнага тэрапеўта.

— Тэрапеўт таксама павінен арыентавацца ў сітуацыі, паколькі адказвае за пацыента. Аднак хоць бы раз сына павінны былі накіраваць да неўролага. Калі гэтага не было — значыць, варта папрасіцца самому. Ціск трэба абавязкова сур'ёзна кантраляваць. Трамбоз сасудаў мозга развіваецца ў першую чаргу на фоне высокага ціску. Так што прызначаныя прэпараты трэба піць абавязкова, аднак, калі ёсць скаргі, трэба разбірацца з удакладненнем лячэння.

☎— Салігорскі раён, Тацяна Пятроўна, 56 гадоў. У мяне быў мітральна-артальны парок. У 2009 годзе паставілі механічны пратэз мітральнага і артальнага клапанаў. Яшчэ ў мяне постінфарктны кардыясклероз. Бывае, адчуваю моцны жар, пакутую ад мярцальнай арытміі. Пачалі балець суставы, моцна баліць левая нага...

— Якія прэпараты вы зараз прымаеце?

— Карведылол, верашпірон, фурасемід, варфарын — па паказаннях МНО і лізінапрыл.

— Паказчык МНО ў вас павінен быць каля 3 — дзесьці 3,25, паколькі ў вас механічны клапан і патрэбны пажыццёвы прыём варфарыну. А дыгаксін вы прымаеце?

— Не.

— Думаю, варта паказацца доктару, бо, калі з'явілася задышка, ёсць мярцальная арытмія, зменшылася пераносімасць фізічнай нагрузкі, паказана прызначэнне дыгаксіну. Вы даўно былі ў кардыёлага?

— Учора.

— І вам нічога не дадалі?

— Не. Сказалі толькі, што з суставамі трэба ісці да тэрапеўта. Рэўматолага ў нашай паліклініцы няма.

— Што да суставаў... Якая ў вас вага?

— Дзесьці 75 кг, рост 160 см.

— Вы, напэўна, малавата рухаецеся...

— Быццам бы нармальна хаджу.

— І вельмі моцнай задышкі няма?

— Моцнай няма, аднак бывае сэрцабіццё, моцна пацею, слабасць з'яўляецца, і я ажно чую, як клапан працуе.

— Вядома ж, бо ён механічны. Я раю вам усё ж такі яшчэ раз падысці да кардыёлага і абмеркаваць прыём дыгаксіну. А што да суставаў, то трэба было б высветліць, ці няма запаленчага працэсу. Варта здаць кроў.

— Я здавала на рэўмапробу, запалення няма.

— Мабыць, пакуль і не варта прымаць ніякія прэпараты для суставаў, а пакарыстацца толькі мазямі. Ёсць яшчэ такая трава — снітка, якую па лістку можна дадаваць у салату. Снітка крыху «ачышчае», калі так можна сказаць, суставы, яна ўтрымлівае шмат карысных рэчываў.

— Бывае, яшчэ галава кружыцца...

— Прызначаныя вам прэпараты зніжаюць ціск, так што можа быць і галавакружэнне... Важна і які ў вас халестэрын.

— У норме: 4,9.

— Атэрасклероз не бывае ізалявана толькі ў сэрцы. Паражаюцца сасуды ўсяго арганізма, у тым ліку галаўнога мозга. Таму пры такім захворванні прызначаюцца прэпараты, якія зніжаюць халестэрын. Ён у нашым выпадку павінен быць не вышэй за 4,2 ммоль/л. А наконт харчавання я, спадзяюся, вы ўсё ведаеце...

— Ведаю. А скажыце яшчэ, калі ласка, ці можна мне прымаць гамеапатычныя прэпараты для суставаў?

— Трэба пракансультавацца з урачом па складзе гамеапатычнага прэпарата, паколькі неабходна будзе адрэгуляваць дозу варфарыну. У раслінах досыць многа вітаміну К, а варфарын ім інактывуецца.

☎— Гомельская вобласць, Алеся Мікалаеўна. Бацьку — 55 гадоў. Дыягназ ад 12 красавіка такі: ішэмія, буйнаачаговы інфаркт міякарда ў галіне пярэдняй сценкі перагародкі, клас цяжкасці III, атэрасклератычны кардыясклероз з парушэннем праводнасці, недастатковасць аартальнага клапана III ступені, мітральнага клапана III ступені, H1, артэрыяльная гіпертэнзія III, рызыка 4, сутаргавы сіндром, трахеябранхіт. Зараз наведвае раённага кардыёлага кожныя 10 дзён. Прымае: нітрагліцэрын — 1 таблетка пры болі ў сэрцы, манакапс — 50 мг раніцай, лізінапрыл — 10 мг двойчы ў дзень, метапралол — 25 мг двойчы ў дзень, амлакардын — 10 мг у 22.00, каптапрыл — 25 мг пры ціску вышэй за 140/80, карбамазепін — 0,2 мг двойчы ў дзень. Калі кашляе, яму моцна аддае ў спіну... Ці можна яму дадаткова абследавацца ў вашай бальніцы?

— У 10-й клініцы ёсць рэгістратура платных паслуг, куды можа звярнуцца любы жыхар краіны, каб атрымаць кансультацыю любога спецыяліста, у тым ліку кардыёлага. Калі ласка, званіце па нумарах: 340 85 08 або 345 32 71. Па тых звестках, што вы прадставілі, можна сказаць, што лячэнне распісана цалкам адэкватнае. Калі далей не будзе ніякіх проціпаказанняў, то іх можна і трэба піць пажыццёва. Неабходна таксама працягваць назіранне ва ўрача. Чым далей ад інфаркту, тым, зразумела, гэтыя сустрэчы будуць радзей, не раз у 10 дзён. Аднак, нягледзячы на самаадчуванне, трэба рэгулярна, па рэкамендацыі спецыяліста, з'яўляцца на прыём да кардыёлага.

Святлана БАРЫСЕНКА,
Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, пр-т Черняховского, 9, тел. (0212) 47 97 35.

Продавец: Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», тел. (0212) 36 37 25

№ лота	Предмет аукциона, срок договора аренды, наименование, местонахождение недвижимого имущества	Целевое использование	Начальная цена (бел. руб.)	Размер задатка (бел. руб.)
1	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 6,5 кв.м, 5,1 кв.м, расположенных на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	101 500	10 150
2	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 6,3 кв.м, расположенного на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26).	для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств)	55 130	5 513
3	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 15,8 кв.м, 14,2 кв.м, 48,5 кв.м, расположенных на 1 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-52235 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – столярная мастерская) по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 84А	для размещения склада, оказания бытовых услуг, производственных целей (за исключением вредных производств)	686 880	68 680
4	Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 38,1 кв.м, расположенного на 1 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-52235 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – столярная мастерская) по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 84А	для размещения склада, оказания бытовых услуг, производственных целей (за исключением вредных производств)	333 380	33 330

Дата, время и место проведения аукциона: 20.06.2011 в 16.00, г. Витебск, пр-т Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов: 17.06.2011 г. до 17.30.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проспект Черняховского, 9 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

1. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели.

2. Для участия в аукционе в адрес организатора аукциона необходимо представить:

2.1. заявление на участие в аукционе, подписать соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведении аукциона;

2.2. копию платежного документа о внесении задатка, заверенную банком;

2.3. юридическому лицу – резиденту Республики Беларусь: копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица; копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

2.4. юридическому лицу – нерезиденту Республики Беларусь: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; копию платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

2.5. индивидуальному предпринимателю: копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

2.6. при заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются: представителем индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; индивидуальным предпринимателем – документ, удостоверяющий личность.

3. Победителем аукциона будет признано лицо, предложившее наиболее высокую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Лицам, не выигравшим торги, задаток возвращается.

4. Продавец по результатам проведения аукциона заключает с победителем аукциона (лицом, приравненным к Победителю аукциона) договор аренды недвижимого имущества в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона. Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.

5. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона в порядке и размере, указанном в протоколе аукциона.

6. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона № 3012218220012 в Головном филиале по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, МФО 701, УНП 390477566 (в бел. руб.), № 3012000009469 (в дол. США) в ф-ле № 201 ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Витебск, ул. Гоголя, 8, МФО 150801259, УНП 390477566. При перечислении денежных средств в иностранной валюте расходы по продаже валюты (перевод в белорусские рубли) возмещаются Победителем.

Ранее опубликованные извещения о проведении аукциона напечатаны в газетах «Звязда» от 26.03.2011, 30.10.2010 г.

Контактный тел: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

Вячаслаў КЕБІЧ: «Я І СЁННЯ ЎПЭЎНЕНЫ Ў ПРАВІЛЬНАСЦІ ПЕРАХОДУ ДА ПРЭЗІДЭНЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ»

10 чэрвеня спаўняецца 75 гадоў з дня нараджэння В.Ф. Кебіча, слыннага палітычнага і дзяржаўнага дзеяча, якому лёсам было наканавана кіраваць беларускім урадам на зломе эпох, стаць удзельнікам і сведкам падзей планетарнага маштабу. Напярэдадні юбілею з ім сустрэўся карэспандэнт «Звязды» і папрасіў расказаць аб сабе і тым часе, а таксама пракаментаваць асобныя факты свайго жыццёвага шляху. Нагадаем, амаль пяць гадоў Вячаслаў Францавіч узначальваў урад у самы, бадай, адказны і складаны перыяд пасляваеннай гісторыі Беларусі.

— Вячаслаў Францавіч, аднойчы вы публічна параўналі палітыку з наркотыкам: маўляў, калі ўцягнуўся, то потым няма паратунку ад палітыкі, ёю толькі і жывеш. А цяпер, з цягам часу вы пазбавіліся палітычнай залежнасці?

— Не. Спрабаваў — не атрымалася. Па-ранейшаму «хварэю» гэтым. Вось бачыце, на маім рабочым стале стос вядучых беларускіх выданняў. Я штодзень спажываю шмат свежай палітычнай і эканамічнай інфармацыі, аналізую і асэнсоўваю яе. Нярэдка думаю, а якое б я прыняў рашэнне ў той ці іншай сітуацыі. Так што я з палітыкі не пайшоў.

— Прабачце, Вячаслаў Францавіч, а навошта вам гэта трэба?

— Цікава, вельмі цікава назіраць за падзеямі ў нашай краіне і за яе межамі, канфліктамі ў «гарачых» кропках планеты, інтрыгамі вялікіх дзяржаў па прасоўванні сваіх нацыянальных інтарэсаў. Напрыклад, я ўважліва сачыў за палітыкай і непарыўна звязанай з ёю эканомікай у час драматычнага развіцця сусветнага фінансавага крызісу і г. д. І што самае дзіўнае, гэта атрымоўваецца незалежна ад маёй волі і жадання. Калі я сёння застаўся без інфармацыйнай падпіткі, то становіцца нейк неспакойна на душы, здаецца, што я нешта недарабіў, прапусціў штосьці важнае. Адчуванне, што я дарэмна пражыў гэты дзень. Таму ёсць унутраная патрэба не адставаць ад жыцця. І таму я чытаю перыёдыку, гляджу тэленавіны і... супераджываю. Кажу шчыра.

— У палітыку сёння прыходзяць маладыя амбіцыйныя людзі, якія мараць зрабіць гучную і яркую палітычную кар'еру, пакінуць сваё імя ў гісторыі, праславіцца на службе ў народа. Што б вы ім параілі?

— Першае, моцна падумаць, які з цябе атрымаецца палітык. Можа лепш паспрабаваць у іншай сферы дзейнасці, каб не было шкада змарнаваных лепшых гадоў жыцця. Бо не такі салодкі хлеб палітыка, і не заўсёды людзі аб'ектыўна, справядліва і з удзячнасцю ацэньваюць зробленае для іх тым ці іншым палітыкам. І яшчэ хачу нагадаць, што кожны, хто ідзе ў палітыку ці ўжо зараз непасрэдна альбо ўскосна знаходзіцца ў ёй, павінен памятаць, што рана ці позна прыйдзецца завяршыць актыўную палітычную дзейнасць. Потым жыць як звычайны чалавек побач з тымі, якіх ты агітаваў галасаваць за сябе, нешта абяцаў ім, ды не выканаў.

— Але вы, наколькі я разумею, сябе загадзя не рыхтавалі да вялікай палітыкі, ролі дзяржаўнага дзеяча. Мяркую па вашай біяграфіі. Але ў вас была адна перавага перад аднагодкамі, якая давала вам неблагія шанцы для кар'еры, — залаты медаль выпускніка сярэдняй школы. Ці не прага ведаў прывяла вас у палітыку?

— Хутчэй, мая адданасць вытворчасці. Пачатак дарослага жыцця не абяцаў усыпанай ружамі шырокай дарогі ў светлую будучыню хлопцу са звычайнай сялянскай сям'і з Валожынскага раёна. Ды і потым на маім жыццёвым шляху было больш шыпоў, чым кветак, нечаканых паваротаў лёсу. Я ніколі не імкнуўся ва ўладу. Пасля заканчэння Беларускага політэхнічнага інстытута прыйшоў на мінскі завод радавым інжынерам-тэхнолагам. Для мяне гэта было здзяйсненнем усіх мар. Я вельмі рана, зноў жа на мой погляд, прыкіпеў да атмасферы вялікага станкабудаўнічага прадпрыемства, у заводскім калектыве адчуваў сябе як рыба ў вадзе. Відаць, быў на сваім месцы і ўсё ў мяне атрымоўвалася. І менавіта заводская прахадная, як спяваецца ў папулярнай савецкай песні, у людзі вывела мяне.

І яна ж «завяла» мяне і ў кабінет другога сакратара Мінскага гаркама. Прапанова заняць гэтую пасаду паступіла ад Машэрава — першага сакратара ЦК КПБ. Ён вырашыў прызначыць на высокую партыйную пасаду не камсамольскага функцыянера, а вылучыць кіраўніка паспяховага прадпрыемства. Выбар Пятра Міронавіча выпаў на мяне — генеральнага дырэктара вытворчага аб'яднання імя Кірава. Вось так з яго лёгкай рукі я трапіў у палітыку. Я развітаўся з калектывам літаральна са слязамі на вачах. Часта потым успамінаў завод.

Не скажу, што партыйная работа была мне па душы. На пасадзе загадчыка цяжкай прамысловасці ЦК КПБ зусім «заела» папяровая дзейнасць: даводзілася з дня ў дзень пісаць і пісаць праекты пастаноў, рашэнняў Бюро ЦК, устаўкі ў даклады, выступленні і г. д. І я папрасіўся ў Мікалая Мікітавіча Слюнькова, тагачаснага першага сакратара ЦК КПБ, перавесці мяне на іншую работу, пажадана звязаную з прамысловай вытворчасцю. І мяне перавялі... другім сакратаром Мінскага абкама КПБ. І зноў я курыраваў падрыхтоўку дакладаў на ўсе адказныя мерапрыемствы. Прызнаюся, няўдзячная справа. Адзін прыклад. Прыношу першаму сакратару канчатковы даклад на заўтрашні пленум абкама. Той быў не ў гуморы і выгаворвае мне: «Што ты падсунуў? Як можна з гэтым ісці на пленум? Перарабіць!». Часу няма, і тады я на свой страх і рызыку пераставіў асобныя кавалкі дакладу, зрабіў стылістычныя папраўкі і прыношу зноў той жа самы, па сутнасці, даклад. «Першы» кажа: «Вось гэта зусім іншы дакумент, малайчына».

— Аднак вы ў абкаме доўга не затрымаліся. Зноў папрасіліся на іншую работу?

— Не зусім так. Праз восем месяцаў мне прапанавалі месца старшыні Дзяржплана БССР. Пасада, на першы погляд, быццам бы чыста гаспадарчая, але, я мушу сказаць, з вялікім палітычным падтэкстам. Дзяржплан у пэўным сэнсе быў «малым» Саўмінам, і за пяць гадоў працы яго кіраўніком я навучыўся там вельмі многаму. У прыватнасці, бачыць за нярэдка схаванымі за ветлівымі словамі і прыязнымі пратакольнымі ўсмешкамі сапраўдныя, часам варожыя адносіны высокага начальства. У Дзяржплане я таксама навучыўся апаратнай дыпламатыі, а прасцей кажучы — лавіраваць паміж партыйнымі і дзяржаўнымі структурамі, уменню ладзіць і са сваім беларускім кіраўніцтвам, і маскоўскімі чыноўнікамі, прадбачыць узнікненне верагодных праблем і непрыемнасцяў і па магчымасці іх пазбягаць ці мінімізаваць. І самае галоўнае — дасягаць пры гэтым пастаўленых мэт. Відаць, школа кіраўніцтва Дзяржпланам моцна дапамагла, бо мяне рэкамендавалі на пасаду старшыні Саўміна БССР. Выбралі мяне на альтэрнатыўнай аснове падчас закрытага тайнага галасавання на пленуме ЦК КПБ. Сітуацыя тады ў савецкай краіне імкліва мянялася, і праз два месяцы зноў адбылося перавыбранне на пасаду старшыні Саўміна БССР — ужо на сесіі Вярхоўнага Савета. Той дзень запомніўся і тым, што за мяне прагаласавалі і прадстаўнікі БНФ. Толькі было 8 галасоў супраць з больш чым 320-ці дэпутатаў.

Праўда, потым амаль кожная сесія Вярхоўнага Савета пачыналася з прапановы Беларускага народнага фронту: « Кебіча ў адстаўку!». Пытанне абавязкова ставілася на галасаванне. Кожны раз 32 бэнээфаўскія галасы супраць мяне. Прычыны для зняцця прыдумваліся самыя розныя, і ў большасці сваёй яны не мелі прамога дачынення да дзейнасці Саўміна. Я часам здзіўляўся нейкай езуіцкай вынаходлівасці бэнээфаўцаў выдумляць абвінавачванні ў адрас урада, які перашкаджаў ім захапіць выканаўчую ўладу. Ды Бог ім суддзя.

— Вас многія памятаюць не толькі як старшыню Саўміна і палітыка, але і як аўтара трапных характарыстык і выразаў. Мне, напрыклад, запомніліся фраза: «Кебіч сваіх не здае». Чытачам нагадаю, што ў свой час супраць вашага намесніка М. М. Косцікава была разгорнута атака нядобразычліўцаў і палітычных канкурэнтаў з мэтай адправіць яго ў адстаўку. Хоць вам у той няпросты момант, як мне здаецца, было б выгадна менавіта «здаць» Косцікава, зрабіць яго «стрэлачнікам» і, як гаворыцца, павесіць на яго ўсіх сабак, а самому заняць зручную пазіцыю справядлівага начальніка. Аднак вы не пайшлі па такім шляху. Чаму?

— Я добра памятаю тую гучную гісторыю. Насамрэч удар БНФ і спачуваючымі ім быў накіраваны супраць мяне. Каб аслабіць пазіцыі ўрада, абвінавацілі яго кіраўніцтва (у прыватнасці, М. М. Косцікава) у розных грахах. Разлік быў такі: калі атрымаецца зняць віцэ-прэм'ера, то затым можна будзе паспрабаваць «скінуць» самога Кебіча. Такую задачу-максімум ставіў перад сабой БНФ. Пад выглядам клопатаў аб народзе і чысціні радоў членаў урада прадстаўнікі фронту ў парламенце час ад часу рабілі на мяне відавочныя ці замаскіраваныя наезд за наездам. Вось і Косцікава выбралі ў якасці адной з прамежкавых ахвяр. Прызнаць іх надуманыя абвінавачванні і зняць з пасады Мікалая Мікалаевіча было б несумленна перад сабой і народам. Так, гэты крок дазволіў бы мне пазбегнуць адказнасці за пэўныя праблемы, але гэта было б вельмі несалідна. Ды і як потым чалавеку глядзець у вочы? І я тады публічна заявіў: «Кебіч сваіх не здае». Не ў тым сэнсе, што я кагосьці абараняю ад пакарання, заплюшчваю вочы на правалы ў рабоце, маральныя хібы. Увогуле здаваць ці падстаўляць — гэта подлы метад, брудныя тэхналогіі, якія я ніколі яго не выкарыстоўваў у палітычнай дзейнасці. Хоць мяне час ад часу падштурхоўвалі да гэтага.

— Тут, каб устаяць, моцны характар трэба мець. Дзе ж вы, Вячаслаў Францавіч, так загартаваліся?

— Як і большасць хлопцаў майго пакалення, у арміі і ў заводскім калектыве. А яшчэ для мяне важнай школай жыцця стала служба ў адным з падраздзяленняў ГРУ — слыннага Галоўнага разведвальнага ўпраўлення Савецкай Арміі. Хоць гэта быў і пасляваенны час, але мне за нядоўгі тэрмін службы ў ГРУ хапіла і раманцыкі, і выпрабаванняў.

— Першыя гады незалежнасці Беларусі былі поўныя драматызму і нечаканых падзей. Што вам асабліва запомнілася?

— Той час сапраўды быў дзіўным, трагічным і супярэчлівым: развал СССР, параліч КПСС, усплёск нацыяналізму, крывавыя бойкі на гэтай глебе... Людзі сталі паводзіць сябе зусім інакш, чым раней. Памятаю, калі адбыўся крах Камуністычнай партыі СССР, паўстала пытанне аб выхадзе з яе радоў. Кожны член КПСС павінен быў напісаць адпаведную заяву. Ва ўрадзе пасля даволі жорсткай і працяглай дыскусіі на гэты конт мы прыйшлі да высновы, што ў інтарэсах народа мець беспартыйны ўрад. Мы кіраваліся логікай жыцця. Але чым кіраваліся дэпутаты Вярхоўнага Савета, 80 працэнтаў якіх былі камуністамі: сакратары ЦК і абкамаў, загадчыкі аддзелаў гэтых партыйных камітэтаў? Дзіўна, але факт: усе яны, за выключэннем Анатоля Аляксандравіча Малафеева, прагаласавалі фактычна за самаліквідацыю Кампартыі Беларусі. Тым больш дзіўна, што іх ніхто (акрамя БНФ) не прымушаў знішчаць сваю партыю, дзе яны былі кіраўнікамі. А тым часам набіраў моц БНФ. У гэтых надзвычай складаных умовах цэнтрам палітычнай і эканамічнай улады стаў урад.

І менавіта мне, як яго кіраўніку, выпала складаная місія весці перамовы з раз'юшанымі прадстаўнікамі мінскіх заводаў, якія, абураныя дарагоўляй, галапіруючай інфляцыяй, няпэўнай палітычнай і эканамічнай сітуацыяй, выйшлі на плошчу. Да масавага пратэсту людзей падбухторвалі завадатары з БНФ. Я асабіста даў каманду міліцыі не перашкаджаць дэманстрантам сабрацца на плошчы перад Домам урада. Цікава, што гнеў натоўпу БНФ спрабаваў накіраваць не супраць урада, а на стварэнне ціску на старшыню Вярхоўнага Савета Мікалая Іванавіча Дземянцея. Менавіта яго адстаўкі патрабавалі пратэстуючыя. Хоць у той дзень мне было трэба вырашыць некалькі неадкладных пытанняў, але якая работа, калі пад акном гудуць некалькі дзясяткаў тысяч чалавек? Я заходжу да Дземянцея і кажу: «Мікалай Іванавіч, пайшлі на плошчу, няма іншага выйсця». Дземянцей адмовіўся.

А ўжо гарачыя галовы ва ўнутраным двары Дома ўрада сцягвалі спецназ, бронетранспарцёры. Я забараніў пускаць у ход сілу і ў суправаджэнні аднаго ахоўніка (уся мая ахова была з двух чалавек), які ўсяляк угаворваў мяне не выходзіць з будынка ўрада, пайшоў да людзей. Размовы, на жаль, не атрымалася. Ведаеце, велізарны натоўп — страшная з'ява. Тут звычайная логіка не заўсёды дзейнічае. Можна чакаць рознай правакацыі. Дастаткова адной неасцярожнай фразы, каб выклікаць незваротную агрэсіўную рэакцыю. Відаць, прадстаўнікі БНФ чакалі маёй памылкі, але не дачакаліся. Я вярнуўся ў кабінет і назіраю за падзеямі на плошчы. Праз хвілін дзесяць натоўп пачаў радзець. А праз гадзіну засталася толькі невялікая групка прыхільнікаў БНФ з бела-чырвона-белымі сцягамі. Праўда, на наступны дзень зноў сабралася каля пяці тысяч чалавек. Яны трохі пашумелі і разышліся.

— Вядома, не ад добрага жыцця людзі выйшлі пратэставаць. Што іх так усхвалявала? Тады, наколькі я памятаю, узнікла нейкая блытаніна з грашыма. Расія замест дапамогі нам моцна сапсавала абедню? Так было?

— Да мяне сталі даходзіць чуткі, што Расія тайком ад Беларусі збіраецца ўводзіць уласную валюту замест савецкага рубля. Я спытаў аб гэтым напрамую ў Ягора Гайдара, які выконваў абавязкі старшыні ўрада. Той у адказ: «Ну што вы, Вячаслаў Францавіч? Калі што і будзе, то мы вас загадзя папярэдзім». Падмануў Ягор Цімуравіч. Неўзабаве Расія ўвяла свой рубель. Нам прыйшлося тэрмінова рэагаваць, уводзіць сваіх слынных «зайцоў». Пакуль тое-сёе, эканамічная сітуацыя пагоршылася, папаўзлі ўгору цэны, людзі сталі выказваць незадаволенасць. Гэта паспрабавалі выкарыстаць апазіцыйныя сілы, і у першую чаргу БНФ.

— А як узнікла ідэя ўвядзення ў Беларусі пасады прэзідэнта?

— Вось тады і ўзнікла як рэакцыя на тую неразбярыху і анархію ў калідорах заканадаўчай улады. Ураду даводзілася працаваць у вельмі неспрыяльных умовах. З падачы БНФ дэпутаты Вярхоўнага Савета замест таго, каб быць нашымі партнёрамі, дапамагаць нам у вырашэнні вострых гаспадарчых праблем, часта займалі неканструктыўную пазіцыю, блакіравалі нашы ініцыятывы і прапановы. Сітуацыя паступова пераходзіла ў рэчышча актыўнага супрацьстаяння ўрада і парламенту. Так не магло доўга працягвацца, і таму была прапанавана ідэя пераходу да прэзідэнцкай рэспублікі. Я і сёння ўпэўнены ў правільнасці гэтага кроку.

Гутарыў
Леанід ЛАХМАНЕНКА.
(Заканчэнне будзе.)

НА ТРАДЫЦЫЮ СУСТРЭЧЫ ВЫПУСКНІКАМІ СВІТАНКАЎ НІХТО НЕ ПАСЯГАЕ

10 і 11 чэрвеня ў беларускіх школах пройдуць выпускныя вечары. Як тлумачаць у Міністэрстве адукацыі, у асобных выпадках выпускныя вечары дазваляецца праводзіць за сценамі агульнаадукацыйных устаноў, але пад гэтыя мэты дазваляецца выкарыстоўваць толькі ўстановы пазашкольнага выхавання і навучання і ўстановы культуры.

Міністэрства адукацыі не абмяжоўвае працягласць вечароў: канкрэтная дата іх правядзення (10 ці 11 чэрвеня), пачатак, працягласць і месца правядзення вызначаюцца рашэннем кіраўніка агульнаадукацыйнай установы з удзелам бацькоўскага камітэта і па ўзгадненні з мясцовымі ўладамі.

Начальнікам упраўленняў адукацыі аблвыканкамаў і старшыні Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама прадпісана падчас правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў прыняць меры па забеспячэнні грамадскага парадку з прыцягненнем праваахоўных органаў, забяспечыць кантроль за выхаваўчым зместам сцэнарыяў мерапрыемстваў, паклапаціцца пра захаванне заканадаўства аб недапушчэнні знаходжання ўдзельнікаў мерапрыемства ў нецвярозым стане і спажыванні імі алкагольных напіткаў, піва ў месцах правядзення мерапрыемстваў, а таксама падчас масавых гулянняў на гарадскіх вуліцах, у парках, падчас сустрэчы світанку.

Падчас правядзення выпускных вечароў павінна быць арганізавана дзяжурства педагагічных работнікаў, тэхнічнага персаналу і бацькоў. Суправаджаць выпускнікоў дарослыя павінны таксама і падчас масавых гулянняў на гарадскіх вуліцах, у парках, падчас сустрэчы світанку, а таксама ў іншых выпадках.

У сталіцы выпускныя вечары пройдуць 11 чэрвеня. Ахову грамадскага парадку будуць забяспечваць не менш як па два супрацоўнікі міліцыі ў кожнай школе, а таксама не менш як 10 супрацоўнікаў міліцыі спецыяльнага прызначэння ў гарадскіх парках сталіцы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

За веру прыняў пакутніцкую смерць

У Мёрскім раёне, у самым маленькім горадзе Беларусі — Дзісне — адбылася першая ў гісторыі Полацкай праваслаўнай епархіі літургія з чынам кананізацыі свяшчэннамучаніка. У літургіі браў удзел Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт. Ён павіншаваў вернікаў і адзначыў: «Сёння мы праслаўляем новаю зорачку на царкоўным небасхіле!».

Да ліку святых далучаны святар Канстанцін Жданаў. Ён за веру прыняў пакутніцкую смерць у смутныя часы грамадзянскай вайны. У 1919 годзе яго забілі за тое, што не пажадаў адмовіцца ад веры, пакінуць свой прыход, што ўсім сэрцам служыў Богу. Святара пахавалі жывым. Па расказах сведак, апошняй просьбай яго была — памаліцца. І за сваіх забойцаў таксама. З просьбай кананізаваць свайго земляка звярталіся вернікі.

Станоўчае рашэнне аб кананізацыі было прынятае яшчэ ў 2005 годзе. За гэты час збіраліся звесткі пра ягонае жыццё і адданае служэнне царкве. А ў 2008 перанеслі мошчы святара ў храм Уваскрэсення Хрыстовага — галоўны храм Дзісны. Мошчы захоўваюцца ў спецыяльнай рацы з правага боку ад алтара.

Памяць свяшчэннамучаніка Канстанціна Шаркоўшчынскага будзе адзначацца 29 красавіка (у дзень яго пакутніцкай смерці), 3 чэрвеня (дзень кананізацыі), а таксама ў Саборы Беларускіх святых.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Ударым аўтапрабегам па абортах!

Упершыню ў Віцебску прайшоў аўтапрабег супраць абортаў. Па цэнтральных праспектах і вуліцах горада ў суправаджэнні ДАІ праехалі на машынах арганізатары акцыі. Сярод пасажыраў былі і малыя дзеці. На сцягах, якія луналі над аўто, былі надпісы «Абаронім жыццё», «Аборт — гэта смерць» і іншыя.

Жудасны факт: па інфармацыі ўдзельнікаў акцыі, толькі за адзін год з-за спынення цяжарнасці па ўласнай волі не нарадзілася 36 тысяч немаўлят. Як адзначылі ў размове з карэспандэнтам «Звязды» валанцёры дабрачыннага фонду «Адкрытае сэрца», да іх ужо перад пачаткам аўтапрабегу далучыліся неабыякавыя людзі. Ідэю акцыі перанялі ў расійскіх валанцёраў, а тыя, у сваю чаргу, — у замежных. У многіх краінах такія акцыі праводзяцца даўно, у тым ліку і пры падтрымцы царквы.

Калі хоць бы адна жанчына задумаецца і не зробіць аборт — акцыя ўдалася, упэўненыя арганізатары. Яны маюць намер і надалей прапагандаваць сямейныя каштоўнасці, весці інфармацыйную работу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Маршчыністая скура — трывожны сігнал для жанчын

На думку амерыканскіх навукоўцаў, адлюстраванне чалавека можна выкарыстоўваць замест тамаграфічнага здымка шкілета, каб вызначыць, у якім стане знаходзіцца яго касцявая сістэма. У прыватнасці, размова ідзе пра жанчын: чым больш у жанчыны зморшчын, тым больш слабы ў яе шкілет. Пра такі дыягнастычны «бонус», падораны прадстаўніцам слабага полу натуральнымі фізіялагічнымі працэсамі ў перыяд постменапаўзы, паведамілі амерыканскія спецыялісты на штогадовым з'ездзе Асацыяцыі эндакрынолагаў.

Да даволі нечаканых высноў эндакрынолагі прыйшлі пасля дадатковага аналізу, праведзенага ў рамках шматгадовага даследавання. У дадатковую групу ўвайшло 114 жанчын, у якіх апошняя менструацыя завяршылася не менш як тры гады назад і яны знаходзіліся ў стане постменапаўзы. Прычым сярод даследаваных не было тых, хто змагаўся са старэннем з дапамогай гарманальных прэпаратаў ці хірургічных метадаў. Навукоўцы ацэньвалі стан скуры твару і шыі па колькасці і глыбіні зморшчын. З дапамогай спецыяльнага прыбора даследчыкі рабілі скуры дадатковую ацэнку па паказчыках трываласці і пругкасці. Да таго ж удзельніцы прайшлі поўны медыцынскі агляд, падчас якога вызначалася шчыльнасць і трываласць іх касцявой сістэмы.

У выніку ўдалося ўстанавіць, што ў маршчыністых жанчын — самы слабы шкілет. І чым больш у жанчыны зморшчын і чым яны глыбейшыя, тым меншая ў яе шчыльнасць касцявой тканкі. Прычым гэтая карэляцыя аднолькавая для ўсіх аддзелаў шкілета і не мае сувязі з узростам, канстытуцыяй ці масай цела.

Навукоўцы лічаць, што, хутчэй за ўсё, выяўленая паміж зморшчынамі і шчыльнасцю касцей сувязь можа быць звязана з падобнай «рэцэптурай», якую выкарыстоўвае арганізм для фарміравання касцявой і покрыўных тканак.

Аўтары даследавання маюць намер працягваць клінічныя і лабараторныя даследаванні, каб распрацаваць больш танныя спосабы дыягностыкі высокай рызыкі пераломаў і папярэджваць пра рызыку жанчын. Для дадатковых даследаванняў патрабуецца некалькі гадоў. А пакуль што навукоўцы рэкамендуюць часцей глядзецца ў люстэрка і звяртацца па дапамогу не толькі да касметолага, але і да іншых спецыялістаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Што рабіць?

Каб не «пазелянець» у дарозе...

Унаш імклівы век часта даводзіцца пераадольваць вялізныя адлегласці з дапамогай разнастайных транспартных сродкаў. Але для многіх паездкі — цяжкае выпрабаванне. Віной таму сіндром загойдвання, або так званая «хвароба руху» (на медыцынскай мове — кінетоз). Праўда, «пазелянець» ад моташнасці можна не толькі падарожнічаючы па вадзе, сушы або паветры. Загайдаць можа і на крутых амерыканскіх горках, і падчас танцаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Што ж такое «хвароба руху» і з-за чаго яна развіваецца? Аказваецца, людзей можа загойдваць па дзвюх прычынах. Па-першае, вестыбулярны апарат (орган раўнавагі) пакутуе ад нязвыклых паскарэнняў, як у заторах на аўтадарозе: машына разганяецца, тармозіць, зноў разганяецца. У выніку частка пасажыраў хоча пакінуць транспарт неадкладна. Па-другое, прычынай загойдвання можа стаць неадпаведнасць вестыбулярных і зрокавых адчуванняў: напрыклад, чалавек, знаходзячыся ў закрытай каюце на круізным лайнеры, бачыць, што памяшканне нерухомае, і ў той жа час яўна адчувае, як яно хіліцца з-за гайданкі. Палова падарожнікаў у круізных турах у той або іншай ступені пакутуюць на марскую хваробу.

Звычайна цэнтральная нервовая сістэма выдатна разбіраецца, якія менавіта сігналы павінны паступаць у яе ад розных органаў. І калі яны раптам не супадаюць з тым, што запісана ў памяці, інфармацыя пачынае канфліктаваць і запускаецца шэраг нейравегетатыўных рэакцый, якія і характарызуюць сіндром загойдвання.

Праявы «хваробы руху», як правіла, развіваюцца паступова. Спачатку могуць з'явіцца пазяханне, павышанае слінааддзяленне, бледнасць, моцны халодны пот, а таксама галавакружэнне, галаўны боль, агульнае недамаганне і стомленасць. Затым узнікае і нарастае млоснасць, пачынаюцца ваніты, парушаецца каардынацыя рухаў. Вандроўнік адчувае моцную слабасць, не можа засяродзіцца. Працяглая млоснасць з моцнымі ванітамі можа прывесці да артэрыяльнай гіпатаніі, абязводжвання, знясільвання.

Самым надзейным спосабам барацьбы з кінетозам лічыцца трэніроўка вестыбулярнай сістэмы. Аднак для гэтага неабавязкова шукаць спецыяльныя трэнажоры. Вам могуць дапамагчы звычайныя атракцыёны, спартыўныя заняткі і гульні (тэніс, валейбол, кулькі, скачкі на батуце). Таксама варта практыкаваць павольныя нахілы, павароты, прысяданні, плаўнае кручэнне тулавам і інш. Чым больш разнастайным будзе набор інфармацыі і адчуванняў, што ўздзейнічаюць на вестыбулярны апарат, тым больш шанцаў дабіцца поспеху.

А што ж рабіць, калі часу на трэніроўку няма, а дата ад'езду ўсё бліжэй і бліжэй? Пра тое, каб не загайдала ў паездцы, варта паклапаціцца загадзя.

Перад дарогай неабходна добра адпачыць. Калі непакоіць бяссонніца, лепш выпіць заспакаяльны або снатворны сродак. У дзень ад'езду нельга піць спіртное і шмат курыць. Як голад, так і пераяданне могуць правакаваць загойдванне. Не варта піць малако і моцнагазаваныя напоі. Падчас працяглай вандроўкі пажадана есці часта і патроху.

Турыстам, схільным да загойдвання, у транспарце рэкамендуецца знаходзіцца там, дзе менш за ўсё амплітуда руху, напрыклад, у сярэдняй частцы карабля або ў той частцы самалёта, якая размешчаная ў раёне крыла. Трэба звесці да мінімуму ўсе рухі галавой і прыхіныць яе да чаго-небудзь цвёрдага. Напрыклад, легчы на спіну або знаходзіцца напаўлежачы з валікам пад галавой.

Падчас паездак на машыне або аўтобусе лепш садзіцца тварам па ходзе руху. Не варта актыўна круціць галавой ва ўсе бакі або сачыць за мільганнем прадметаў за акном. Лепш за ўсё заняць прэдняе сядзенне і глядзець на дастаткова далёкі і высокі прадмет. Альбо заплюшчыць вочы і заняць зручную позу, адкінуўшы крэсла максімальна назад. Вядома ж, калі гэта аўтобусная экскурсія па горадзе, такі варыянт мала падыходзіць, але пры доўгіх пераездах, паверце, няма нічога лепшага, чым проста заснуць.

Тым, каго загойдвае, варта пазбягаць перагравання і пераахаладжэння. Лічыцца, што непрыемныя адчуванні праяўляюцца радзей, калі адцягнуцца ад навакольнага становішча і заняцца цікавай справай, цалкам сканцэнтраваўшыся на ёй. Праўда, ад чытання і працы на ноўтбуку ў такой сітуацыі лепш адмовіцца. Цудоўна дапамагае праслухоўванне лёгкай меладычнай музыкі або прагляд фільма, калі экран размешчаны ў верхняй частцы аўтобуса або машыны.

У некаторых выпадках перамагчы загойдванне можа глыбокае і рытмічнае дыханне: для гэтага трэба рабіць глыбокі ўдых і выдых, рытм якіх павінен складацца прыкладна дзесяць разоў у хвіліну.

Непрыемныя адчуванні адступаюць або працякаюць у менш цяжкай форме, калі час ад часу вы будзеце абціраць твар і шыю халоднай вадой.

Класічным сродкам барацьбы з «хваробай руху» лічацца напоі з лёгкім кіслым смакам, напрыклад, морс або апельсінавы сок. Таксама вельмі добра дзейнічае корань імбіру. Прычым усё роўна, у якім выглядзе: можна есці кавалачкі сырога кораня або прымаць сухі парашок, можна смакаваць імбірнае печыва або смактаць імбірныя карамелькі.

Альбо паспрабуйце пагрызці кіславаты яблык, маласольны агурок, кавалачак лімона.

Вялікае значэнне мае і настрой, з якім вы адпраўляецеся ў дарогу. Самаўнушэнне да паездкі і падчас яе, аўтатрэнінг, упэўненасць у тым, што ўсё пройдзе добра, прыемныя ўспаміны або мары пра будучыню, у якія вы можаце паглыбіцца, сеўшы ў аўтобус або самалёт, змогуць пазбавіць вас ад пакутлівага чакання прыступу млоснасці, адагнаць хваравітыя адчуванні.

Існуе яшчэ адзін шлях пазбаўлення ад сіндрому загойдвання — медыкаментозны. Лекаў сёння мноства, у тым ліку і дастаткова эфектыўных. Пракансультаваўшыся са спецыялістам, вы зможаце падабраць сабе максімальна бяспечны і дзейсны прэпарат.

ДАРЭЧЫ

Пры загойдванні малыя дзеці часта не паспяваюць прасігналізаваць дарослым пра блізкі прыступ ванітаў — усё адбываецца імгненна і бурна. І прадбачліва падрыхтаваныя пакеты спатрэбяцца вам толькі для таго, каб скласці ў іх запэцканую вопратку.

Калі вы часта падарожнічаеце і ведаеце слабасць свайго дзіцяці, паспрабуйце вырабіць для яго простае прыстасаванне: каляны цэлафанавы пакет раскрыйце і злёгку закруціце, надаўшы яму форму вядзерца. Затым прымацуйце да «вядра» дужку са шнура або стужачкі і павесьце прыстасаванне малому на шыю. Лёгкая канструкцыя, безумоўна, не вельмі добра глядзіцца, затое заўсёды ў баявой гатоўнасці.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 13 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць прас, сокавыціскалку, электрасушылку або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **14 ліпеня 2011 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 23 ліпеня 2011 г.**

Дастаўку электрасушылак і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 30 верасня 2011 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года і пашпарта. **Пасля 30 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 17.05.11 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 17.05.11 па 30.09.11.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1892 ад 11.05.11, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

5 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на III кв. або 2-е паўг. 2011 года**

Жатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету

(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

ПВ	месца	літар

Кошт	падпіскі	_____ руб.	Колькасць камплектаў	
	пераадрасоўкі	_____ руб.		

на 2011 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Ён + Яна

9 правіл ПАСПЯХОВАГА АДПАЧЫНКУ

Што можа быць лепш за адпачынак разам з каханым чалавекам? Толькі адпачынак з каханым чалавекам без сварак і спрэчак. А для таго, каб ён так і прайшоў, трэба выконваць дзевяць простых правіл.

ПРАВІЛА 1: не бярыце шмат рэчаў

Вядома, у водпуску хочацца «выгуляць» усе летнія рэчы, бо яны ўсю зіму нудзіліся ў шафе і чакалі свайго часу. Але падумайце пра вашага мужчыну і яго здароўе! Яго сумка ды вашы тры чамаданы — так і спіну пашкодзіць нядоўга. Зразумела, у аэрапорце і непасрэдна ў гатэлі вам дапамогуць носчыкі, але пакуль гэтыя цудоўныя людзі не сустрэнуцца на вашым шляху, увесь груз ляжа на плечы (рукі, спіну, галаву) вашага мужчыны. А гэта не дадасць яму настрою. Дык навошта ж пачынаць адпачынак з канфлікту?

ПРАВІЛА 2: сплануйце адпачынак загадзя

Паляжаць на пляжы, паглядзець усялякія цікавыя месцы і выпіць столькі «Махіта», колькі атрымаецца, — гэта не план, а мара. А ў рэальнасці можа аказацца, што на пляжы хочаце качацца толькі вы, а яго цягне на экскурсіі. Або ў вас у планах шопінг, а ў яго адны суцэльныя рэстараны. Карацей, абгаварыце загадзя, што і калі вы будзеце рабіць хаця б прыкладна, каб пазбегнуць непрыемных сюрпрызаў. Галоўнае — браць да ўвагі інтарэсы абодвух бакоў.

ПРАВІЛА 3: улічвайце біярытмы адно аднаго

Калі вашы біярытмы не супадаюць, то варта абгаварыць не толькі план водпуску ў цэлым, але і расклад дня ў прыватнасці. Правіла простае: калі адзін спіць, другі не парушае яго спакою. Вы ўскочылі ў сем раніцы і пабеглі на пляж, пакуль сонейка яшчэ не занадта агрэсіўнае? Цудоўна, хай ён качаецца ў пасцелі, колькі хоча. Але затое ён дасць вам падрамаць гадзінку пасля абеду і не будзе бурчэць, што вы ж збіраліся на экскурсію. У рэшце рэшт, водпуск патрэбен у тым ліку і для таго, каб адаспацца.

ПРАВІЛА 4: вырашыце пытанне з харчаваннем

Адпачынак па сістэме «ўсё ўключана» — не адзіны варыянт, але нават ён патрабуе пэўных кампрамісаў. Ён (мужчына) не правакуе вас зрывацца з дыеты і не пакеплівае з таго, што з усяго багацця вы выбралі два віды салаты і кавалачак дыні. А вы не бурчыце з прычыны яго звычкі запіваць смажанае мяса півам. Пакуль вы вячэраеце ў сем, ён можа пасядзець у бары, а вы, калі ён прагаладаецца бліжэй да ночы, пасядзіце з ім і вып'еце келіх віна з парай лустачак сыру. І галоўнае: аргумент «я не магу есці ў адзіноце, таму еш разам са мной, нават калі ты яшчэ не хочаш» (а многія мужчыны гэтым грашаць) — не прымаецца.

ПРАВІЛА 5: разлічыце бюджэт

Грошы часта становяцца перашкодай на шляху да цудоўнага рамантычнага адпачынку. Нават калі ў вас агульны сямейны бюджэт, усё роўна кожны павінен мець нейкую суму на асабістыя траты, якія не будуць абмяркоўвацца або асуджацца. Хочацца вам 25-я пацеркі з ракавінак, купіце сабе на здароўе. Падабаецца яму недарэчная бейсболка, хоць яна і слова добрага не вартая — няхай купляе. Калі вы запланавалі грандыёзны шопінг, адразу адкладзіце грошы, якія вы можаце дазволіць сабе патраціць.

ПРАВІЛА 6: не абмяжоўвайце зносіны

Вы адпраўляецеся на адпачынак удваіх і ўжо марыце пра рамантычныя вечары на марскім узбярэжжы. Але ён нечакана заводзіць новыя знаёмствы, і пара ператвараецца ў шумную кампанію. Вас гэта раздражняе? Дарэмна! Кантактуючы з новымі людзьмі, ваш мілы набіраецца новых уражанняў, падсілкоўваецца энергіяй і наогул атрымлівае задавальненне. Толькі дамоўцеся, што нейкую частку часу вы ўсё роўна будзеце бавіць удваіх: начное купанне і позняя вячэра з бутэлькай шампанскага на беразе — гэта ўсё-ткі не масавая забаўка.

ПРАВІЛА 7: пакіньце адно аднаму асабістую прастору

Яшчэ дзядуля Фрэйд сцвярджаў, што кожнаму чалавеку неабходна асабістая прастора. Але не ва ўсіх людзей гэтая патрэба з'яўляецца першаснай. У звычайным жыцці мы не так ужо шмат часу праводзім удваіх: праца, дзеці, бацькі, сябры адцягваюць на сябе частку ўвагі. А тут водпуск! Для таго, каб да яго заканчэння вы адно аднаму не абрыдзелі, дамоўцеся, што частку часу вы будзеце бавіць асобна адно ад аднаго. Яму зусім не абавязкова хадзіць з вамі па крамах, а вам глядзець з ім футбол у бары ўвечары — вы ў гэты час можаце схадзіць на SPA-працэдуры або ў спартзалу.

ПРАВІЛА 8: не раўнуйце

Стаўцеся да ўсяго з доляй гумару. Пляж — гэта такое адмысловае месца, дзе ўсе дзяўчаты ходзяць практычна ў чым маці нарадзіла. А мужчыны глядзяць на іх і радуюцца жыццю. Так ужо яны ўстроены, з фізіялогіяй не паспрачаешся.

ПРАВІЛА 9: вырашайце праблемы

Водпуск — гэта маленькае жыццё. Тут усё як дома — агульная тэрыторыя, агульны час, агульныя грошы. Толькі часу вы разам праводзіце ў сто разоў больш, чым звычайна, а значыць, і верагоднасць сварак узрастае ў геаметрычнай прагрэсіі. Каб іх пазбегнуць, усё, што ў вас да яго назапасілася, лепш выказаць адразу, не чакаць, пакуль вы дасягняце пункта кіпення. Папрасіце і яго рабіць тое ж самае. Вядома ж, няма ніякай гарантыі, што вы пачняце збірацца на вячэру за 15 хвілін замест паўтары гадзіны, калі ён вас аб гэтым папросіць. Але прынамсі вы будзеце ў курсе, што менавіта яму не падабаецца, і зможаце прапанаваць варыянты — напрыклад, ён чакае вас у холе, а вы стараецеся «паскорыцца».

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Таполевы пух не выклікае алергіі, але пераносіць на сабе пылок алергенных злакаў

Таполевы пух не лічыцца алергенным, але ён пераносіць на сабе пылок злакаў, тым самым выклікаючы абвастрэнні захворванняў у людзей з палінозам (алергіяй на пылок раслін). Пра гэта паведаміла загадчыца алергалагічнага кабінета 2-й цэнтральнай раённай паліклінікі Мінска Алена Чалей.

Пакуль сіноптыкі дажджоў не абяцаюць. Таму ўрач параіла гараджанам-алергікам не выходзіць з дому без антыгістамінных прэпаратаў, назальнага спрэя і сонцаахоўных акуляраў. А работнікам камунальнай службы — звярнуць увагу на няскошаныя газоны, якія зараслі купкоўкай, аўсяніцай, цімафееўкай і іншымі злакамі-алергенамі. Таксама яна парэкамендавала людзям з палінозам з'ехаць на пару месяцаў з Мінска, Беларусі ў іншую кліматычную зону, каб не правакаваць абвастрэнне хваробы.

«Злакі будуць цвісці ўвесь чэрвень, а ў сярэдзіне ліпеня пойдзе палын — адна з самых «злых» для алергікаў раслін», — дадала А. Чалей.

Да ведама, у большасці людзей першыя сімптомы сезоннай алергіі на пылок раслін з'яўляюцца паміж 12 і 16 гадамі або ў 30—35 гадоў. Паліноз каварны: калі з'явіўся, то, хутчэй за ўсё, застанецца на ўсё жыццё. Таму вельмі важна разам з урачом-алерголагам падабраць схему лячэння і па магчымасці пазбягаць кантакту з алергенам. У адваротным выпадку хвароба можа перарасці ў гаймарыт, бранхіт, пнеўманію.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, *«Мінск—Навіны».*

Актуальна

7 прынцыпаў ЛЕТНЯГА ХАРЧАВАННЯ

Самаадчуванне ў летні час шмат у чым залежыць ад харчавання. Нездарма дыетолагі раяць у гэты перыяд ужываць як мага больш свежай садавіны—агародніны і адмовіцца ад высокакаларыйнай ежы.

АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ

1. Перш за ўсё, вам варта адмовіцца ад сытных трапез, звычка да якіх выпрацавалася за халодную пару года. Памятайце пра тое, што лепш харчавацца 5 разоў на дзень невялікімі порцыямі лёгкай ежы, чым адзін раз наядацца да адчування цяжару ў страўніку. Летняе харчаванне таксама мае на ўвазе адсутнасць у рацыёне тлустых, салёных, вострых страў.

2. На вашым стале заўсёды павінны прысутнічаць садавіна, агародніна, ягады, рознае зяленіва (не забывайцеся ўсё гэта старанна мыць). Іх можна ўжываць на працягу дня ў салатах альбо паасобку.

3. Летняе харчаванне — гэта не толькі багацце вітамінаў, але і адсутнасць кансервантаў. Уважліва чытайце склад прадуктаў на этыкетцы, каб ніколі не памыляцца ў выбары.

4. З мяса аддавайце перавагу нятлустай ялавічыне, птушцы.

5. Малочныя прадукты ў спёку могуць стаць прычынай нястраўнасці. Кісламалочныя прадукты, заквашаныя спецыяльнымі відамі мікраарганізмаў (біфідок, ацыдафілін, кефір), у гэтую пару падыдуць больш: яны не толькі абагачаюць рацыён паўнацэннымі бялкамі, кальцыем і вітамінам B_2, але і перашкаджаюць развіццю дысбактэрыёзу. Захоўваць кісламалочныя прадукты неабходна ў халадзільніку або халаднаватым месцы пры тэмпературы не вышэй за +4 градусы.

6. Яшчэ раз нагадаем пра непажаданае ўжыванне чыпсаў, розных «вострых» сухарыкаў, салодкіх газаваных напояў, марозіва з фарбавальнікамі і рознымі штучнымі дабаўкамі. Хоць і так зразумела, што карысці ад падобнага харчавання няма ні летам, ні зімой.

7. У спякоту неабходна піць вадкасці на 1—1,5 л больш, чым звычайна; лепш часцей (кожныя паўгадзіны), але пакрысе (50—100 мл). Таксама варта абмежаваць ужыванне чорнай гарбаты, кавы і алкаголю. Апошні расшырае крывяносныя сасуды і спрыяе развіццю непрытомных станаў. Для здаволення смагі лепш выбіраць мінеральную ваду без газу, ягадны морс або натуральны сок.

Цудоўны сродак супраць смагі — напой з мацярдушкі, мятная гарбата. Мятай у спякоту можна заправіць і гарнір. Імбірная гарбата, завараная з лісцем мяты, у гарачае надвор'е танізуе і асвяжае.

УВАГА! За колькасцю выпітай вадкасці важна сачыць людзям, якія пакутуюць на сардэчна-сасудзістыя захворванні, атлусценне, і тым, хто мае праблемы з ныркамі.

ЗМЕНЫ Ў РАЦЫЁНЕ

З надыходам цёплых дзён усё больш прывабна выглядаюць халодныя супы. Хочацца халадніку, бацвіння. Але пры гэтым не ігнаруйце правіл захоўвання. Напрыклад, халодныя супы не павінны стаяць у халадзільніку — ешце іх адразу пасля прыгатавання.

Агароднінныя салаты, вядома ж, таксама не варта захоўваць, аднак без заправы яны могуць да двух сутак пастаяць у холадзе і не сапсавацца (вядома ж, калі ў іх няма яек і морапрадуктаў). У якасці заправы лепш выкарыстоўваць аліўкавы або сланечнікавы алей, а таксама лімонны сок.

Асаблівай асцярожнасці патрабуе летняе харчаванне ў грамадскіх месцах. Тут прынцып такі: чым прасцей, тым бяспечней. Калі якасць ежы, якая падаецца, выклікае ў вас сумненні, лепш адмоўцеся ад яе. Выбіраючы салаты, аддавайце перавагу тым, рэцэптура якіх не прадугледжвае наяўнасці маянэзу і соусаў. Мяса, рыба павінны быць добра прасмажанымі, а вось пра стравы з фаршу лепш наогул забыцца.

ГАРАЧЫЯ ДЫЕТЫ

Есці ў спёку не надта хочацца, таму лета — самы час для таго, каб пазбавіцца ад некалькіх лішніх кілаграмаў. Бо любы разгрузачны дзень (маркоўны, яблычны, клубнічны) у летнюю спякоту пройдзе значна лягчэй, чым у зімовую сцюжу.

Да таго ж лета — час «дыетычных» садавіны і агародніны, якія дапамогуць справіцца з лішняй вагой, а заадно і забяспечаць арганізм вітамінамі. Толькі памятайце: сядзець на плода-агароднінных дыетах можна не больш за 2—3 сутак. Таму разгрузачны дзень ні ў якім разе не павінен ператварацца ў месяц.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Язненскія клёцкі

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхары вёскі Язна Мёрскага раёна лічаць бульбяныя клёцкі нацыянальнай ядой.

КОЛЬКАСЦЬ «ЗАКРЫТЫХ» ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА ЛЯСОЎ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

Яшчэ ў двух раёнах краіны ўведзена забарона на наведванне лясоў: у Клічаўскім і Чэрыкаўскім. Адпаведныя рашэнні прынятыя мясцовымі выканаўчымі органамі.

Такім чынам, на пачатак тыдня забарона на наведванне лясных угоддзяў устаноўленая ўжо ў шасці раёнах Беларусі. Міністэрства лясной гаспадаркі, як паведамілі ў яго прэс-службе, ініцыюе ўвядзенне забароны і ў астатніх рэгіёнах краіны, дзе ў лясах стан пажарнай небяспекі ўжо дасягнуў 4-га класа і ёсць пагроза пераходу на 5-ы — самы высокі (надзвычайны). Дарэчы, летась да такіх захадаў давялося звяртацца толькі ў канцы ліпеня — пачатку жніўня. Сёлета ж з-за адсутнасці дажджоў складаная сітуацыя ў лясах пачала назірацца ўжо ў пачатку чэрвеня.

Толькі за мінулыя выхадныя ў лясным фондзе Мінлясгаса адбылося 19 выпадкаў лясных пажараў, у выніку якіх агонь прайшоўся па 4,25 гектара лесу. За тыдзень лічбы склалі: 42 выпадкі на агульнай плошчы 17,8 гектара. А ўсяго з пачатку пажаранебяспечнага перыяду адбыліся 202 пажары, з-за якіх агнём было пашкоджана 75,9 гектараў лесу. Больш за ўсё такіх выпадкаў зафіксавана на Брэстчыне і Гомельшчыне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА III КВАРТАЛ АБО 2-е ПАЎГОДДЗЕ 2011 ГОДА

З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

НАСУПЕРАМ ЧАРНОБЫЛЮ

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
СВАЯ СПРАВА
ЖЫРАНДОЛЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУП ЦЭНЫ
Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	14 600 рублёў на месяц 87 600 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	13 400 рублёў на месяц 80 400 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	24 800 рублёў на месяц 148 800 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	22 200 рублёў на месяц 133 200 рублёў на паўгоддзе

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	13 250—13 350 рублёў на месяц 79 500—80 100 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	12 120—12 150 рублёў на месяц 72 720—72 900 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	19 591—22 511 рублёў на месяц 117 546—135 066 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	18 063—20 140 рублёў на месяц 108 378—120 840 рублёў на паўгоддзе

* Залежыць ад рэгіёна

8

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ЧЭРВЕНЯ
2011 г.
СЕРАДА
№ 19 (15670)

СІСТЭМА ЭЛЕКТРОННАГА ЗАЛІЧЭННЯ МАКСІМАЛЬНА СПРОСЦІЦЬ АБІТУРЫЕНТАМ ЖЫЦЦЁ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Электронная сістэма залічэння будзе апрабоўвацца падчас сёлетняй уступнай кампаніі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі. Ідэя рэалізацыі праекта «Электроннае залічэнне на некалькі спецыяльнасцяў» была прапанаваная на нарадзе ў Міністэрстве адукацыі ў 2008 годзе, а ў 2009 годзе БДУІР і Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў распачалі распрацоўку сістэмы.

Як расказалі ў прэс-службе БДУІР, «абкатка» новай сістэмы залічэння будзе праходзіць наступным чынам: пры падачы дакументаў у прыёмную камісію абітурыента папросяць указаць тры спецыяльнасці, на якіх той пажадаў бы навучацца: першая — прыярытэтная, а дзве другія — дадатковыя ці запасныя. Выходзячы з колькасці набраных на цэнтралізаваным тэсціраванні балаў, камп'ютарная праграма вызначыць, на якую з трох спецыяльнасцяў абітурыент праходзіць са сваімі баламі. У тым выпадку, калі балаў яму не хопіць, каб прайсці на ўсе тры спецыяльнасці, пры наяўнасці месцаў яму прапануюць чацвёртую, з тым жа наборам экзаменацыйных дысцыплін...

У перспектыве электронную сістэму залічэння абітурыентаў плануюць укараніць ва ўсіх беларускіх ВНУ. Яшчэ на этапе рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне абітурыентам будзе прапанавана ўказаць у парадку ўбывання прыярытэтаў некалькі профільных спецыяльнасцяў у розных ВНУ. А пасля здачы ЦТ спецыяльная камп'ютарная праграма вызначыць, у якую навучальную ўстанову са згаданых яны здолелі прайсці па конкурсе. Паведамленне аб гэтым будзе накіравана абітурыентам па электроннай пошце. Далей маладым людзям застанецца толькі падаць арыгіналы дакументаў у ВНУ.

Асноўная нагрузка пры электроннай сістэме залічэння кладзецца на аператараў пункта рэгістрацыі на ЦТ. Яны павінны будуць увесці ў базу ўсю неабходную інфармацыю аб абітурыенце: медыцынскія звесткі, правы на льготы. У сваю чаргу інфармацыя з атэстата аб заканчэнні сярэдняй школы будзе размяшчацца на спецыяльным сайце, і гэтым зоймуцца школы.

Праўда, увядзенне электроннай сістэмы залічэння пацягне за сабой змяненні і дапаўненні ў Правілы прыёму ў ВНУ. Напрыклад, патрабуюцца медыцынскія даведкі новага ўзору, у якіх у даступнай для аператара форме будзе ўказана, ці дазваляе стан здароўя маладога чалавека навучацца на абранай спецыяльнасці. Тое ж тычыцца і дакументаў аб ільготах. Затое знікне праблема апошняга дня падачы дакументаў, калі абітурыенты падаюць і перападаюць свае дакументы з адной спецыяльнасці на другую ці з адной ВНУ ў іншую літаральна да апошняга моманту, спрабуючы пралічыць свае шанцы на паступленне. Пакуль што апошні дзень падачы дакументаў застаецца самым нервовым як для членаў прыёмных камісій, так і для абітурыентаў і іх бацькоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Сытна, смачна і каб «па кішэні не біла»

Люблю піць гарачую каву. Пахмурным днём, седзячы ў студэнцкай кавярні свайго інстытута. Тут магчыма забыцца на штодзённую мітусню, спакойна пагаманіць з сябрамі ці паглядзець тэлевізар, уладкаваўшыся ва ўтульным крэсле.

На жаль, такі момант выпадае рэдка. За кароткія 20 хвілін перапынку толькі і паспяваеш на хаду «перакусіць». Што гаварыць пра поўны гарачы абед...

Адкуль браць грошы беднаму студэнту?

Але і гэта не ўсё. Нярэдка толькі на каву ў моладзі грошай і хапае.

Яшчэ толькі чытаеш меню — слінкі цякуць: салаты на любы густ, філе птушкі, блінчыкі з тварагом, джэмам... Але чаму тады мае аднагрупніцы прыходзяць туды, толькі каб купіць вафельку і сок?

Выходзіць, праблема студэнцкага харчавання ёсць. І стаіць яна ў апошні час вельмі востра. Хто ж не чуў пра доўгія чэргі, недахоп часу і дрэннае меню?

Вось я і вырашыла зрабіць рэйд па студэнцкіх сталоўках. Паназіраць, пакаштаваць.

У студэнтаў майго роднага Інстытута прадпрымальніцтва і парламентарызму выбар вялікі: акрамя ўтульнай кавярні пад назвай «Дах з'ехаў» (?), паблізу ёсць мноства магазінчыкаў, міні-кавярняў на розны густ. Тут вам за нейкія пару хвілін згатуюць смачныя бліны з начынкай на выбар, заўсёды ёсць свежыя смажанкі, піражкі. Хіт — сасіска ў цесце. Кошт таксама прымальны. Асабіста я трачу каля 5—7 тысяч рублёў у дзень. Больш ем «сухама» — той самы блін (да 4000 рублёў) + кава (звычайна 1500).

Параўнала неяк з выдаткамі на харчаванне студэнтаў іншых ВНУ. Аказалася, розніца ёсць. У БДУ, напрыклад, поўны абед будзе каштаваць 10 тысяч, у БДПУ— 8.

Цудоўная сталовая Інстытута журналістыкі БДУ. Зала разлічаная на 150 месцаў. Утульна і акуратна, сучасны інтэр'ер. Працуюць тут культурныя і прыветныя людзі.

У меню смажанка, чырвоная рыба, мноства салатаў. Тут можна пакаштаваць і шашлык — прыкладна 4500 за порцыю. Мне спадабалася страва «Рамштэль» (філе птушкі, сухарыкі) і «Вясновая агародніна».

Але і чэргі тут сапраўды вялікія. Калі ў 14.15 тут поўна народу, то што робіцца ў «час пік», калі студэнты падцягваюцца пасля чарговай «пары»? І гэта пры тым, што сюды, акрамя студэнтаў, прыходзяць паабедаць і работнікі бліжэйшых офісаў.

Сталовая БНТУ разлічана на 60 месцаў. Працуюць дзве касы.

Няма такога размаху і выбару страў, як у БДУ. Затое і кошт меншы (за поўны абед у БНТУ вы заплаціце прыкладна 6 тысяч рублёў). А што яшчэ трэба студэнту? Каб было сытна, смачна і, вядома, «па кішэні не біла».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сталовая БНТУ, як і БДУ мае трэцюю нацэначную катэгорыю. А гэта значыць, што нацэнка на прадукты павінна не перавышаць 50% ад закупачнага кошту тавару. Чаму ж тады такая розніца ў коштах (нагадаю, у БДУ абед пацягне на 9-19 тысяч)? Аказваецца, уся справа ў грамах. Чым менш вага адной порцыі, тым танней яе кошт.

Студэнты БДУІР скардзяцца на цеснае памяшканне сталовай і доўгія чэргі. Прыходзіцца насіць ежу з сабой ці бегаць у краму за шкоднымі чыпсамі і сухарыкамі.

Па-хатняму ўтульна ў сталовай БДПУ. Заўсёды свежы, гарачы абед студэнты ядуць з задавальненнем.

— Мы харчуемся па талончыках, — расказала студэнтка Яна Максімовіч.— Яны выдаюцца толькі тым, у каго слабае здароўе.

Дарэчы, не толькі ў БДПУ ёсць такая магчымасць. Дастаткова толькі даведкі з паліклінікі — і вы трапляеце ў «санаторый».

Мастацтва ў інтэр'еры

Але больш за ўсіх мне спадабалася сталовая па вул. Маскоўскай, 15. Вось дзе сапраўднае мастацтва!

У адным будынку тут размяшчаюцца адразу тры навучальныя ўстановы: Інстытут бесперапыннай адукацыі, Інстытут кітаязнаўства і факультэт даўніверсітэцкай адукацыі. Няцяжка здагадацца, што тут заўсёды шмат людзей іншых нацыянальнасцяў. Сталоўка абстаўлена ў кітайскім і беларускім народных стылях. На сценах аднаго з сектараў вісяць іерогліфы. І кормяць там вельмі смачна. Адзін толькі салата «Цэзар» чаго варты! Спадабаліся і салат «Марская пена» з крабавых палачак і маянэзу, філе курынае з ананасамі, кампот з маліны і апельсінаў. За ўсё заплаціла трошкі больш за 6 тысяч рублёў. Упершыню мне давялося бачыць такую сталоўку. Нават не хацелася нікуды адтуль ісці.

Што ж трэба зрабіць, каб дагадзіць спажыўцам і задаволіць усе іх патрабаванні?

Мне стала вядома, што студэнты БДУ пісалі неяк ліст у Галоўнае ўпраўленне спажывецкага рынку Мінгарвыканкама з просьбай разгледзець важныя пытанні. Дабіліся ўсё ж прывілей. Цяпер, па словах дырэктара «Камбіната грамадскага харчавання БДУ» Юрыя Кандруцкага, будзе шырыцца спектр больш танных страў.

А пакуль што адміністрацыя Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама прапануе ўвесці розныя перапынкі для розных курсаў.

ОХ, УЖО ГЭТЫЯ ПАДЛЕТКІ!

Ці задумваліся вы калі-небудзь над тым, чаму ж слова «падлетак» выклікае ў сталага чалавека, як правіла, своеасаблівыя эмоцыі — ад неўсвядомленай напругі да лёгкай панікі? На пытанне «Ці любіце вы дзяцей?» большасць апытаных мной людзей, адказала станоўча. А вось калі я тое ж самае спытала пра падлеткаў, рэакцыя была неадназначная, многія загаварылі пра «жудасны пераходны ўзрост». Рэзкая змена настрояў, нязгода са старэйшымі, жаданне разабрацца ў шматлікіх складаных пытаннях — праз гэта праходзяць многія падлеткі. З кім сябраваць, быць як усе ці вылучыцца з натоўпу, як не пасварыцца з бацькамі, дзе знайсці грошы і час на забавы, ці трэба шукаць хлопца (дзяўчыну), ці пачынаць весці палавое жыццё, ці давяраць свае сакрэты сябрам, сяброўкам ці бацькам, куды паступаць, кім быць, што рабіць? Гэтыя і шмат якія іншыя пытанні хвалююць іх кожны дзень. Як гэта — выплюхваць сваю агрэсію на іншых, калі ў галаве поўны тлум і ўсё вакол здаецца нерэальным, часам нават невырашальным. Яны не ведаюць, як паступіць у той ці іншай сітуацыі, дзе знайсці дапамогу, у каго спытаць рады.

У Беларусі адным са сродкаў адукацыі падлеткаў у сферы рэпрадуктыўнага здароўя з'яўляецца стварэнне сеткі медыцынскіх Цэнтраў дружалюбнага стаўлення да падлеткаў (ЦДП). Дзейнасць ЦДП грунтуецца на прынцыпах даступнасці, зычлівасці, даверу, добраахвотнасці, прыветнасці, кампетэнтнасці і грамадскай падтрымкі. У Цэнтры праводзяцца семінары, трэнінгі, заняткі для лекараў, педагогаў і псіхолагаў. Маладыя людзі могуць атрымаць кансультацыі па пытаннях аховы рэпрадуктыўнага і псіхалагічнага здароўя, прафілактыцы інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам, а таксама па іншых пытаннях палавога выхавання. Арганізаваны і лекторый для моладзі. У цэнтры развіваецца валанцёрскі рух. Падлеткі-валанцёры, якія атрымалі карысную інфармацыю, дзеляцца ёй са сваімі аднагодкамі. На занятках падлеткам распавядаюць, як захаваць і ўмацаваць здароўе, што такое бяспечныя і адказныя паводзіны. Яны змогуць абмеркаваць пытанні ўзаемаадносін, пагутарыць на хвалюючыя тэмы.

Каб разабрацца ў шэрагу пытанняў, звязаных з падлеткамі, я звярнулася да **Юліі ЗАБЕЛЫ, псіхолага цэнтра.**

— Падлеткавы ўзрост — гэта самы доўгі пераходны перыяд, які характарызуецца шэрагам фізічных змен. Тым часам адбываецца інтэнсіўнае развіццё асобы, яе другое нараджэнне.

— А што такое «падлеткавы комплекс?»

— Сутнасць «падлеткавага комплексу» складаюць псіхалагічныя асаблівасці, уласцівыя гэтаму ўзросту, спецыфічныя рэакцыі на ўздзеянні навакольнага асяроддзя. У падлетка прыкметна выяўляецца адчувальнасць да ацэнкі з боку старонніх сваёй знешнасці. Ён вельмі саманадзейна і безапеляцыйна робіць высновы пра навакольных. Часамі яго ўважлівасць ужываецца з дзіўнай чэрствасцю, а хваравітая сарамлівасць з развязнасцю. Жаданне быць прызнаным і ацэненым іншымі, незалежнасць, барацьба з аўтарытэтамі, агульнапрынятымі правіламі і распаўсюджанымі ідэаламі, абагаўленне выпадковых куміраў — усё гэта суправаджае няпросты перыяд.

— Як «расце» пачуццё дарослasці?

— Калі кажуць, што дзіця сталее, маюць на ўвазе яго гатоўнасць да жыцця ў грамадстве. У жыцці падлетка нічога не змяняецца: вучыцца ў той жа школе, жыве ў сям'і. Па-ранейшаму ў сям'і да дзіцяці ставяцца, як да «маленькага». Шмат што ён не робіць сам, шмат — не дазваляюць бацькі, якіх даводзіцца слухацца. Бацькі кормяць, пояць, апранаюць сваё дзіця, а за добрыя паводзіны могуць нават і «ўзнагародзіць». Да рэальнай дарослasці далёка — і фізічна, і псіхалагічна, і сацыяльна. Падлетак аб'ектыўна не можа ўключыцца ў сталае жыццё, але імкнецца да яго і прэтэндуе на роўныя з дарослымі правы. Адгэтуль і з'яўляюцца атрыбуты «псеўдадарослasці»: курэнне цыгарэт, тусоўкі ў пад'ездзе, паездкі за горад.

— Знешні выгляд падлетка — яшчэ адна крыніца канфлікту?

— У падлетка змяняецца хада, манеры, вонкавае аблічча. Яшчэ зусім нядаўна ён лёгка рухаўся, а зараз пачынае хадзіць перавальваючыся, засунуўшы рукі глыбока ў кішэні і сплёўваючы праз плячо. У яго з'яўляюцца новыя выразы. Дзяўчынка пачынае дбайна параўноўваць сваё адзенне і прычоску з узорамі, якія яна бачыць на вуліцы і вокладках часопісаў, выліваючы на маму эмоцыі з-за разыходжанняў. Знешні выгляд падлетка часта становіцца крыніцай пастаянных непаразуменняў і нават канфліктаў у сям'і. А падлетак, лічачы сябе ўнікальнай асобай, у той жа час імкнецца нічым не адрознівацца ад аднагодкаў.

— Што адбываецца з унутраным светам падлетка?

— У падлетка з'яўляецца свая пазіцыя. Ён лічыць сябе ўжо досыць сталым і хоча, каб усе — і настаўнікі, і бацькі — ставіліся да яго, як да роўнага. Але пры гэтым яго не бянтэжыць, што правоў ён патрабуе больш, чым брэ на сябе абавязкаў. І адказваць за нешта падлетак зусім не жадае, хіба што на словах. Імкненне да самастойнасці выяўляецца ў тым, што кантроль і дапамогу ён не прымае. Усё часцей ад падлетка можна чуць: «Я сам усё ведаю!» Гэта так нагадвае дзіцячае: «Я сам!». На жаль, падобная «самастойнасць» — яшчэ адзін з асноўных канфліктаў паміж бацькамі і дзецьмі ў гэтым узросце.

Паважаныя бацькі, многае вы можаце зрабіць самі. Калі ваш падлетак стаў «калючым», стрымайце сваю незадаволенасць, тым больш раздражненне. Паспрабуйце перагледзець свае ўзаемаадносіны і зрабіць іх больш цёплымі і даверлівымі, па-сямейнаму сардэчнымі. Вельмі важна, каб у асобы былі годныя, а яшчэ лепш — высокія мэты: скончыць ВНУ ці тэхнікум, дасягнуць рэкордаў у спорце, дамагчыся прызнання ў творчасці, стаць асам у нейкай справе. Калі сітуацыя ў сям'і не паддаецца карэкціроўцы, не саромейцеся звяртацца да псіхолага. Не заганяйце сябе ў жыццёвы тупік.

Маргарыта СТРАЖЭВІЧ, студэнтка Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва.

А вам падабаецца харчавацца ў студэнцкай сталоўцы?

Настасся, Акадэмія МВД:
— Я зусім не ем у сталовай. Не падабаецца меню — шмат шкодных дабавак. Не хапае здаровага харчавання.

Ларыса, ІПП:
— Хаджу ў кавярню. Мне тут усё падабаецца: утульна, чыста, абслугоўванне хуткае і якаснае. Люблю тутэйшыя салаты і бліны.

Яна і Іра, БДПУ:
— Лепшай сталовай за нашу няма! Тут заўсёды смачна, у чэргах стаяць доўга нам не даводзілася.

Валерыя, БНТУ:
— У нашай сталоўцы кормяць заўсёды добра. З асалодай кожны дзень іду сюды абедаць. Дарэчы, тут пякуць самыя смачныя піражкі!

Марына, ІПП:
—Мне не падабаецца харчавацца ў інстытуцкай сталовай. Падчас перапынку так доўга стаіш у чарзе, што паесці не паспяваеш. І цэны высокія. Бяру з сабой бутэрброд — так мне зручней.

Таццяна БАЖКО

Мы — маладыя

«НЕ ХАЧУ НА КАНІКУЛЫ! ХАЧУ ВУЧЫЦЦА!»

Вучаніца 10 класа Столінскай дзяржаўнай гімназіі Наталля Кірычук — пераможца рэспубліканскай алімпіяды па англійскай мове. Хоць, паводле слоў настаўнікаў, Наташу можна выстаўляць на любую прадметную алімпіяду, і ўсюды яна пакажа добры вынік.

Вучаніца Столінскай дзяржаўнай гімназіі, уладальніца дыплома II ступені прадметнай алімпіяды па англійскай мове Наталля КІРЫЧУК.

Наталля расце ў сям'і настаўнікаў. Мама Іна Анатольеўна — настаўніца пачатковых класаў у СШ № 2 Століна. Бабуля Галіна Міхайлаўна працавала ў Столінскай дзяржаўнай гімназіі настаўніцай матэматыкі, прадзядуля і прабабуля Наташы таксама былі настаўнікамі.

Наталля характарызуе сябе як непастаяннага, няўрымслівага чалавека, які ўвесь час змяняе свае захапленні, знаходзіць новыя хобі. У непаседлівай дзяўчыны з'яўляюцца ўсё новыя і новыя дэвізы, якімі карыстаецца яна ў жыцці. Зараз дэвіз гучыць «Жыві секундай — атрымоўвай асалоду ад жыцця».

— Мне хочацца то на веласіпедзе пакатацца, то схадзіць у музей, — расказвае дзяўчына. — Люблю танцаваць і маляваць. Былі розныя гурткі, якія я наведвала, аднак зноў жа з-за сваёй непаседлівасці ўсё кідала.

Толькі любоў да англійскай мовы застаецца пастаяннай. Хоць яшчэ летась Наталля прымала ўдзел у раённай алімпіядзе адразу па некалькіх прадметах. Па беларускай мове было першае месца. А сёлета яна пераключылася на вывучэнне замежнай мовы.

Любімыя прадметы ў школе — гэта мовы, матэматыка і фізічная культура. Звычайна дзяўчаты ў старэйшых класах не любяць фізкультуру, а тут наадварот. На маё здзіўленне, пачула адказ:

— Фізкультура — гэта любімы прадмет усяго нашага класа. Выкладае яго цудоўны настаўнік... Ды і пабегаць жа трэба, адпачыць ад разумовых заняткаў.

Сярод педагогаў гімназіі адзначае сваю настаўніцу англійскай мовы Наталлю Сцяпанаўну Найдзін, якая і дапамагала рыхтавацца да алімпіяды і прывіла любоў да англійскай мовы. Наталля тры гады таму пабывала ў Англіі. Засталася пад моцным уражаннем ад краіны, паводзін людзей, іх мовы, звычак і традыцый, ды і наогул ад усёй амасферы, якая там пануе.

Школьных сяброў у дзяўчыны многа. Практычна ўсіх вучняў сваёй паралелі яна лічыць сябрамі.

— Як можна не сябраваць, калі мы разам дзесяць гадоў?! Нас перамяшалі — і атрымаўся вось такі сяброўскі «кампот».

Перамогу Наташы сябры святкавалі разам з ёю. Яшчэ да ўрачыстага ўзнагароджання пераможцаў яны патэлефанавалі, каб павіншаваць, крычалі ў трубку, смяяліся ад радасці за сваю сяброўку.

Сучасныя вучні лічаць, што чытаць кнігі — гэта старамодны занятак. З гэтым меркаваннем Наташа катэгарычна не згодная. Яна з задавальненнем чытае мастацкія творы, знаходзіць паралелі з жыццём, шукае для сябе нешта новае і цікавае.

Інтэрнэтам карыстаецца больш для навучання. Ёсць у яе і кола знаёмых, з якімі перапісваецца з дапамогай гэтага сучаснага сродку сувязі. Так падтрымлівае знаёмства з дзяўчатамі, з якімі пазнаёмілася на алімпіядзе.

Вучоба ў гімназіі даецца дзяўчыне лёгка. Сярэдні бал у яе 9,2. Мне было цікава, што новага ў жыццё Наташы прынесла перамога на алімпіядзе.

— У час алімпіяды спачатку было страшна, а потым стала з'яўляцца ўпэўненасць у сабе, у сваіх сілах і магчымасцях. І зараз я ўпэўнена, што магу ісці далей.

На наступны год Наташа плануе зноў прыняць удзел у алімпіядзе па замежнай мове, а свае веды на англійскай паляпшаць увесь час. З выбарам будучай прафесіі яна пакуль не вызначылася, але дакладна ведае, што яна будзе звязана з англійскай мовай.

Мы ішлі ў парк, каб зрабіць фотаздымак. Спытала ў дзяўчыны: пэўна пад цёплымі промнямі сонца хочацца, каб хутчэй наступалі канікулы?

— Не хачу на канікулы. Хачу вучыцца. Мне вельмі падабаецца вучоба, заняткі ў гімназіі, а на канікулы можна на тыдзень — хопіць.

Таццяна СЕГЕН. Фота аўтара.

Беларускі дзіцячы фонд заклікае да міласэрнасці

Беларускі дзіцячы фонд уручыў ганаровую прэмію «Сябар дзяцей» кампаніі «Цэптар Інтэрнацыянал», намесніку старшыні камісіі па справах непаўналетніх Віцебскага аблвыканкама Тамары Аляхновіч і валанцёру Брэсцкага абласнога аддзялення БДФ Людміле Калпачук.

Прэмію «Сябар дзяцей» заслугоўваюць дарослыя, якія служаць дзецям-сіротам і інвалідам, што маюць патрэбу ў абароне і дапамозе. А тры лепшыя беларускія шматдзетныя сям'і атрымалі прэміі імя Зінаіды Тусналобавай-Марчанкі. Гэтую прэмію БДФ устанаўлівае сем'ям, якія выхоўваюць пяць і больш дзяцей і забяспечваюць пры гэтым неабходныя ўмовы іх утрымання, выхавання, захавання здароўя і падрыхтоўкі да самастойнага жыцця.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА И ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА

Наименование объекта	Лот № 1	Лот № 2	Лот № 3	Лот № 4	Лот № 5	Лот № 6
Целевое назначение	Строительство и обслуживание жилого дома					
Местонахождения объекта	г. Малорита, ул. Советская, 95	г. Малорита, ул. Советская, 95«А»	г. Малорита, ул. Советская, 95«Б»	г. Малорита, ул. Советская, 95«В»	г. Малорита, ул. Советская, 95«Г»	г. Малорита, ул. Советская, 95«Д»
Продавец объекта	Малоритский районный исполнительный комитет					
Организатор торгов	Малоритский районный исполнительный комитет					
Начальная цена продажи, руб.	12244690	12169480	12560590	14666550	16907900	16832690
Сумма задатка, руб.	1224470	1216950	1256060	1466660	1690790	1683270
Характеристика объекта, площадь земельного участка (га), решение об отводе земельного участка, кадастровый номер	0,0814 га, решение Малоритского райисполкома № 578 от 10.05.2011. Кадастр. номер 125250100001002748	0,0809 га, решение Малоритского райисполкома № 577 от 10.05.2011. Кадастр. номер 125250100001002749	0,0835 га, решение Малоритского райисполкома № 576 от 10.05.2011. Кадастр. номер 125250100001002750	0,0975 га, решение Малоритского райисполкома № 575 от 10.05.2011. Кадастр. номер 125250100001002751	0,1124 га, решение Малоритского райисполкома № 574 от 10.05.2011. Кадастр. номер 125250100001002752	0,1119 га, решение Малоритского райисполкома № 573 от 10.05.2011. Кадастр. номер 125250100001002753
Ограничения в использовании земельного участка	нет	нет	нет	нет	нет	нет
Срок аренды земельного участка	Частная собственность	Частная собственность	Частная собственность	Частная собственность	Частная собственность	Частная собственность
Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации (руб.)	1595132	1227573	1187060	1273706	1505736	1315266
Условия продажи	1. Внесение победителем аукциона платы за земельный участок. 2. Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка. 3. Осуществление победителем аукциона в двухмесячный срок после получения решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок. 4. Получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения райисполкома на строительство жилого дома. 5. Занятие (освоение) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него.					

Наименование объекта	Лот № 7
Целевое назначение	Строительство и обслуживание жилого дома
Местонахождения объекта	г. Малорита, ул. Березовая, 18
Продавец объекта	Малоритский районный исполнительный комитет
Организатор торгов	Малоритский районный исполнительный комитет
Начальная цена продажи, руб.	7000710
Сумма задатка, руб.	700070
Характеристика объекта, площадь земельного участка (га), решение об отводе земельного участка, кадастровый номер	0,1421 га, решение Малоритского райисполкома № 401 от 04.04.2010. Кадастр. номер 125250100001002662
Ограничения в использовании земельного участка	нет
Срок аренды земельного участка	Право аренды на 50 лет
Размер расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации (руб.)	1747846
Условия продажи	1. Внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка. 2. Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения. 3. Заключение победителем аукциона с Малоритским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок. 4. Получение победителем аукциона в установленном порядке технической документации и разрешение райисполкома на строительство жилого дома. 5. Приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права на него. 6. По окончании срока аренды земельного участка совместно с районным исполнительным комитетом в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования.

Аукцион состоится **13 июля 2011 года в 11.00** по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 64 (малый зал).

Контактные телефоны в Малорите: (8 01651) 2 30 04, 2 30 01, 2 23 65.

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с райисполкомом.

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3602223000219 ЦБУ № 120 АСБ «Беларусбанк», МФО 150501246, код платежа 04002, получатель платежа – районный бюджет, УНН 200077623.

3. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также заверенную копию платежного поручения о внесении задатка.

Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

Гражданином* – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина* или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь* – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

4. Условием проведения аукциона является наличие не менее 2 участников

** – для аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства жилого дома.*

Заявления об участии в аукционе принимаются до 7 июля 2011 г. (включительно) по адресу: г. Малорита, ул. Красноармейская, 1, каб. 57, отдел экономики Малоритского райисполкома с 8.00 до 17.00 по рабочим дням.

У гасцях — «зорка»

Спявачка МАКСІМ:

«СПЯВАЦЬ НА СЦЭНЕ ДЛЯ МЯНЕ ЗАЎСЁДЫ БЫЛО ГЭТАК ЖА НАТУРАЛЬНА, ЯК СХАДЗІЦЬ ПАЕСЦІ»

РАСІЙСКАЯ спявачка Максім беларускую сталіцу наведвае, як той казаў, «рэдка, але метка». І кожны раз — поўныя залы. Адны звязваюць гэта з даступнасцю білетаў, другія — са шчырасцю свячачкі: на мінскіх канцэртах Максім заўжды спявае без фанаграмы.

— Мне таксама падабаецца, калі людзі спяваюць ужывую, не робячы акцэнт на пёрах, нейкіх там танцульках вар'яцкіх, — прызнаецца спявачка. — Увагу трэба канцэнтраваць на музыцы.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Талісманаў у мяне няма — ёсць крыжык

— Дзякаваць Богу, я называюся папсовай музыкай. Вядома, узяўшы ў рукі гітару, я магла б сказаць, што іграю рок — многія так робяць. Але маё прызнанне як «поп-спявачкі» дае магчымасць эксперыментаваць на поўную катушку. З ухілам у народ.

Увогуле, я — за творчасць. Калі будзе добрая песня, з задавальненнем праспяваю дуэтам з кім-небудзь з беларускай эстрады. Мне, дарэчы, прысылалі перапеўкі маіх песень на беларускай мове, вельмі было весела. Я па знаку задыяка Блізняты, але мне здаецца, што ўва мне нават не два чалавекі, а значна больш. Энергіі хапае больш чым на двух чалавек. Талісманаў жа ніякіх на канцэрты не важу — у мяне ёсць крыжык.

Пра артыста і музычную адукацыю

— Адсутнасць спецыяльнай адукацыі ў музыцы заўсёды бачная. Калі чалавек прыходзіць у студыю і просіш зрабіць яго ў нейкім месцы мелізмы альбо мадуляцыю, а і ён не разумее — з ім цяжка працаваць. Артыст павінен ведаць музычны слэнг, каб знайсці паразуменне з гукарэжысёрам.

Сама я па адукацыі — спецыяліст па сувязях з грамадскасцю, піяршчыца. У свой час, рыхтуючы дыплом, сядзела ў бібліятэках і даследавала тэму «Фарміраванне і прасоўванне іміджу асобы ў сферы шоу-бізнэсу». Абаранілася на «выдатна». І калі заканчвала інстытут, то думала, што ведаю ўсё. Але чым далей, тым больш я разумею: ніякія правілы і ніякія кніжкі тут не дапамогуць. Шоу-бізнэс — гэта сувязі, грошы, уменне ўлазіць у чужую душу. А паколькі я дастаткова закрыты чалавек, я зразумела, што гэта не мая прафесія.

Затое я падалася ў музыку. А калі будзе магчымасць, хачу атрымаць яшчэ адну адукацыю — акцёрскую. Для мяне тэатр — закрыты і інтрыгуючы свет. Часам я атрымліваю прапановы зняцца ў кіно, але акцёрскай адукацыі ў мяне няма, а святіцца проста так на блакітных экранах не хачу. Ва ўсім павінен быць прафесіяналізм.

Крытыка і крытыкі

— Я добра стаўлюся да той крытыкі, якая нясе дабро і якая канструктыўная. Дзе можна атрымаць каштоўную параду. Бо калі ты асуджаеш кагосьці, то скажы, што канкрэтна табе не падабаецца. Дай параду — хто ведае, мо яна якраз і неабходная гэтаму артысту.

Для мяне лепшыя крытыкі — публіка і мая дачка. Учора заспявала ёй на ноч калыханку — песню з мульціка «Чырвоны каптурок». А яна мне заспаным голасам: «Мама, не спявай, га?» (*смяецца*. — **Аўт.**).

Запісаў Ілья ЛАПАТО.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пырскі Святога возера

Чачэрскія дзеці бавяць вольны час на Святым возеры.

АПАВЯШЧАЛЬНІК ВЫРАТАВАЎ МАЦІ З ТРЫМА ДЗЕЦЬМІ

«Гарыць жылы дом у вёсцы Стары Пагост». Так а пятай гадзіне раніцы ў Мёрскае падраздзяленне МНС звярнулася суседка.

Калі выратавальнікі прыбылі на вуліцу Азёрную, хата ўжо гарэла адкрытым полымем. На шчасце, яна яшчэ ў лютым гэтага года была аснашчана аўтаномным пажарным апавяшчальнікам. Яго «спрацоўку» і пачула гаспадыня дома, якая была ў водпуску па доглядзе дзіцяці. Яна самастойна, яшчэ да прыбыцця выратавальнікаў, з траімі дзецьмі (хлопчыкамі 2000 і 2006 гадоў нараджэння, дзяўчынкай 2010 года нараджэння), пакінула дом. У 4.50 пажар быў ліквідаваны. Знішчаны дах, столевае перакрыцце, маёмасць, пашкоджаны сцены. Сям'я будзе жыць у сваякоў. Як мяркуецца, прычына пажару — кароткае замыканне электраправодкі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Даеш крэатыў!

ВАЗА ДЛЯ САДАВІНЫ АД БЕЛАРУСКІХ ДЫЗАЙНЕРАЎ

РАБОТЫ чацвярых беларусаў высока ацанілі вядучыя сусветныя спецыялісты ў галіне мастацтва на VII Міжнародным конкурсе маладых дызайнераў ARTZEPT. Беларускіх майстроў павіншавала асабіста арт-дырэктар конкурсу, еўрапейскі мастацтвазнаўца і крытык прыкладнога мастацтва Гардана Біба Маркавіч (Сербія).

Летась аб'ектам увагі маладых дызайнераў-канкурсантаў усяго свету стала ваза для фруктаў. Работа павінна была быць арыгінальнай, функцыянальнай, прывабнай і далёкай ад класічнага рашэння. Міжнароднае журы разглядае работы ў міланскім офісе конкурсу. Пераможцамі ў 2010 годзе і ўладальнікамі прыза ў 10 000 еўра сталі прадстаўнікі Венгрыі. Расія і Польшча занялі другое і трэцяе месцы. Работы чацвярых беларускіх дызайнераў — Алёны Грамыкі (Віцебск), Андрэя Абрамава (Мінск), Наталлі Сасноўскай (Мінск) і Валянціны Цыганец (Гродна) — уключаны ў выніковы каталог і будуць прадэманстраваныя ў сарака краінах свету.

Конкурс прыцягвае ўвагу да самай актуальнай тэндэнцыі ў сучасным дызайне — хатняга дызайну. У папярэднія гады ахвотным выпрабаваць свае сілы ў конкурсе прапаноўвалася вырабіць, напрыклад, набор для закусак, чайную пару, скрыню для пячэння. Паводле слоў **дацэнта кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва факультэта дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Людмілы ЦЕРАХ**, home-дызайн — гэта работа з формай, а значыць, «спасціжэнне» сутнасці таго матэрыялу, з якім працуе дызайнер. Наогул беларускія дызайнеры сёння маюць самыя шырокія магчымасці для прафесійнай самарэалізацыі, галоўнае — не трымацца за месца пражывання, а ехаць туды, дзе ёсць адпаведная вытворчая база і дзе твой талент знойдзе практычнае ўвасабленне.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПЕРШЫ Ў РАЁНЕ СЯМЕЙНЫ ДЗІЦЯЧЫ ДОМ

У Гарадку гасцінна адчыніў свае дзверы першы ў раёне дзіцячы дом сямейнага тыпу. Сярод афіцыйных асобаў, якія павіншавалі навасёлаў, былі старшыня райвыканкама Васіль Муранкоў, начальнік упраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама Іван Шчурок і іншыя.

Утульны і вялікі двухпавярховы дом пабудаваны ў рамках дабрачыннай праграмы «Беларусбанка» для сям'і Дворавых. Муж і жонка, Яўген Генадзевіч і Ганна Пятроўна, гадуюць пяцёра дзяцей, чацвёра з якіх прыёмныя — два браты і дзве сястрычкі.

Зразумела, бацькі не дзеляць дзятву на сваіх і чужых. Між іншым, мама мае добры досвед працы з дзецьмі: акрамя таго, што ў самой трое дзяцей, старэйшыя з якіх ужо дарослыя, яна доўга працавала ў дзіцячым доме выхавацелем. Новы сямейны дом яшчэ папоўніцца малымі, бо ён разлічаны на дзесяць дзяцей. Бацькі запланавалі пасадзіць сад, трымаць гаспадарку.

Усяго, дзякуючы рэалізацыі адпаведнай прэзідэнцкай праграмы «Дзеці Беларусі», у Віцебскай вобласці, пачынаючы з 2006-га года, пабудавана 15 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу. І больш за сто дзяцей такім чынам перасяліліся з дзяржаўных устаноў у сем'і, у новыя дамы. Працягваецца будаўніцтва яшчэ двух аналагічных дамоў — у Чашніцкім і Шумілінскім раёнах. І як адзначыў начальнік упраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама Іван Шчурок, добрая тэндэнцыя ў тым, што колькасць сірот значна памяншаецца.

Вядома, на навасёлле не абышлося без падарункаў. Старшыня Гарадоцкага райвыканкама Васілій Муранкоў уручыў сертыфікат на пральную машыну. Былі таксама перададзены падарункі ад мясцовых прадпрыемстваў і арганізацый. Мясцовыя ўлады і надалей будуць старацца аказваць усякую дапамогу дружнай шматдзетнай сям'і.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

САМАРОБНАЯ СКАРБОНКА, або Што такое хэнд мэйд?

ШТОСЬЦІ прыгожае і незвычанае, зробленае сваімі рукамі, — на мове нашых бабуль і дзядуль яно называецца папросту «самаробным», на мове ж моладзі мы скажам «хэнд мэйд». Гэта сфера творчай дзейнасці, ключавой пазіцыяй якой з'яўляецца стварэнне пэўных прадметаў менавіта ўласнымі рукамі. У выніку атрымліваюцца эксклюзіўныя рэчы. Іх нельга назваць творамі мастацтва, аднак яны выражаюць яркую індывідуальнасць, прычым як і творцы, так і таго чалавека, што іх набывае.

Людзі, якія займаюцца хэнд мэйдам, зразумелі, што варта аб'яднацца, каб дзяліцца вопытам, чэрпаць натхненне і, у рэшце рэшт, прадаваць свае творы. З гэтай нагоды яны пачалі ладзіць сумесныя выставы-продажы. Найбольш выбітныя з іх — «Кірмашы хэнд-мэйду». Плануецца, што яны будуць ладзіцца кожны месяц. А нядаўна другі па ліку «Кірмаш» прайшоў у Нацыянальным гістарычным музеі. На ім было сапраўды людна, як і патрабуе таго «фармат мерапрыемства». Самі гандляры пасля адзначалі, што не паспелі нічога набыць ў іншых майстроў, што ў наступны раз трэба раскласціся за паўгадзіны да прыходу пакупнікоў, бо, як з'яўляюцца наведвальнікі, ні на што ўжо не хапае часу, разглядаеш пасля фотаздымкі і засмучаешся, што не паспеў набыць пэўную прыгожую рэч.

Адна з майстрых кірмашу Яна Марчук падзялілася сваімі ўражаннямі пасля дзеі:

— Я яшчэ раз ўпэўнілася, што беларусы — вельмі цікавая, творчая нацыя. Шмат людзей мае памкненні да стварэння нечага сваімі рукамі. І гэта не толькі жанчыны, хоць іх — большасць. І паказальна, што ёсць людзі, якія дасягнулі досыць прафесійнага ўзроўню. У інтэрнэт-прасторы мільёны старонак, на якіх выкладзены фотаздымкі вырабаў, але гэта пераважна работы пачаткоўцаў. Такія ж кірмашы аб'ядноўваюць сур'ёзных майстроў. Пачынаюць з'яўляцца і пакупнікі з-за мяжы. А гэта азначае, што мы ідзём у нагу з усім светам. Зараз, калі назіраецца павальнае захапленне хэнд мэйдам, вырабы беларусаў замаўляюць у Еўропу, Амерыку, Расію, Кітай, Японію.

Сама Яна Марчук хэнд мэйдам займаецца ўжо трэці год. А пачалося ўсё з таго, што яна пабачыла цікавыя вырабы ў часопісе, прачытала, што ўсё гэта можна рабіць сваімі рукамі з досыць недарагіх матэрыялаў. Яна набыла свой першы пластык і пачала ляпіць упрыгожванні. Вучылася толькі ў інтэрнэце — там безліч урокаў на рускай, а тым больш, на англійскай мовах — ёсць запісы майстар-класаў, суполкі, блогі. Яна адзначае, што не праблема навучыцца, нават не плацячы грошы майстрам, не набываючы дарагія кніжкі. Зараз хэнд мэйд для яе і любімы занятак, і сродак падзарабіць. Асаблівае захапленне з'яўляецца пасля такіх мерапрыемстваў, калі хочацца сесці і нарабіць шмат-шмат упрыгожванняў. Дзяўчына кажа, што калі-небудзь гэтая справа, магчыма, стане яе асноўным заняткам. А найвялікшая для яе ўзнагарода, як бы гэта банальна ні гучала, калі дзяўчыне ці жанчыне, якая набыла ўпрыгожванне, яно добра пасуе. У хуткім часе Яна плануе зрабіць серыю сувеніраў-магнітаў. Але пакуль што гэта тайна, і нават іх тэму яна не стала агучваць.

Адным з арганізатараў «Кірмашу» выступіў інтэрнэт-партал «remesla.by», які аб'ядноўвае рамеснікаў з усёй Беларусі. З'явіўся ён толькі гэтым летам, але ўжо налічвае каля 1500 наведвальнікаў. Навамір Кудзімаў — заснавальнік форуму — расказаў, што шмат падарожнічаў са сваім сябрам Аляксандрам Елісеевым па гарадах, вёсках, мястэчках, і яны заўважылі, што ёсць вельмі шмат майстроў, якія ўмеюць штосьці рабіць, гатовыя прадаваць гэта, але не маюць адпаведных умоў. Таму і з'явілася ідэя аб'яднаць людзей, яна ажыццявілася з дапамогай форуму. Акрамя вырабу пэўных рэчаў, ёсць ідэі падарожжаў, валанцёрства — рэстаўрацыі цэркваў, касцёлаў, помнікаў, а іх, закінутых і нікому не патрэбных, у нас вялікае мноства. Па словах Навамірa, усё гэта трэба чысціць, аднаўляць, бо, акрамя нас, гэтага ніхто не зробіць. Адметна, што сам Навамір ніякімі рамёствамі не займаецца, а значыць, прамой зацікаўленасці не мае. Яго стымулы — гэта неабыякавасць і ўважлівасць да таго, што адбываецца навокал.

Мы бачым, што рукі чалавечыя застаюцца каштоўнасцю і ў эпоху ўсеагульнай тэхнізацыі. Бо там, дзе ўсё становіцца простым і аднолькавым для большасці, індывідуальнасць пачынае цаніцца на вагу золата. Майстар укладвае часцінку сваёй душы ў кожны выраблены твор, пакупнік жа проста не можа гэтага не адчуць. Дзе яшчэ такое набудзеш за грошы?

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

Май на ўвазе!

ЯК НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ СУПЕРМАРКЕТАЎ,

ці Чаму мы купляем больш, чым нам трэба

Вы думаеце, мы самі вырашаем, што і ў якой колькасці купляць? Нават такія звычайныя і неабходныя рэчы, як прадукты?

...Дзверы расчыняюцца, і мы аказваемся там, дзе ёсць усё, чаго пажадае наша душа і страўнік... Бяром кошык, вазок і акунаемся, як той казаў, у прадуктовы рай. Толькі нас, пакупнікоў, на кожным кроку чакаюць "пасткі", падрыхтаваныя знарок для таго, каб мы як мага больш грошай пакінулі ў касе...

Па хлеб, малако і масла — праз усю залу

У штаце працаўнікоў супермаркета, акрамя проста прадаўцоў, ёсць людзі, якія вырашаюць, дзе і на якой паліцы будзе ляжаць прадукт той ці іншы. Прафесія такіх людзей называецца менчандайзеры. Іх задача — заахвоціць пакупніка набыць нейкі прадукт, стварыць "штучную папулярнасць", напрыклад, на прадукты, у якіх заканчваецца тэрмін прыдатнасці. Ёсць некалькі правіл-хітрыкаў, якімі карыстаюцца менчандайзеры і якія ўлічваюцца пры планіроўцы гандлёвага цэнтра. Напрыклад, правіла "залатога трохвугольніка" ў навуцы па продажы тавараў. Сэнс гэтага правіла ў тым, што найбольш запатрабаваныя тавары (сярод прадуктаў — хлеб, садавіна, малако, мяса), размяшчаюцца як мага далей адзін ад аднаго. Так, за боханам хлеба мы ідзём праз усю залу і міжволі праглядаем увесь асартымент магазіна. Глянцавыя часопісы, размаляваныя кубкі, прыгожыя сшыткі. Глядзіш — і не стрымаешся, хаця б рознакаляровую ручку купіш, хоць яна табе і не надта патрэбная.

Яшчэ адно правіла — правіла "замка". Па баках паліцы раскладваюцца разрэкламаваныя тавары (разрэкламаванасць маркі заўсёды адлюстроўваецца на цане), пасярэдзіне — недарагі прадукт не першай неабходнасці. Напрыклад, глазураваны сырок, які каштуе да 1000 руб, паміж пітных ёгуртаў за 5-7 тысяч. Розніца адчувальная. Чаму б не ўзяць заадно і сырок, усё роўна каштуе дробязь.

Вельмі часта карыстаюцца і такім прыёмам па "заахвочванні" пакупнікоў яшчэ раз раскашэліцца: размяшчэнне побач спадарожных тавараў. Напрыклад, якая піца без кетчупа. Таму ён і прадаецца побач з асновай для піцы, тое самае можна сказаць пра сухарыкі і піва. Прыкладаў даволі, варта проста паназіраць.

Калі пахі адурманьваюць

Амаль кожны "паважаючы" сябе супермаркет мае сваю ўласную хлебапякарню. Зазвычай хлебапякарні выносяцца ў гандлёвы цэнтр. І не таму, што не хапае месца, як можа здацца на першы погляд. Проста, адчуўшы прыемны пах булачак, у нас прачынаецца ці пачынае мацней гаварыць пачуццё голаду, асабліва вечарамі, напрыклад, калі вяртаемся з працы ці вучобы. Цяжкавата адмовіць сабе, ды і нашто чакаць, пакуль дамоў прыедзеш. Пах свежага хлеба можа спакусіць набыць штосьці і больш істотнае: чаму б не ўзяць хаця б 200 грамаў каўбаскі, хоць яна нам і не патрэбная, бо дома чакаюць прыгатаваныя катлеты. Да каўбаскі трэба захапіць хлеба і масла... Вось што можа зрабіць пах свежага хлеба. Апетыт у пакупнікоў, акрамя паху хлеба і булак, выклікае і пах свежазмолатай кавы. Хіба не даводзілася адчуваць яго ў супермаркеце?..

АКЦЫІ, СКІДКІ І ІМ ПАДОБНЫЯ...

Дзіву даешся, колькі праводзіцца акцый, устанаўліваецца скідак. З такімі тэмпамі мы за ўсё павінны былі б ужо плаціць па 0 руб. А можа, гэта не больш чым удала замаскіраваны псіхалагічны ход, які амаль безадказна ўздзейнічае на нас, пакупнікоў? Для адказу накіравалася ў адзін з самых папулярных сталічных супермаркетаў, дзе ўсе цэны на прадукты рэальныя. У малочным аддзеле адразу трапляе на вочы ўпакоўка з чатырох ёгуртаў, на якой напісана: эканомія 17%.

Гэта ўжо другое пытанне, ці патрэбна нам чатыры ёгурты адначасова. Нейкай падазрона вялікай падалася 17-працэнтная скідка, дай, думаю, падлічу. Упакоўка з чатырох ёгуртаў са скідкай каштуе 10470 рублёў. Адзін такі ёгурт каштуе 2990. 2990 памнажаем на чатыры, атрымліваецца 11960. Столькі мы заплацім, калі купім чатыры ёгурты паасобку. Выгада быццам бы і ёсць, пры ўмове, што ў нас вялікая сям'я і нам зараз столькі трэба. Аднак, як паказалі далейшыя падлікі, сапраўдная скідка аказалася не 17 працэнтаў, а 12,5.

Запаветы эканомнага пакупніка

Падсілкуйцеся перад наведваннем магазіна, тады ніякі пах не зможа вас спакусіць. Перад паходам у краму складайце спіс таго, што вам насамрэч трэба купіць, тады вас цяжэй будзе "справакаваць" на не зусім патрэбныя пакупкі.

Не кідайцеся адразу купляць прадукты са скідкай. Можа, тэрмін прыдатнасці на зыходзе ці яшчэ якая прычына. Так проста танней ніхто тавар не адпускае.

І расплачвайцеся "жывымі" грашыма, а не з пластыкавай карткі. Пластыкавая картка пакідае ўражанне, што грошы быццам і не трацяцца.

Прыемных вам пакупак.

Падрыхтавала Святлана ШЫЯН.

СЕЗОН НАДЫШОЎ

Каля в. Груск (Пружанскі раён) супрацоўнікі міліцыі выйшлі на самагонны міні-завод, які ўстанавілі ў лесе трое беспрацоўных жыхароў в. Ханевічы і в. Мінічы (Свіслацкі раён). Канфіскавана 160 л гаролкі, самагонны апарат, а 3 тоны брагі знішчылі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактны тэлефон: 292 44 12.

e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30 7.06.2011 г.

Загавары, каб я цябе ўбачыў

ІСНУЕ думка, што беларуская мова ўжо памерла, бо на ёй ніхто не размаўляе. Наконт гэтага я маю сваё меркаванне.

Я толькі што сказала «словы жывуць». Але як гэта трэба разумець? Што можа азначаць выраз «жыццё слоў»? Слова жыве таму, што жыве народ, які стварыў яго, які быў носьбітам гэтага слова на працягу вякоў. Слова ж, як і іншыя жывыя істоты, нараджаецца, расце, змяняецца, развіваецца — жыве таксама, як і мова, да якой яно належыць. Слова, пакуль яно існуе, не застаецца надоўга нязменным, бо нараджаецца, калі гэта патрэбна народу, існуе, з цягам часу мяняючы сваё значэнне і свой гукавы склад — а значыць, ЖЫВЕ! І памірае, калі знікае патрэба ў ім.

Ніхто, ніводзін чалавек, якімі б вялікімі ні былі яго таленты, розум, магутнасць, улада, не можа без згоды і пацвярджэння свайго народа даць жыццё нават самаму маленькаму слоўцу, хоць кожны з нас здольны за паўгадзіны прыдумаць дзясяткі выдатных гучных слоў. Ніхто ў адзіночку, асобна ад усяго народа, не мае права змяніць у слове, якое жыве, ніводнага гука. Самае ж галоўнае ў тым, што слова будзе жыць, пакуль жыве і народ. Гэта значыць, што наша мова таксама будзе жыць да той пары, пакуль будзе жыць яе носьбіт. Няхай нават застанецца адзін беларус, а мова ўсё роўна будзе існаваць. Мова, яна ў крыві, яна ў сэрцы. Мова — духоўны скарб народа, вопратка душы чалавека.

Тэма мовы, роднай мовы, у наш час даволі актуальная. І па тым, як чалавек адносіцца да сваёй мовы, да сваёй Радзімы, можна ўвогуле казаць аб тым, што ён сабой уяўляе, чаго ад яго чакаць. Старажытныя грэкі, напрыклад, лічылі, што чалавека можна зразумець толькі размаўляючы з ім. І нездарма. Мне здаецца, што старажытныя людзі былі значна разумнейшыя за цяперашніх, «камп'ютарызаваных», за якіх усё вырашаюць машыны. Жывучы падчас навукова-тэхнічнага прагрэсу, на жаль, мы ўсё менш думаем сваёй галавой, таму што прывыклі верыць машынам. І з кожным годам чамусьці ўсё менш размаўляем. Асабліва па роднай мове. На мой жа погляд, каб лічыцца сапраўдным грамадзянінам сваёй дзяржавы, трэба добра ведаць, паважаць сваю мову і ганарыцца ёй — нашай роднай беларускай мовай. І нават нягледзячы на тое, што ў нашай краіне дзве дзяржаўныя мовы, сапраўды самай роднай спакон вякоў з'яўляецца менавіта беларуская.

Загавары са мной, каб я ўбачыла, які ты чалавек. Загаворыш на роднай мове — станеш значнай постаццю ў маіх вачах, калі ж загаворыш на чужой мове — я цябе не ўбачу. Ты будзеш нібы сатканым з туману, празрыстай, ледзь бачнай смугой, якую развее ветрык.

Няважна, хто ты і што было ў тваім мінулым, — важна тое, якое месца ў тваім сэрцы займаюць мова і Радзіма.

Вядома ж, якую мову выбраць — гэта права кожнага чалавека. Але калі ты жывеш у краіне з прыгожай назвай «Беларусь», то і мова павінна быць беларуская. Што ж тычыцца маіх адносін да беларускай мовы, скажу вам толькі адно: Я ЛЮБЛЮ ЯЕ ЎСІМ СЭРЦАМ.

Ганна ВАЛУЕВІЧ, студэнтка Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва.

ЛЕПШЫ БЕЛАРУСКІ... АКВАРЫУМНЫ КЛАС

Карэспандэнт "Звязды" пабываў ва ўнікальным экалагічным дзіцячым цэнтры, які знаходзіцца ў беларускай глыбінцы. Многае здзівіла, як і тое, што заняткі ў гуртках тут бясплатныя.

— А хочаце, пакажу яйка сярэднеазіяцкай чарапахі? А вось, глядзіце, самы вялікі акварыум ва ўсёй краіне, — звяртаецца да мяне **дырэктар установы адукацыі "Аршанскі эколага-біялагічны цэнтр дзяцей і моладзі" Аляксандр МІШАКОЎ.** Ён — выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Узначальвае цэнтр з 1988 года. — Наш акварыумны клас, дарэчы, адзначаны дыпломам першай ступені рэспубліканскага конкурсу ў намінацыі "Акварыум", — расказвае Аляксандр Мішакоў. — Цяжка падлічыць, колькі ўсяго ў нас рыб, птушак і інш. Толькі папугаяў, напрыклад, у нас пяць відаў. Грызуны, крылатыя драпежнікі... Каго толькі няма.

Сярод усіх раённых цэнтраў краіны, як адзначыў дырэктар, гэтая ўстанова, у якой ёсць "царства рыб, жывёл, раслін", самая буйная. Як растлумачыў Аляксандр Леанідавіч, унікальнасць установы — у яе вузкім профілі дзейнасці. Усяго ў цэнтры займаюцца больш за 1430 выхаванцаў ва ўзросце ад пяці да... 27 гадоў. Зусім не дзіцячы ўзрост — 27 гадоў аднаго з выхаванцаў — дырэктар растлумачыў тым, што не адмаўляюць у заняткі і людзям з абмежаванымі магчымасцямі (з затрымкай псіхафізічнага развіцця).

Усяго ў цэнтры дзейнічаюць ажно 120 гурткоў. Сярод іх "Юны заолаг", "Фаўна", "Аматары жывёльнага свету", флярыстычныя і іншыя гурткі. Цікава, што дарослыя часта звяртаюцца з просьбамі таксама запісаць іх у гурткі або арганізаваць заняткі. Напрыклад, маладыя мамы, якія знаходзяцца ў дэкрэтным водпуску, былі б вельмі ўдзячны за магчымасць навучыцца ўпрыгожваць і афармляць жыллё, атрымаць асновы ландшафтнага дызайну і іншаму. І ў цэнтры працуюць над стварэннем такой магчымасці.

Сёлета цэнтру спаўняецца 30 гадоў. Цікава, што яшчэ ў 1980-я юныя натуралісты навучыліся ў цяплiцах вырошчваць нават кавуны. Яшчэ да развалу СССР адкрыўся аддзел конегадоўлі і шэраг адпаведных гурткоў. І ён, бадай, быў адзіным у рэспубліцы.

Падчас экскурсіі па цэнтры ўбачыў, як дзеці чысцяць акварыумы і прыгожы басейн, у якім плаваюць вялікія дэкаратыўныя рыбы, убачыў творы флярыстыкі, зробленыя гурткоўцамі. Не выклікае сумненняў тое, што калі сённяшнія выхаванцы вырастуць, то яны не будуць шкодзіць прыродзе, а будуць шчыра любіць свой родны кут.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *Орша — Віцебск.*

Фота аўтара.

УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 28 июня 2011 года

<u>в 10.00</u> в информационно-методическом кабинете № 418 (4-й этаж), расположенного по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков,

<u>в 11.00</u> – открытый аукцион по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов,

<u>в 12.00</u> аукцион по продаже земельного участка общей площадью 0,2052 га для ведения подсобного хозяйства в д. Зеньковичи Узденского района (начальная цена продажи земельного участка 225 630 рублей).

На аукционные торги на право заключения договоров аренды выставляются следующие участки с начальной ценой:

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения)
Лот № 1	Узденский райисполком	Земельный участок: г. Узда – ул. Колхозная	0,0150	625650100005000430	652 110	1 635 337
Лот № 2	Узденский райисполком	Земельный участок: г. Узда – ул. Новицкого, участок № 3	0,1389	625650100001000514	22 281 890	1 386 462

Целевое назначение участков – по улице Колхозной – для установки и обслуживания торгового павильона, по улице Новицкого – для строительства и обслуживания здания магазина. Участок свободен от строений. Инженерные коммуникации: имеется возможность подведения к газоснабжению, водоснабжению, водоотведению. Срок аренды земельных участков – 25 лет.

На аукционные торги по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов выставляются следующие участки с начальной ценой:

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения)
Лот № 1	Дещенский с/Совет	Земельный участок: д. Городище, ул. Центральная, 18А	0,1500	625682502601000019	12 000 000	705 692
Лот № 2	Дещенский с/Совет	Земельный участок: д. Рябиновка, ул. Рябиновая. Участок № 39	0,1501	625682509601000045	5 000 000	742 258
Лот № 3	агрогородок Озеро	Земельный участок: д. Озеро, ул. Васильковая. Участок № 12	0,1500	625682508601000634	25 000 000	1 114 580
Лот № 4	агрогородок Озеро	Земельный участок: д. Озеро, ул. Березовая. Участок № 11	0,1500	625682508601000633	25 000 000	1 114 580

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания жилого дома.

К участку, расположенному по адресу: д. Городище Дещенского сельского Совета и в агрогородке Озеро по улицам Васильковая и Березовая, имеется возможность подключения к газоснабжению и водоснабжению, в д. Рябиновка отсутствуют все инженерные коммуникации.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет 3602631002502 финансового отдела Узденского райисполкома в филиале 606 ОАО «Беларусбанк» г. Дзержинска, МФО 153001514, УНП 600203994, код платежа на право заключения договоров аренды 04002, код платежа по продаже земельных участков в частную собственность 04901. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, второй этаж, кабинет 210 с 8.00 до 17.00 по рабочим дням **с 8 июня по 22 июня 2011 года включительно.**

Заключительная регистрация – с 8.30 до 9.55 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения. Кроме того, победителю аукциона за земельный участок, расположенный по улице Новицкого (уч. № 3), необходимо возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме 7 598 990 рублей.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by, либо по телефонам (801718) 55404, 54705, 55342.

Дыскусійная трыбуна

«Бізнэс гатовы несці фінансавую адказнасць для выпраўлення сітуацыі, але пакуль не бачыць выразнага плана»

На Рэспубліканскім савеце дзелавых колаў, які сабраўся з мэтай абмеркаваць крызіс на валютным рынку і даць свае прапановы па выхаду з гэтай сітуацыі Аляксандр ШВЕЦ, старшыня Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі, выказаў шкадаванне, што да меркаванняў бізнэс-супольнасці не прыслухоўваюцца:

— На жаль, мы можам канстатаваць праблему, якая яшчэ стаяла да валютнага крызісу — гэта праблема ўзаемадзеяння па ключавых пытаннях бізнэсу і ўлады. На гэты момант сюды яшчэ і падключыўся і недастатковы давер насельніцтва, выкліканы крызіснымі з'явамі. І хаця Прэзідэнт у сваёй Дырэктыве №4 дакладна вызначыў дзяржустановам актыўна выкарыстоўваць патэнцыял грамадскіх аб'яднанняў прадпрымальнікаў, бізнэсменаў, прамыслоўцаў і навукоўцаў, але, тым не менш, мы вымушаны канстатаваць, што цікавасці да наладжвання ўзаемадзеяння няма.

Што тычыцца плану дзеянняў Урада РБ па забеспячэнні збалансаванага развіцця эканомікі ва ўмовах змянення афіцыйнага курса рубля, які зацверджаны Пастановай Савета Міністраў № 662, то сам факт з'яўлення такога дакумента Аляксандр Швец лічыць станоўчым:

— Я мяркую, што кожны чытаў пастанову Саўміна № 662. Сам факт яе існавання — станоўчы, нам толькі не зразумела, чаму яна была сакрэтнай. Бо і грамадства і бізнэс чакае ад Нацбанка пэўных крокаў, а замест таго, каб паказваць гэтыя крокі і наяўнасць нейкіх пазіцый, такая праца сакрэціцца. Але дзякуй, што план быў рассакрэчаны і мы ўбачылі цэлы шэраг мер. Якія гэта меры? Безумоўна, мы павінны займацца сацыяльнай падтрымкай, мы павінны стабілізаваць сітуацыю ў эканоміцы ў цэлым, але што замінае ўжо зараз стабілізаваць яе на валютным рынку? Чаму маўчыць Нацбанк такі працяглы перыяд часу? Я не буду казаць навуковымі тэрмінамі, скажу з пункту гледжання практыка, якія займаецца пэўнымі відамі бізнэсу — маўчаць, бо сказаць сапраўды няма чаго. Калі будзе чым рэгуляваць — тады рэгулятар і загаворыць. А калі гэта будзе? Мы ўсе сочым за тым, як праходзяць перамовы з антыкрызісным фондам ЕўраАзЭС, перамовы з МВФ. Выдатна, напэўна, гэта нам дасць нейкую частку валюты, якую рэгулятар накіруе на падтрыманне нейкага курсу ў нейкім калідоры. Але які гэта будзе курс?.. Ад гэтага пытання мы не адыдзем. Нам кажуць, што сітуацыя праясніцца за 10-14 дзён. Але і да гэтага рабіліся розныя заявы. І я не ведаю, верыць ці не верыць. Я не бачу адказаў на гэтыя пытанні, і менавіта таму мы хацелі запрасіць прадстаўнікоў дзяржорганаў, — сказаў ён.

Тым не менш, як мяркуе старшыня БНПА, бізнэс таксама гатовы паўдзельнічаць у нармалізацыі сітуацыі ў эканоміцы:

— У чым роля бізнэсу ў вырашэнні гэтай ўсёй праблематыкі? Якую долю адказнасці, у тым ліку і эканамічнай у стабілізацыйных мерах павінен панесці бізнэс? Бізнэс разумее сваю ролю і мы будзем несці сваю пэўную адказнасць. Мы згодны, што трэба паспрабаваць збіць рост цэн і трэба паспрабаваць зрабіць хаця б прамежкавую стабілізацыю для далейшай планавай стабілізацыі. Але нам толькі кажуць, што бізнэс павінен скараціць цэны. Так, іх можна скараціць да ўзроўню страт, і некаторыя бізнэсмены не супраць несці страты месяц ці два, каб стабілізаваць попыт на рынку. Але ў нас няма адказу — колькі трэба будзе несці гэтыя страты: два месяцы або тры, пяць, шэсць... Мы павінны пры гэтым бачыць больш выразна і канкрэтна: а што са свайго боку робяць чыноўнікі па самаабмежаванні? Выразна і канкрэтна. Пакуль мы адказаў на гэтыя пытанні ў поўнай меры не знаходзім. Мы ж усе працуем у гэтай краіне, мы вядзем тут бізнэс і нам важны лёс таксама нашых грамадзян, нашых спажыўцоў.

ІМПАРТ ТРЭБА ТАРМАЗНУЦЬ ЛЮБОЙ ЦАНОЙ?

За жорсткае абмежаванне імпарту выказаўся **дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ**.

— Трэба любой цаной працягваць стрымліваць імпарт, інакш да канца года будзе зусім ўжо дрэнна — можа быць дэфолт, — лічыць Міхаіл Міхайлавіч. — Толькі дэвальвацыяй імпарт не стрымаеш, таму, на мой погляд, трэба зрабіць як калісьці ва Украіне: той імпарт, які не патрэбны, там у цяжкі год проста занеслі ў спіс і ўвялі мараторый на яго набыццё за сродкі бюджэту і дзяржпрадпрыемстваў. Прычым гэта ў маштабах усёй краіны без выключэнняў. І Украіна тады большменш утрымала курс. Ну і часова трэба закрыць спажывецкае крэдытаванне насельніцтва, якое ў асноўным накіроўвалася па набыццё імпарту.

Пры гэтым Міхаіл Кавалёў таксама падкрэсліў, што не трэба забывацца і на экспарт:

— Любой цаной трэба стымуляваць, каб рос экспарт. Трэба стымуляваць тыя прадпрыемствы, фірмы і фірмачкі, якія болей экспартуюць, чым імпартуюць. Кітайцы зрабілі проста: калі ў іх не хапала валюты, але гэта было ўжо 25 гадоў назад, яны такія прадпрыемствы, пра якія я казаў, вызвалілі ад падаходнага падатку. Прамы, можна сказаць, стымул.

Разам з тым, на пасяджэнні гучалі і іншыя меркаванні наконт абмежавання імпарту:

— А хто-небудзь пытаў, ці гатовае насельніцтва адмовіцца ад імпарту і купляць толькі танныя беларускія тавары, якія зараз становяцца абсалютна нятаннымі? — спытаў у адказ **Георгій ГРЫЦ, член савета РГА «БНПА», к.э.н., прафесар Інстытута бесперапыннай адукацыі БДУ**. — А хто-небудзь разумее, што сёння на двары глабалізацыя і выпускаць кінескопы ў аб'ёме толькі 150 тысяч для Беларусі ў прынцыпе неэфектыўна, бо гэты кінескоп будзе ў тры разы даражэйшы за тайваньскі? Сёння будаваць нейкі самапальны рынак у Беларусі ў прынцыпе нерэальна. Бо прыйдзецца вярнуцца да вопыту Паўночнай Карэі. А хто-небудзь хоча з нас жыць ва ўмовах Паўночнай Карэі?

Што тычыцца цэн, то іх, паводле меркавання Міхаіла Кавалёва, трэба стрымаць:

— Інфляцыя павінна быць прадуманай, інакш яна з'есць увесь эфект дэвальвацыі. Калі усё адразу вырасце, як было ў 1993-1994 годзе, то эфект будзе нулявы. Цэны трэба ўтрымаць не толькі дзеля інтарэсаў насельніцтва, а дзеля інтарэсаў эканомікі, каб быў значны эфект для экспарцёраў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

АРЭНДА НАВАТ САМЫХ «СЛАБЕНЬКІХ» СТАЛІЧНЫХ АДНАПАКАЁВАК ПАДАРАЖЭЛА ЛЕТАМ МІНІМУМ НА 300 ТЫСЯЧ РУБЛЁЎ

Як адзначаюць эксперты рынку арэнды мінскага жылля, менавіта ў першы месяц лета традыцыйна назіраецца патанненне гэтага сегменту жыллёвай нерухомасці. Сапраўды, так яно адбываецца і цяпер, калі лічыць кошт арэнды ў доларавым эквіваленце. Аднак з доларам у нас зараз назіраецца такая незразумелая гульня, якая вымушае гаспадароў кватэр і кліентаў або дамаўляцца аб істотных доларавых зніжках, або перапісаць цэннікі ў рублях.

Напрыклад, калі месяц—два таму нават самая «слабенькая» аднапакаёвая кватэра каштавала недзе 230 долараў, то гаспадары жылля маглі яшчэ згадзіцца ўзяць плату па афіцыйным курсе, што складала каля 700 тысяч рублёў. Цяпер горшыя па жыллёвых умовах і, адпаведна, маленькія па плошчы) кватэры ў Мінску каштуюць прыкладна 200 долараў, што складае ўжо мільён рублёў. Тут трэба адзначыць, што арэнда ў памеры мільёна рублёў з'яўляецца мінімальнай, бо за 5000 беларускіх рублёў долараў у абменніках няма. Таму ўладальнікі кватэр часам патрабуюць лічыць рублёвы эквівалент па 5500 ці нават 6000 рублёў за долар. Больш падрабязна пра магчымыя тэндэнцыі на рынку арэнды чытайце ў наступных нумарах «Звязды».

Сяргей КУРКАЧ.

«А я думаю так...»

Як вы плануеце адпачываць сёлета?

За акном +29. Як там кажуць: навошта нам бераг турэцкі? Сапраўды: нам і тут нядрэнна грэе. Застаецца прыдумаць, дзе, як і з кім мы адпачнём ад працоўных будняў.

І пакуль адны рашаюць, у якую экзатычную краіну вырвацца ў жніўні, другія ўжо браніруюць нумары ў беларускія санаторыі. Толькі браніраваць няма чаго: большасць месцаў ужо зарэзерваваны ажно са студзеня. Як жа збіраюцца адпачываць беларусы?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

УЛАДА, спявачка:

— Апошнія два гады я мару з'ехаць на мора. Што б там ні казалі, але мора не заменіш нічым. Зараз у мяне адпачынак зноў пераносіцца. Але спадзяюся, у ліпені ўсё ж знойдзецца вольная хвілінка. Але нават калі не атрымаецца з морам — ёсць дзясяткі выдатных месцаў і спосабаў адпачынку тут, у Беларусі. Гэта я вам кажу не толькі як спявачка, але і як арганізатар розных забаў і вясельляў. Таму, калі там з фінансамі нацяжка ці вы баіцеся лятаць на самалётах, — шукайце адпачынак тут.

Ала ШУМІЛАВА, студэнтка факультэта міжнародных адносін БДУ:

— Я буду адпачываць у Італіі. Мяне запрасілі мае італьянскія сябры, бываю ў іх ужо не першы год. Адпачынак атрымліваецца комплексным: з аднаго боку — здаровае марское паветра, мора; з другога боку — сябры, якіх не бачыла ўвесь год, — добрыя стасункі, таксама новыя знаёмствы. Такім чынам, гэта такая «змена галавы», як кажуць.

Мікола КУПАВА, мастак:

— Думаю, адпачынку як такога сёлета не атрымаецца. Звычайна я спалучаў яго з творчай працай. А гэтым разам мо і будзе які пленэр, але яшчэ недакладна. Насамрэч, не да адпачынку, бо шмат творчай працы, якую немагчыма спыніць. А калі б раптам і атрымалася, то я паехаў бы на Нарач. Не быў там ужо з 1979 года. Там такое паветра! Чыстая цёплая вада, лодкі, шыкоўная атмасфера. Адчуваеш там сябе як дома.

Алена СПІРЫДОВІЧ, тэлевядучая:

— Традыцыйна я мяркую адпачываць дома, у Беларусі. Тыдзень-другі буду на лецішчы. Там у мяне возера, утульны домік і шмат сяброў, якія заўжды рады мяне бачыць. А скончацца два тыдні — і зноў за працу. Праўда, сёлета я ўжо брала тыдзень адпачынку. Мы з мужам ляталі на Гоа ў Індыю. Прычым таксама традыцыйна. Звычайна робім гэта ў снежні-студзені, калі так хочацца пахадзіць басанож па пяску, а ў нас у гэты час ляжыць снег. Апошнія 10-12 гадоў такім чынам мы зімой лятаем у цёплыя краіны.

Ганна ГЕНДЭЛЬ, мадэль:

— Я працую мадэллю за мяжой у Індыі. І быццам бы буду працаваць там усё лета. Вопыт ужо не першы, перыядычна езджу працаваць за мяжу. Вядома, паездкі падабаюцца. Па-першае, дзякуючы мадэльнай працы з'яўляецца магчымасць пабачыць новыя краіны, пажыць і асвоіцца там. Усе агенцтвы, у якіх я працавала, забяспечваюць выдатныя ўмовы і, акрамя працы, вельмі шмат забаў. Бывала, што зусім не хацелася вяртацца ў Мінск. Так што цяпер у мяне, як мінімум, два дамы. Вельмі прыжылася ў Куала-Лумпур у Малайзіі. Выдатны горад і клімат. У сваёй працы бачу толькі плюсы: дзяўчына становіцца самастойнай, больш таварыскай, паляпшае свае замежныя мовы, і галоўны плюс — заробак. Бо ў Беларусі мадэлінг — гэта толькі хобі...

Мікола ТАРАНДА, дацэнт кафедры мікрабіялогіі Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта:

— Пакуль збяру трускаўкі, пакуль прапалю агароды — які там ужо адпачынак будзе? (Усміхаецца. — Аўт.) Тыдзень-паўтара планую такім чынам быць на лецішчы. А пасля пойдзе праца на палях — мы са студэнтамі будзем правяраць глебу на наяўнасць бактэрый, аналізаваць мікрафлору... Запланаваў таксама зрабіць некалькі метадычак за гэты час, дапамагчы студэнтам з навуковымі працамі. «Даследчае» лета ў мяне чакаецца.

Апытваў Ілья ЛАПАТО.

РУП «Речицкий комбинат строительных материалов»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже имущества, расположенного в г. Речица, ул. Энергетиков, 1:

№ лота	Наименование имущества	Начальная цена лота, без НДС, руб.	Задаток 5%, без НДС, руб.
1	2	3	4
1	Горновой цех, одноэтажное кирпичное здание общей площадью 698,5 кв.м, 1960 г	36 000 825	1 800 041
	Ограждение (10 пролетов)		
2	Водонапорная башня высотой 23,7 м, 1955 г.	12 259 672	612 984
3	Здание бытовок главного производственного корпуса, одноэтажное кирпичное, 1996 г., 421 м²	48 129 200	2 406 460
4	Глинохранилище с приемным отделением, одноэтажное кирпичное здание, год постройки – неустановлен, 860,8 м²	85 820 400	4 291 020
5	Здание АЗС, 1952 г., 17 м²	18 313 600	915 680
	Здание склада ГСМ 1953 г., 88,2 м²		
	Топливораздаточная колонка КЭД «Ливны-1»		
	Топливораздаточная колонка неустановленной марки		
	Емкость для хранения ГСМ объемом 11 м³		
	Емкость для хранения ГСМ объемом 53 м³		

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Шилова, 2, ком. 2, тел./факс (80232) 60 51 31.

Продавец: РУП «Речицкий КСМ», г. Речица, ул. Энергетиков, 1, тел. (802340) 5 40 27.

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 8.30 до 17.00.

Задаток перечисляется до 20.06.2011 г. (включительно), на р/с 3012001880014 ОАО БПС-БАНК г. Речица код 151501356 УНП 400025042.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 9% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос.регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа удостоверяющего личность.

Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления до 16.00. 20.06.2011 года по адресу: г. Речица, ул. Энергетиков, 1.

Дата, время, место проведения открытого аукциона: **21.06.2011 года в 14.00., г. Речица, ул. Энергетиков, 1.**

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8 029) 621 22 36 или (80232) 60 51 31.
Дополнительная информация: www.disponent.by

У Пухавіцкім раёне прадухілілі заказное забойства

44-гадовая жыхарка Мар'інай Горкі абвінавачваецца ў тым, што «заказала» свайго былога мужа.

— Абвінавачаная жыла ў адной кватэры разам з дзецьмі і былым 45-гадовым мужам, — паведаміў **начальнік аддзела па наглядзе за следствам у органах пракуратуры Мінскай вобласці Аляксандр БЯЛІЦКІ**. — Нярэдка паміж імі ўзнікалі канфлікты на бытавой глебе.

Следствам установлена, што жанчына змагла знайсці выканаўцу злачынства і паабяцала яму за забойства былога мужа 7 тысяч долараў. Як яго заб'юць, яе не цікавіла. У якасці пацвярджэння выканання заказу яна папрасіла ключы ад гаража. Паводле слоў Аляксандра Бяліцкага, жанчына ведала, што былы муж нядрэнна зарабляе, адкладае грошы і трымае іх у гаражы.

Дзякуючы «кілеру», які заявіў аб намерах заказчыцы ў міліцыю, апошнюю затрымалі. Злавілі з доказамі злачынства: пасля таго, як «выканаўца» перадаў ёй ключы і мабільны тэлефон «забітага», тая разлічылася з «кілерам» 5 мільёнамі рублёў, якія знайшла ў гаражы.

У дачыненні да жанчыны заведзена крымінальная справа па факце падрыхтоўкі да забойства па найме.

Надзея ДРЫЛА.

Утерянные (украденные) бланки строгой отчетности 1СУ «Квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов)» серии КВ с № 1996225 по № 1996230 в количестве 6 шт., 1СУо «Квитанция о приеме наличных денежных средств по обязательному страхованию строений, принадлежащих гражданам» серии КО с № 3133998 по № 3134010 в количестве 13 шт, 1СУо «Квитанция о приеме наличных денежных средств по обязательному страхованию строений, принадлежащих гражданам» серии КО с № 3161171 по № 3161220 в количестве 50 шт. «Добровольное страхование ГО жилых помещений» № 144718 в количестве 1 шт., «Добровольное страхование имущества» с № 8668226 по № 8668228 в количестве 3 шт., «Обязательное страхование гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь» серии ВС с № 4124446 по № 4124450 в количестве 5 шт., Представительства Белгосстраха по Минскому району **считать недействительным.**

УНН 600013344

ЗАПРАСІЎ, ПРЫГРЭЎ...

49-гадовы жыхар з г. Мікашэвічы заявіў у Лунінецкі аддзел міліцыі, што ў яго ўкралі 700 тысяч рублёў і банкаўскую картку.

Аператыўнікі пачалі шукаць злодзея і затрымалі 22-гадовую беспрацоўную, якая да 5-й гадзіны раніцы знаходзілася ў кватэры пацярпелага.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СУНІЧНАЯ КРАІНА МАШЛЯКЕВІЧАЎ

Так склалася, што ў адных вёсках вырошчваюць агуркі, у другіх — моркву і буракі, у трэціх — капусту. Аднак у пошуках большых даходаў уладальнікі падсобных гаспадарак шукаюць усё новыя тэхналогіі, спрабуюць вырошчваць новыя культуры, ставяць эксперыменты. Эксперыментатарам можна назваць і Канстанціна Іванавіча Машлякевіча з вёскі Велямічы.

Вось такім ураджаем могуць пахваліцца Ірына Аляксандраўна і яе сын Аляксандр.

У 2009 годзе Канстанцін Машлякевіч уключыўся ў эксперымент па вырошчванні садовых суніц (клубніц) у парніку. Разам з ім паспрабавалі іх вырошчваць Іван Давідчук, Міхаіл Супрунчык з Велямічаў і Іван Слуцкі і Аляксей Дабрынец з Рамля.

Пасадачны матэрыял быў закуплены ў фірме, якая займаецца вырошчваннем расады суніц, — БелАгрыПлантс. Кошт аднаго кусціка вагаўся тады ад 600 да 800 рублёў. Былі закуплены сарты «Віма Занта», «Віма Тарта» і «Кімберлі». Суправаджэнне ініцыятывы — ад арганізацыі па набыцці пасадачнага матэрыялу да падвядзення вынікаў — узяў на сябе цэнтр падтрымкі сельскага развіцця. Хоць спецыялісты і папярэджвалі, што першыя кветкі суніц трэба сарваць, каб ураджаю восенню не было зусім, а вясной атрымаць большы, аднак эксперыментатары вырашылі паспрабаваць вырасціць суніцы і восенню. Падлічылі, што ў зімоўку суніцы павінны ўвайсці ў добрым стане. Першыя ягады ўразілі і парадавалі: яны былі па 50-60 грамаў кожная. Аднак прыгожы і смачны ўраджай практычна ўвесь раздавалі знаёмым, сябрам, бо так восенню і не знайшлі, куды прадаць. Былі спробы самастойна рэалізоўваць суніцы на рынках Століншчыны, але ў гэты час людзі ўжо не так ахвотна куплялі суніцы.

Канстанцін Машлякевіч каля сваіх суніц.

Яшчэ зімою разеткі суніц былі адпраўлены на экспертызу ў Галандыю. Там у спецыяльнай лабараторыі правялі аналіз і даслалі звесткі пра... патэнцыял будучага ўраджаю. Расліны не вельмі добра перазімавалі: моцны мароз пашкодзіў іх часткова, таму разлічваць на вельмі высокі ўраджай не даводзілася. Спецыялісты параілі ў нашых умовах прыкрываць суніцы на зіму спандбондам.

Вясной парнікі, у якіх раслі суніцы, пачалі ацяпляць. У большасці стаялі звычайныя буржуйкі. Толькі ў Івана Давідчука суніцы раслі ў парніках, дзе было пракладзена ацяпленне пад грунтам. Суніцы пачалі спець у пачатку мая. Калі ў парніках сабралі апошні ўраджай — на градках толькі пачалі паспяваць ягадкі.

Вясновы ўраджай не быў шматлікім, як і прадказвалі спецыялісты. Аднак велічыня ягад, іх таварны выгляд радавалі. Пачалі шукаць шляхі збыту. І адзіным найбольш прымальным аказалася самастойна рэалізоўваць суніцы на рынку. А гэта вытворцаў не задавальняла: часу няма на рэалізацыю. Некалькі разоў здавалі оптам па 10 тысяч рублёў за кілаграм, адпраўлялі суніцы за мяжу — у Расію. Аднак аптавікі з неахвотай працуюць з малымі партыямі.

— Калі б у нашым раёне чалавек 200-300 займалася вырошчваннем суніц у закрытым грунце, тады б і аптавікі ставіліся больш сур'ёзна, ды і цана была б намнога вышэйшай, — разважае Канстанцін Іванавіч.

Летась ураджай у Канстанціна Іванавіча быў адзін кілаграм з аднаго метра квадратнага. Іван Давідчук атрымаў амаль два з паловай кілаграмы з квадратнага метра. Гэта мала. У Францыі з рэмантантных суніц бяруць да сямі кілаграмаў.

— Калі асвоім тэхналогію, то будзе выгадней вырошчваць суніцы, чым агуркі, — падводзіць вынік Канстанцін Іванавіч.

Яго жонцы Ірыне Аляксандраўне таксама падабаецца больш займацца суніцамі, чым агуркамі. Работы з імі намнога менш: высадзіў — і забыў. Вясной пачаў ацяпляць, а пасля на працягу трох тыдняў — выбірай. І сезон заканчваецца.

Сёлета ў Канстанціна Машлякевіча пад суніцы занята 1,4 сотні парніка. Прыгожыя, дагледжаныя суніцы радуюць вока. Хоць яны былі толькі аднойчы апрацаваны ад белай і шэрай гнілі. У парніку — кропельны паліў, замульчыраваны расліны чорнай плёнкай. Паліць у парніку пачаў дзесьці з 26 сакавіка. Сёлета з-за позняй вясны першыя ягады Машлякевічы сабралі толькі 28 мая.

Машлякевічы зараз здавалі суніцы оптам па 15 тысяч рублёў за кілаграм на рынку ў Альшанах. Хоць добра ведаюць, што аптовая цана ў Мінску — 25 тысяч за кілаграм.

Канстанцін, як эксперыментатар, марыць паспрабаваць вырошчваць суніцы на стэлажах. Так ягадкі менш заражаюцца гніллю. Таксама ён упэўнены, што трэба шукаць новыя гатункі, якія будуць аптымальнымі для нашай мясцовасці.

Таццяна СЕГЕН.
Фота аўтара.

ТЕХНОБАНК

Открытое акционерное общество
220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ТЕХНОБАНК»!
Настоящим извещаем о проведении внеочередного Общего Собрания акционеров ОАО «Технобанк» в **очной форме** по решению Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк» от 07 июня 2011 года (протокол № 52) на основании собственной инициативы.
Дата проведения: 14 июня 2011 года.
Место проведения (адрес):
г. Минск, ул. Кропоткина, 44, ОАО «Технобанк», 2-й этаж.
Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании: с 10.30 до 11.00 по месту проведения собрания при предъявлении документов, подтверждающих их личность (паспорт) и полномочия представителей акционеров (документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; доверенность).
Время проведения заседания: с 11.00 до 13.00.

Повестка дня Общего Собрания акционеров:
1. Об избрании членов Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк».
2. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Для ознакомления с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу:
г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон (8 017) 237 43 80.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.05.2010, УНП 100706562

Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

АКЦЁРЫ БАРСЕЛОНЫ І ДЖАКАРТЫ

ЖЫВЫЯ СКУЛЬПТУРЫ

Усталіцы Каталоніі Барселоне шмат выдатных скульптур: ад сярэднявечных статуй да сучасных сюррэалістычных фантазій. Але ў канцы XX стагоддзя ў горадзе з'явіліся, мабыць, самыя незвычайныя скульптуры — жывыя. Іх можна сустрэць на цэнтральнай вуліцы Рамбле. Атракцыён прыдумалі тры клоўны — Тоніа, Пе-пе і Пака. Акцёры грыміраваліся і заміралі ў пацешных позах. За кінутую манетку дзякавалі якім-небудзь трукам. Забава прыйшлася даспадобы як гараджанам, так і прыезджым. Цяпер у Барселоне ўвесь час працуе некалькі дзясяткаў жывых скульптур. Большасць акцёраў — лацінаамерыканцы, сярод прадстаўнікоў гэтай прафесіі каталонцы трапляюцца не часта. Мімы выхваляюцца, што ўлетку зарабляюць да трох тысяч еўра ў месяц. Узімку прыбыткі ніжэй — каля паўтары тысячы.

Гэтая «Ніка» за манетку пакладзе далоньку вам на галаву. Нядрэнны варыянт за грош атрымаць бласлаўленне багіні перамогі.

«Два ў адным». Галантны джэнтльмен усім дамам за манетку цалуе ручку.

А гэта не нерухомая бязрукая статуя, а клоўн, які забаўляе публіку, што сядзіць у бліжэйшай кавярні.

Часам такія жахлівыя скульптуры маюць больш прыхільнікаў.

Закон ніяк не рэгламентуе дзейнасць вулічных артыстаў: падаткаў ім плаціць не трэба — яны нічога не прадаюць. Адзінае патрабаванне ўладаў — працоўнае месца «скульптуры» не павінна быць больш за паўтара метра, а адлегласць паміж кампазіцыямі — не менш за пяць. У скульптур розны падыход да працы. Некаторыя стаяць зусім нерухома і дзякуюць за дары адным-двума завучанымі рухамі. Іншыя ўключаюць у дзеянне мінакоў, звяртаюцца да людзей, жартуюць з імі. Бывае, што статуі працуюць адзін сезон, бывае — працуюць на Рамбле гадамі. Са слоў мясцовых жыхароў, такія артысты вельмі выгадныя: гарадскія ўлады, крамы і кавярні атрымліваюць выгаду ад турыстаў, якія прыходзяць паглядзець на жывыя скульптуры. Дарэчы, гэта выгадна і кішэннікам, якія карыстаюцца адцягненай увагай і якім на руку вялікая скучанасць людзей.

АРТЫСТЫ НА ЛАНЦУЖКАХ

Каля шыкоўнага аўто малпачка спадзяецца атрымаць хоць што-небудзь.

Ў вулічных спектаклях «Topeng monyet» у Джакарце, Інданэзія, звычайна ўдзельнічаюць малпачкі ў масках, лялечных галовах ці чалавечых уборах. Жывёл вучаць чалавечым справам — хадзіць па пакупкі, ездзіць на веласіпедах і г.д. Бедната прымушае дрэсіроўшчыкаў эксплуатаваць малпаў у надзеі зарабіць хоць колькі-небудзь грошай, аднак жорсткасць у дачыненні да гэтых мілых істот хвалюе шматлікія таварыствы абароны дзікіх жывёл.

Дрэсіраваная малпачка Усіл падчас вулічнага прадстаўлення ў Джакарце.

Дрэсіроўшчык звязвае лапы сваёй макакі.

«ЮПІТЭРУ БОЛЬШ НЕ НАЛІВАЦЬ!»

Хто здольны ўжываць алкаголь без шкоды для здароўя ўласнага і навакольных, а каму нельга піць ані кропелькі — дакладна ведаюць медыкі і... астролагі.

АВЕН
(21 сакавіка — 20 красавіка)

Авен і ў звычайным жыцці, што называецца, «краёў не бачыць» — спачатку дзейнічае, а потым задумваецца, а ўжо калі вып'е як след — чакай непрадказальных наступстваў. Не дарэмна, відаць, прадбачлівыя астролагі раяць падвыпіўшаму Авену асабліва паклапаціцца пра свой твар, ды і пра ўсю галаву цалкам. Асабліва не рэкамендуецца людзям гэтага знака злоўжываць чырвоным віном; затое шампанскае (у разумных дозах і ў правільнай кампаніі) — самы ваш напой.

ЦЯЛЕЦ
(21 красавіка — 21 мая)

П'янее павольна, але затое грунтоўна. Цялец па натуры — усё ж такі бык, які можа і бадануць, і пра гэта варта памятаць усім, хто паспрабуе зачапіць альбо паспрачацца з любой нагоды з не вельмі цвярозым Цяльцом. Лепшы спосаб нейтралізаваць гэтую рысу ягонага характару — прапанаваць заспяваць. Цяльцы аддаюць перавагу дарагім вінам і ў цэлым пераносяць алкаголь добра, адзіная праблема — лёгка могуць прастудзіцца, бо алкаголь іх моцна разаграе.

БЛІЗНЯТЫ
(22 мая — 21 чэрвеня)

Астралогія сцвярджае, што гэта знак непітушчых і язвеннікаў — праўда, датычыць гэта правіла толькі тыповых Блізнятаў, народжаных у сярэдзіне знака. Для іх, гавораць зоркі, выпіўка папросту нецікавая, бо яны амаль не п'янеюць, а гарачыні характару і ўласнай хапае. Усе астатнія Блізняты, як сапраўдныя арыстакраты, аддаюць перавагу лёгкім сухім вінам, найбольш карысны для іх мускат.

РАК
(22 чэрвеня — 21 ліпеня)

Каму неабходна пазбягаць спіртнога, дык гэта Ракам. Яны лягчэй за іншых трапляюць у алкагольную залежнасць, прычым не толькі ад моцных напояў, але і ад папулярнага сярод моладзі піва. Найлепшае выйсце для тых прадстаўнікоў знаку, хто не можа справіцца са спакусай — зрэдку песціць сябе, напрыклад, дарагім вермутам.

ЛЕЎ
(23 ліпеня — 23 жніўня)

Цара звяроў пасада абавязвае — трэба заўжды сябе кантраляваць, каб з-за адной вясёлай вечарынкі не згубіць назаўжды добрую рэпутацыю. Тым больш што расплата за нецвярозыя пагулянкі для Льва будзе асабліва горкай: астролагі прагназуюць яму найцяжэйшае з усяго задыяка пахмелле. Гэтаму знаку раяць выбіраць напоі салодкія і слабенькія, а лепш яшчэ і вельмі разбаўленыя, каб захоўваць ясную галаву.

ДЗЕВА
(24 жніўня — 23 верасня)

У стасунках з алкаголем, мяркуюць астролагі, найлепшы памочнік для Дзевы — яе ўласны ўнутраны голас, альбо інтуіцыя. Калі ж ваш унутраны голас разам з вамі празмерна расслабіўся і забыўся на пачуццё меры, будзьце ўпэўненыя, што пра яго хутка нагадае ваша печань — яна ў Дзевы настолькі адчувальная, што прыме максімум пару келіхаў сухога віна, не больш.

ШАЛІ
(24 верасня — 23 кастрычніка)

Іх вораг — няўменне адмовіць і кампанейскі характар, бо перабіраюць Шалі ў асноўным у калектыве і дзеля таго, каб падтрымаць атмасферу. Закусваць часта забываюцца ці абмяжоўваюцца некалькімі цукеркамі, таму хутка п'янеюць. Пахмелле для іх страшнае ў першую чаргу маральнымі пакутамі, але паправіць на гэты момант ужо нічога нельга. Затое варта запомніць на ўсе наступныя разы: варыянт Шаляў — невялікая колькасць маладога (не старэй за 4 гады) віна.

СКАРПІЁН
(24 кастрычніка — 22 лістапада)

Гэтаму знаку раяць выпіваць у абдымках з месячным календаром, каб не нарабіць непапраўнай шкоды — прычым не навакольным, а сабе любімаму. Акрамя таго, папярэджваюць зоркі, для Скарпіёнаў небяспечнае сістэматычнае ўжыванне (і тым больш злоўжыванне) моцнага алкаголю: варта перабраць — і пачнуцца праблемы ў палавой сферы. Вам яно трэба?

СТРАЛЕЦ
(23 лістапада —21 снежня)

Гэта проста гурман у сэнсе выпіўкі — алкаголь ужывае ўмела, прыгожа і з задавальненнем, асабліва калі гаворка ідзе пра моцныя і вытрыманыя віны. Але гэта не значыць, што піць можна бясконца: за задавальненне даводзіцца плаціць, бо печань і асабліва ныркі ў Стральцоў не жалезныя.

КАЗЯРОГ
(22 снежня — 20 студзеня)

Каму можна жыць ды радавацца, гэта Казярогам: астролагі не толькі дазваляюць, але і рэкамендуюць прадстаўнікам гэтага знаку крыху выпіць: у лячэбных мэтах — але віна, толькі віна. Арганізм у Казярогаў зроблены так хітра, што празмерна піць ім і не хочацца. Дый бессэнсоўна гэта: праблемы нікуды не знікнуць, а цёмныя фарбы, хутчэй за ўсё, згусцяцца яшчэ больш і толькі сапсуюць вам настрой.

ВАДАЛЕЙ
(21 студзеня — 18 лютага)

Ужо сама назва знака як быццам намякае: лепш за ўсё, шаноўныя, толькі вадой і абмежавацца. Але чалавек — істота слабая, нервы часта не вытрымліваюць... Каб расслабіць іх і сябе, Вадалеям дазваляецца час ад часу выпіць крыху шампанскага ці мускатнага віна, і стрэс адступіць.

РЫБЫ
(19 лютага — 20 сакавіка)

Вось ужо дзе поўны набор рызыкі: і да алкаголю прызвычайваюцца хутка, і пахмелле ў іх наступае цяжкае. Але ёсць парадунак: Рыбы па сваёй прыродзе гурманы, ніколі не забываюцца не толькі на спіртное, але і на закуску, прычым абы-што есці не будуць. Што да алкаголю, яго Рыбам лепш не піць, а дэгуставаць — і не забываць правільны парадак дэгустацыі, тады прадказаныя зоркамі праблемы вас не закрануць.

Гэты погляд зорак на нас зверху ўніз, зразумела ж, хутчэй гумарыстычны, чым сур'ёзны, але ў кожным жарце толькі доля жарту, астатняе — праўда. Уздымайце задыякальныя тосты правільна і будзьце здаровыя!

Хочаце — верце...

ПРА ШТО РАСПАВЯДЗЕ ГОЛАС

СІЛА, вышыня, тэмбр голасу даюць аб чалавеку шмат інфармацыі. Гэта добра ведаюць следчыя, палітыкі, псіхолагі, менеджары — адным словам усе тыя, хто працуе з людзьмі. Любыя змены ў эмоцыях або ў фізічным стане адбіваюцца на голасе.

Уявіце сабе, што вы ў гутарцы закранаеце нейкую праблему, і раптам роўны, спакойны голас суразмоўцы ўзлятае ўверх і становіцца тонкім, амаль віскліявым. У такой рэзкай змене яго паводзін могуць быць дзве прычыны: альбо вы чымсьці напалохалі вашага візаві, альбо чымсьці разгнявілі яго. Калі ж ён пачне пераконваць вас у зваротным, вы маеце поўнае права яму не паверыць.

Паводле распаўсюджанага меркавання, калі чалавек гаворыць няпраўду, ён чырванее, заікаецца і адводзіць вочы ўбок. Звычайна гэта так, бо хлусня супярэчыць чалавечай прыродзе. І тады, кажучы няпраўду, нашчадак Адама адчувае стрэс, у яго пачашчаецца пульс, кроў прылівае да галавы, а далоні пакрываюцца потам. Але некаторыя, бывае, заікаюцца і чырванеюць менавіта тады, калі кажуць чыстую праўду. Калі ж яны пачынаюць «вешаць локшыну», то ператвараюцца ў майстэрскіх прамоўцаў, якія з чыстым сумленнем глядзяць у вашы вочы. Хоць не верыць ім вельмі цяжка. Красамоўства, якое ўзялося невядома адкуль, не можа не выклікаць падазрэнняў. Ажыўлены і высокі тон голасу суразмоўцы звычайна азначае, што вашы словы ўспрыняты з запалам і радасцю. Але часам такі тон сведчыць аб тым, што сказанаму вамі проста не вераць.

Калі радасны, узбуджаны голас візаві раптам загас, стаў ціхім і бляклым, то, хутчэй за ўсё, вы яго чымсьці пакрыўдзілі або не апраўдалі яго чаканняў.

Мяккі, прыглушаны голас, з паніжэннем гуку да канца кожнай фразы, паведамляе, што той, з кім вы размаўляеце, чымсьці засмучаны або проста стаміўся.

З тымі, каму давяраюць або сімпатызуюць, людзі звычайна размаўляюць некалькі цішэй, чым з астатнімі. Паніжаюць голас і ў тым выпадку, калі кажуць нешта такое, пра што стараннім ведаць не варта.

Памылкай было б недаацаніць уплыў голасу на прывабнасць чалавека. У эксперыменце, праведзеным амерыканскімі псіхолагамі, вельмі прывабная дзяўчына пры зносінах з групай «А» выкарыстала прыгожы, нізкі голас, які быў багаты інтанацыямі. З групай «Б» яна гаварыла гугнявым, сіплым, манатонным голасам. Затым, калі папрасілі групы ацаніць ступень яе прывабнасці па дзесяцібальной шкале, то ўдзельнікі групы «А» паставілі дзяўчыне 10, а ўдзельнікі групы «Б» 2 балы.

Сучаснікі З. Фрэйда адзначалі, што большасць з яго пацыентак на сеансах псіхааналізу ўлюблялася ў свайго ўрача, не маючы магчымасці бачыць яго (псіхааналіз па Фрэйду не дазваляе візуальны кантакт паміж урачом і пацыентам), а толькі чуючы яго голас.

Гучанне голасу, яго вышыня, тон — невербальны, уздзейнічае адразу на падсвядомасць. Гэта сродак, ад якога шмат у чым залежыць, як чалавека ўспрымае яго асяроддзе. Высокі, звонкі голас асацыюецца людзьмі з юнацкасцю. Гаспадар такога голасу, для іх, заўсёды малады, энергічны, поўны сіл і, на жаль, заўсёды не дасведчаны і не сталы. Як вядома, іх значна радзей прызначаюць на адказныя пасты. **Зроблена цікавае назіранне, што чым вышэй голас, тым ніжэй пасада.** Уладальнік тонкага пісклявага голасу, напэўна, будзе на пабягушках. Акрамя таго, голас, які гучыць высока, даволі хутка выклікае пачуццё дыскамфорту. Так адбываецца таму, што ў чалавечай падсвядомасці, пранізлівы, высокі гук звязаны з трывогай, што адпаведна выклікае дыскамфорт. Вельмі высокі і віскліявы голас, выклікаючы трывогу на падсвядомым узроўні, адбівае жаданне мець зносіны з яго ўладальнікам, памяншае ступень даверу да яго слоў. Гэта трэба ведаць усім, хто вядзе перамовы на тым або іншым узроўні.

У адной з псіхалагічных лабараторый ЗША групе людзей далі праслухаць дыялог, а пасля сказаць, хто з удзельнікаў дыялогу выклікае большы давер. Амаль аднагалосна быў названы адзін з іх. Справа ў тым, што з дапамогай няхітрых тэхнічных сродкаў голас гэтага чалавека быў зроблены гучней усяго на паўдэцыбела, і гэта значна павялічыла яго аўтарытэт у слухачоў. Некаторыя думаюць— ім толькі здаецца, што падчас тэлерэкламы гук тэлевізара становіцца больш гучным. Не здаецца. Гэта сапраўды так. Такім чынам, рэкламшчыкі спрабуюць выклікаць давер да тавару, які прадстаўляюць.

У нізкім голасе адчуваецца інтэлект, упэўненасць у сабе, самадастатковасць. Чалавека з нізкім голасам навакольныя ўспрымаюць як дасведчанага, а значыць больш аўтарытэтнага. Падчас перадвыбарнай кампаніі краснаярскага губернатара А. Лебедзя яго іміджмейкеры, калі адбываліся тэлетрансляцыі, яшчэ больш паніжалі і без таго нізкі голас свайго падапечнага. Рабілася гэта для таго, каб жаночая частка выбаршчыкаў, якая па колькасці, як правіла, большая чым мужчынская, адчула ў А. Лебедзю абаронцу, апору, чалавека гонару.

Дзяўчына, якая размаўляе нізкім, грудным голасам, мужчынам здаецца больш сэксуальнай, чым яе сяброўка, што валодае тоненькім, далікатным галаском. Справа ў тым, што нізкі голас абумоўлены павышаным утрыманнем мужчынскіх палавых гармонаў у крыві. Такім чынам, уладальніца кантральта больш тэмпераментная. Вядома, не ўсе мужчыны ведаюць пра гэта, але шмат хто з іх гэта адчувае. Голас далёка не заўсёды залежыць толькі ад гармонаў. Будова маўленчага апарату, асаблівасці дыхання, псіхалагічнага настрою і многае іншае ўплывае на гучанне голасу. Галоўнае, голас можна настроіць. Крыху намаганяў — і ён будзе гучаць так, як вам гэтага хочацца. Тэмбр і сіла голасу, безумоўна, залежаць ад дыхання. Правільнае дыханне — прыгожы голас. Дыханне павінна быць лёгкім і вольным — гэта значыць не спрабуйце ўдыхнуць больш, чым вам дадзена, не імкніцеся трымаць працэс дыхання пад строгім кантролем свядомасці. Наадварот, чым больш вы расслаблены, тым больш паветра вы ўдыхняце, тым лепш будзе гучаць ваш голас.

Каб пазбегнуць непатрэбнага пранонсу і каб голас не быў гугнявым, гук павінен выходзіць з грудзей. Для праверкі пакладзіце руку на грудзі: калі яна вібруе — то ўсё ў парадку. Умацоўвае дыханне (а такім чынам, паляпшае гучанне голасу) занятак спевамі. Так што выкананне любімых песень, несумнеўна, пойдзе на карысць. Калі ж арыі ў вашым выкананні не прыносяць, мякка кажучы, эстэтычнага задавальнення ні вам, ні навакольным, дапамогуць паветраныя шарыкі. Іх надзіманне вельмі ўмацоўвае дыхальную сістэму. Дарэчы, не бывае моцнага голасу ў слабым целе, таму профі — тыя, каму моцны голас патрэбен для кар'еры — рэгулярна наведваюць трэнажорныя залы. Так, і постаць уплывае на голас. Пры добрай постаці органы дыхання размешчаны правільна, што ў канчатковым выніку робіць голас больш гучным. Распаўсюджана меркаванне, што курэнне робіць голас нізкім, але гэта не зусім так. Яно робіць яго хутчэй сіплым, а сіпата выклікае ў людзей дрэннае ўражанне.

Уладальнік манатоннага голасу наўрад ці даб'ецца поспеху ў слухачоў — у лепшым выпадку яны будуць драмаць. Каб з вамі гэтага не адбывалася, паспрабуйце ўжыць такі метад. Які-небудзь тэкст (лепш за ўсё верш) паспрабуйце прачытаць услых на розныя лады. Чытайце з пафасам, з іроніяй, з захапленнем і г.д. Між іншым, Станіслаўскі мог вымавіць слова «так» 400 разоў, і кожны раз яно выяўляла іншыя пачуцці.

Для вызначэння аптымальнага гучання менавіта вашага голасу выкарыстоўваецца такі спосаб: палічыце ўслых, ад аднаго да дзесяці, паступова павышаючы голас. Калі пачуеце тое гучанне, якое вас задаволіць, запомніце яго, а затым паспрабуйце яго прытрымлівацца.

Падрыхтавала Марына ПЯТРОВІЧ.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

СООБЩАЕТ ОБ ОТМЕНЕ 10.06.2011 г. АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

(Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным № 400/С-49752 – Административное здание;
Лот № 3. Капитальное строение с инвентарным № 400/С-7159 – Склад культтоваров;
Лот № 4. Капитальное строение с инвентарным № 400/С-7157 – Склад хозтоваров), принадлежащего Гродненскому областному союзу потребительских обществ.

У **суд Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Лешынскіса Майролдса Маргеравіча,** 21 мая 1967 года нараджэння, ураджэнца г. Салдус, Латвійская Рэспубліка, апошняе вядомае месца жыхарства Латвійская Рэспубліка, 1057 LV г. Рыга, вул. Лакаматывес, д. 56, кв. 102. Просім грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Лешынскаса Майролдса Маргеравіча, паведаміць іх суду Кобрынскага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

Уважаемые акционеры ОАО «БРЕСТСКИЙ ЭЛЕКТРОМЕХАНИЧЕСКИЙ ЗАВОД»!

НА СОСТОЯВШЕМСЯ 06.06.2011 г. ВНЕОЧЕРЕДНОМ ОБЩЕМ СОБРАНИИ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА ПРИНЯТО РЕШЕНИЕ О ВЫПЛАТЕ ДИВИДЕНДОВ за 2010 год.

Всего начислено дивидендов в отчетном периоде – 419,2 млн руб.

Дивиденды, приходящиеся на одну акцию, включая налоги, – 237,0495 руб.

Обеспеченность акции имуществом – 35,996 тыс. руб.

Период выплаты дивидендов: **с 15 июня по 15 сентября 2011 г.**

Порядок выплаты – почтовым переводом

Справки по тел. 8 (0162) 42 75 43. Специалист по ценным бумагам – Шепетуха Вера Михайловна.

УНП 200032892

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ
об аукционе 12 июля 2011 года по продаже транспортных средств ОАО «Жабинковский сахарный завод»

№ п/п	Наименование транспортного средства, его характеристики	Начальная цена продажи, руб.	Сумма задатка, руб.
1.	Грузовой автомобиль ЗИЛ-433362, год выпуска 1993: № кузова-3304765; тип кузова — автогидроподъемник; грузоподъемность люльки — 300 кг, тип двигателя — бензин	30 500 000	3 050 000
2.	Автобус ПАЗ-32050R; год выпуска 2000; № кузова — Y0000931; тип кузова — вагон; цвет — бело-синий, количество посадочных мест — 25+1; тип двигателя — бензин	12 500 000	1 250 000
3.	Погрузчик на базе трактора ДТ-75; год ввода в эксплуатацию — 1986; двигатель — СМД-14Н	6 000 000	600 000
4.	Грузовой автомобиль КАМАЗ-5511, год выпуска 1981, № кузова 59779; тип кузова — самосвал; тип двигателя — дизель	5 900 000	590 000

1. Аукцион состоится **12 июля 2011 года** в 11.00 по адресу: г. Жабинка, клуб завода.

2. Аукцион проводится методом повышения начальной цены лотов. Шаг торгов — 10% начальной цены лота.

3. Заявление на участие в аукционе составляется в произвольной форме.

4. Задаток вносится на р/с 3012750125417 в ЦБУ № 109 г. Жабинка филиал № 100 Брестского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Жабинка, ул. Советская, 7, МФО 150501246, УНН 200037600 получатель платежа ОАО «Жабинковский сахарный завод». Наименование платежа: задаток для участия в аукционе по продаже транспортных средств. Срок внесения задатка — **по 11 июля 2011 года включительно.** Внесение задатка и окончательный расчет осуществляется только безналичным путем.

5. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Жабинка, ОАО «Жабинковский сахарный завод» (приемная руководителя) по рабочим дням **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по 11 июля 2011 года включительно.** Телефон для справок **8 (01641) 2 73 62.**

6. Более подробная информация об условиях проведения и участия в аукционе размещена на сайте **www.sahar.by.**

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Варажыць на вянку

У структуры пераважнай большасці рытуальна-абрадавых комплексаў прыкметнае месца займаюць варожбы моладзі аб сваёй далейшай долі. Звычайна гэта бывае ў дні зімовага і летняга сонцастаяння або веснавога і асенняга раўнадзенстваў, г. зн. у дні своеасаблівых часавых разрываў, якія распачыналі новы сегмент каляндарнага колазвароту. Значна радзей моладзь варажыла ў іншыя святы, асабліва ў тыя, якія мелі пераходны характар. Прычым па форме і методыцы правядзення рытуалы былі разнастайныя.

● У якасці аб'екта варажбы мог стаць галоўны атрыбут таго ці іншага свята. Калі дым ад патушанай свечкі на Восеньскія Дзяды будзе віцца ўгару або пацягне ў чырвоны кут, то сям'я на працягу наступнага года застанецца ў поўным складзе; калі ж дым пацягнецца да дзвярэй — гэта прадказвала хуткую бяду.

● Галоўным атрыбутам варажбы, вядома ж, з'яўляліся сплеценыя вянкі. Заўважым, што існавала два варыянты дзявочых гаданняў. Адзін з іх датычыўся далейшага стану вянка. У аснове гэтага варыянта ляжала адно з культурафарміруючых процістаянняў Жыцця і Смерці. Жывы (жыццё) — рухомы, прыгожы, чырвоны, здаровы, дужы, вясёлы, прывабны. Нежывы (смерць) — збялеў, пасінеў, счарнеў, скруціўся, зморшчыўся, завяў, асунуўся, зрабіўся нерухомым.

● На Тройцу дзяўчаты завівалі вянкі, а праз тыдзень прыходзілі і глядзелі, у якім стане яны знаходзяцца, гадалі на іх: чый вянок застанецца праз тыдзень «вясёлы» — тая будзе доўга жыць.

● Другі варыянт варажбы быў у большай ступені звязаны з купальскімі святкаваннямі. Дзяўчаты плялі, як мінімум, два вянкі (на сябе і на свайго хлопца), а маглі — і больш, калі хацелі паваражыць адразу на некалькі чалавек. Важная акалічнасць: спачатку кожны вянок дзяўчына надзявала сабе на галаву, а потым ішла да вады (рэчкі, возера, сажалкі) і пускала вянкі па ёй.

● Пры гэтым прытрымліваліся абавязковага правіла, характэрнага для пераважнай большасці рытуалаў: як толькі вянок ляжа на ваду, збіраліся і ішлі дадому, па дарозе ні з кім не гаварылі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

Па гарызанталі: Азтэк. Цэртэлі. Кулна. Мані. Акт. Шадр. Так. Дрэн. Цяга. Пік. Рубль. Красівы. Вар. Жах. Рант. Зіма. Карнік. Рубяж. Вандаль. Тора. Рахета. Гора. Ніт. Стагар. Гарт. Марадзёр. Удар. Гатунак. Акаціна. **Па вертыкалі:** Бурундук. Міпон. Радыё. Мур. Аман. Піва. Імамат. Аліва. Карт. Рука. Карма. Гарбуз. Улад. Рыкша. Арк. Цаглі. Рыба. Туя. Ула. Кваскі. Барс. Ядранга. Полька. Дот. Ангара. Зёлка. Орт. Лаўрэатка.

У Гродзенскім заапарку аднавілі катанне на запражных жывёлах

Працяглы перапынак быў звязаны з рэканструкцыяй заапарка, але цяпер ёсць спецыяльнае месца для гэтай дзіцячай забавы. Праўда, пакуль падрастаюць звычныя для гродзенцаў поні, у экіпаж запрагаюць восліка па мянушцы Крыста.

Рэканструкцыя заапарка, якая пачалася ў 2002 годзе, набліжаецца да завяршэння. Сёння там 3,4 тысячы жывёл, птушак і рыбаў. А не хапае, вось ужо каля дзесяці гадоў, слана. Праўда, цяпер перспектыва замены Сураку, які пражываў у заапарку з 1965 года, даволі рэальная. Верагодна, на новае месцажыхарства ў Гродне перабярэцца цыркавы «пенсіянер» ці, магчыма, скарыстаюцца міжнароднай праграмай па захаванні відаў жывёльнага свету.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Дарагі сыночак, зяць, муж, татачка, шаноўны, тактоўны і добразычлівы сусед са Слуцка **Анатоль Яўгенавіч ШПІЛЕЎСКІ!** Прыміце нашы шчырыя і сардэчныя віншаванні з нагоды дня нараджэння! Зычым вам, чалавеку вялікай душы і сэрца, здароўя, сямейнага дабрабыту, павагі ад родных і блізкіх. Заставайцеся такім добрым, душэўным, абавязковым, якім мы вас ведаем.

Вашы родныя і Новік Т.І.

Дарагую, любую **Глафіру Міхайлаўну АТРАХІМОВІЧ** з в. Іванаўка Докшыцкага раёна віншуем з днём нараджэння! Жадаем здароўя, дабрабыту, даўгалецця.

Муж, дзеці, унукі і праўнучка Ксюша.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.40	21.38	16.58
Віцебск —	4.21	21.36	17.15
Магілёў —	4.30	21.28	16.58
Гомель —	4.35	21.15	16.40
Гродна —	4.56	21.52	16.56
Брэст —	5.06	21.43	16.37

Месяц

Першая квадра 9 чэрвеня. Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Алены, Аверкія, Георгія, Івана, Карпа, Макара.*

К. *Ады, Ядвігі, Вільгельма, Максіма, Медарда, Севярына.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



8 чэрвеня

Дзве даты

1895 год — нарадзіўся (вёска Пагіры Дзятлаўскага раёна) Ігнат Дварчанін, беларускі літаратуразнаўца, паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч. З 1919 года вёў культурна-асветніцкую работу ў Дзятлаўскім раёне, у Даўгаўпілсе (Латвія). З 1926 года — у Вільні на выкладчыцкай працы, быў адным з кіраўнікоў Галоўнага ўпраўлення ТБШ. У 1928 г. абраны паслом у Польскі сойм. За рэвалюцыйную дзейнасць арыштаваны польскімі ўладамі, вызвалены ў 1932-м у выніку абмену палітвязнямі. Працаваў у камісіі АН Беларусі па вывучэнні Заходняй Беларусі. Аўтар вершаў, публіцыстычных твораў. У 1927 годзе выдаў у Вільні «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 г.)» для сярэдніх школ, якая адыграла вялікую ролю ў навучанні і патрыятычным выхаванні. Пераклаў на беларускую мову паэму А. Блока «Дванаццаць». У 1933 годзе рэпрэсаваны, у 1937-м — расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

1824 год — Ноа Кашынг з Квебека (Канада) запатэнтаваў першую пральную машыну.

Цытата дня:

«Гісторыя — гэта раман, які быў; раман — гэта гісторыя, якая магла б быць».

Эдмон Ганкуп (1830—1870), французскі пісьменнік.

Усміхнемся!

За дзень мне патэлефанавалі каля трыццаці разоў. Гэтыя званкі можна падзяліць на тры групы:

1. Званкі ад тваёй мамы.

2. Пагрозы.

3. Пагрозы ад тваёй мамы.

☺

— А я вось рыбу лавіць люблю, але не ўмею.

— А што там умець — налівай ды пі.

— Гэта можа перарасці ў турызм.

☺

Хочаш адчуць сябе сапёрам? Надзень памперс на дзіця, якое спіць!

☺

Суровыя студэнцкія будні.

— Сонейка, ты катлеты пасмажыла?

— Так! АБЕДЗЬВЕ!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 292 22 03.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 2708. Нумар падпісаны ў 19.30 7 чэрвеня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12